КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №11 (187)
◂ 26 САКАВІКА ◂ 2010 г.

# Новы Час



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Стар. 6

**КУДЫ ПАЕХАЎ ЦЫРК?**
Сакавік — месяц ідэалагічны. Такая традыцыя. Свой пачатак яна бярэ ад дакладу, які зрабіў «адзіны беларускі палітык» (АБП) на ідэалагічным семінары ў 2003 годзе
Стар. 4

**МЕДАЛІ ДЛЯ ПАЛІЦАЯЎ**
Пра аспекты малдоўскага палітычнага жыцця журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Андрэем Думбравеану, дацэнтам кафедры журналістыкі Малдоўскага дзяржаўнага універсітэта, лідэрам малдоўскай партыі «Зялёны альянс»
Стар. 20

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**
Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**НАШЧАДАК КНЯЗЯ**

**Нарыс Кастуся ТАРАСАВА**

▸ **З НАГОДЫ**

# НАФТАВАЯ ЭКВІЛІБРЫСТЫКА

**Вольга ХВОІН**

**За морам цялушка — паўграша, ды рубель — перавоз. Але калі цялушка тая прынадная, то можна пашукаць і больш танныя шляхі дастаўкі. Да беларуска-венесуэльскіх нафтавых перамоў пачалі прыглядацца і суседзі, каб прапанаваць свае транспартныя паслугі ахвочай да заморскіх вуглевадародаў Беларусі.**

Першы намеснік прэм’ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка паведаміў журналістам, што чысты прыбытак РУП «Вытворчае аб’яднанне «Беларуснафта» за тры гады працы ў Венесуэле склаў 105 мільёнаў долараў. На думку чыноўніка, «гэта значная лічба і для прадпрыемства, і ў цэлым для нашай краіны». «Беларуснафта» ўжо амаль напалову выплаціла так званыя бонусы за распрацоўку радовішчаў, і цяпер яны будуць дадавацца, а аб’ём здабычы мусіць вырасці.

Створанае напрыканцы 2007 года сумеснае беларуска-венесуэльскае прадпрыемства здабыло больш за 1 мільён тон нафты. Першапачаткова меркавалася, што сваю частку венесуэльскай нафты (40 працэнтаў ад аб’ёму, здабытага сумесным прадпрыемствам) Беларусь будзе прадаваць на сусветным рынку. Для параўнання, з Расіі ў Беларусь штогод пастаўляецца прыблізна 24–25 мільёнаў тон нафты, прыкладна 1,8 мільёна тон здабываецца з уласных радовішчаў. Так што аб’ёмы венесуэльскага «чорнага золата» былі толькі кропляй у моры вугляроднай сыравіны.

Каб крыху змякчыць сітуацыю з пастаўкамі расійскай і ўжо нятаннай нафты ў Беларусь, Аляксандр Лукашэнка наведаўся ў Венесуэлу і дамовіўся з яе кіраўніком, што да канца года з лацінаамерыканскай краіны ў сінявокую будзе пастаўлена да 4 мільёнаў тон нафты. Гэта быццам бы мусіць дапамагчы загрузіць айчынныя нафтаперапрацоўчыя заводы, якія ад новага года працуюць не на поўную магутнасць і са стратамі.



**Каракас. Скульптурная кампазіцыя — нафтавая вышка на далоні — сімвал прыналежнасці галоўнага багацця краіны народу Венесуэлы**

Да ідэі паступова пачалі прыглядацца транспартныя кампаніі краін-суседак, што маюць выхад да мора. Так, украінскі эксперт па энергетычных пытаннях Багдан Сакалоўскі лічыць, што вырашыць пытанне дастаўкі нафты ў Беларусь магчыма праз нафтаправод «Адэса — Броды». «Аптымальным тэхнічным варыянтам можа быць схема замяшчэння венесуэльскай нафты каспійскай з выкарыстаннем украінскага нафтаправода «Адэса — Броды» ў аверсным рэжыме пры рэалізацыі тэхналогіі паасобнай прапампоўкі розных гатункаў нафты.

Гэты нафтаправод, хутчэй за ўсё, будзе пераведзены ў аверсны кірунак восенню 2011 года пасля ўвядзення ў эксплуатацыю Балтыйскай трубаправоднай сістэмы–2 (БТС–2). Цалкам рэальна, што да гэтага часу аб’ёмы транзіту ў Беларусь згаданым маршрутам могуць скласці 4–5 мільёнаў тон у год, а аб’ёмы паставак на заходнеўкраінскія НПЗ 3–5 мільёнаў тон у год. Транспарціроўка сумарна 7–9 мільёнаў тон у год — гэта цалкам рэнтабельная загрузка наяўнай першай чаргі «Адэса — Броды», якая разлічаная на 14,5 мільёна тон у год», — заявіў Сакалоўскі ўкраінскаму інфармагенцтву УНІАН. Іншыя патэнцыйна магчымыя схемы дастаўкі венесуэльскай нафты ў Беларусь, па меркаванню эксперта, больш складаныя і затратныя.

Літоўцы таксама не супраць далучыцца да гешэфту. Па інфармацыі Інтэрфакса, кіраўніцтва Мажэйкяйскага нафтаперапрацоўчага завода ORLEN Lietuva не выключае мажлівасці, што перапрацоўка венесуэльскай нафты, якая здабываецца Беларуссю, можа быць у іх рэнтабельнай, але з умовай, што будзе створана сумеснае прадпрыемства. Мажэйкяйскі НПЗ мае ўласны пералачны тэрмінал Бутынге, і транспартныя выдаткі на дастаўку нафты з Венесуэлы да завода былі б меншыя параўнальна з коштам дастаўкі на любы з двух беларускіх НПЗ.

Пры гэтым падкрэсліваецца, што літоўцам набываць венесуэльскую нафту для перапрацоўкі невыгодна, іншая справа — прыватныя дамоўленасці аб коштах паміж Лукашэнкам і Чавесам. «Сёння самая танная нафта — расійская, і таму гаварыць, што НПЗ мог бы загружаць свае магутнасці самастойна венесуэльскай нафтай, не варта. Аднак калі б перапрацоўкай гэтай нафты займалася, скажам, беларуска-літоўскае СП, гэта, магчыма, магло б быць выгодным», — заявіў прадстаўнік ORLEN Lietuva. Да слова, пакуль нідзе не былі агучаныя кошты, па якіх Беларусь будзе набываць венесуэльскую нафту.

Галоўная крыніца энергасыравіны для Беларусі — Расія — на планы Лукашэнкі сысці ад монапаставак глядзіць без адабрэння. З вуснаў прэзідэнта расійскага Фонду нацыянальнай энергетычнай бяспекі Канстанціна Сіманава прагучаў сумнеў наконт мэтазгоднасці паставак бязмытнай нафты ў Беларусь.

«У размове паміж Лукашэнкам і Чавесам гаварылася аб 80 тысячах барэляў нафты ў суткі. Гэта значыць, у год атрымаецца прыкладна чатыры мільёна тон. Расія была гатовая пастаўляць Беларусі бязмытна 6,3 мільёна тон у год. Пасля новых дамоўленасцяў паміж Мінскам і Каракасам, я б ужо не гаварыў аб такой колькасці, — заявіў Сіманаў. — Хочаце рабіць бізнес — давайце рабіць бізнес. Падчас далейшых перамоў па нафце з Беларуссю Расіі варта заняць максімальна цвёрдую пазіцыю. Хоча чалавек эканамізаваць нашы адносіны — чаму не? Магчыма, у будучыні Лукашэнка вырашыць пачаць закупляць катарскі газ — і няхай. Тады свой мы будзем прадаваць яму ўжо даражэй».

Прэзідэнт расійскага Фонду нацыянальнай энергетычнай бяспекі знайшоў пазітыўны момант у венесуэльска-беларускіх дамовах. «Гэта гісторыя ацвярэзлівае нас. Яна даказвае, што калі Лукашэнка мае намер купляць нафту за акіянам, значыць, у яго ёсць грошы. Адпаведна, гульні ў бедных ужо не дапамогуць, — падкрэсліў аналітык. — Расіі неабходна зрабіць палітычныя высновы, наколькі надзейным партнёрам з’яўляецца Лукашэнка, калі ён гатовы назло маці адмарозіць вушы і пачаць купляць нафту ў Венесуэлы, і ў каго заўгодна, абы не ў Расіі».

Наўрад ці Беларусь насамрэч пазбавіцца манапольных расійскіх паставак нафты. Праект — сыры, не прайшоў апрабацыю на практыцы, невядомая і яго разліковая рэнтабельнасць. Аднак, як мінімум, гэта дазваляе паказытаць нервы Расіі і стварыць хоць і маленькі, але ўсё ж запасны аэрадром на выпадак энергетычных войнаў у будучыні.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ІВАЦЭВІЧЫ. ПЕРШЫ «НАРОДНЫ МАЙСТАР»

Ганаровы статус і пасведчанне «Народнага майстра ткацтва і вышыўкі» атрымала Ніна Тысевіч з вёскі Аброва. Статус народнага майстра — на ўзроўні статуса народнага артыста і народнага спевака. Яна адзінаццатая з уганараваных такім званнем у Брэсцкай вобласці і першая ў раёне. З гэтай нагоды ў мясцовым доме культуры была арганізавана выстава работ народнай майстрыхі.

### МАЛАРЫТА. ДЗІЦЁ — НА ВУЛІЦУ

«Гуманнасць» дзяржаўнага маштабу праявілі мясцовыя ўлады, зачыніўшы 20 сакавіка дзіцячы прытулак раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра. Прычына такога рашэння — незапаўняльнасць установы. Апошнім часам у ёй знаходзілася толькі адно дзіцё, і яго пазбавілі месца пражывання.

### ВЕТКА. ДАРОГА ЖЫЦЦЯ

19 сакавіка ў мясцовым Доме культуры адбылася сацыяльна-творчая акцыя «Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця». Мэта — падтрымка таленавітых дзяцей і падлеткаў з тых раёнах, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

### МАСТЫ. ДЗЕЦІ БУДУЦЬ У ЦЯПЛЕ

У дзіцячым садку-яслях № 4 «Залаты пеўнік» у гэтым годзе будзе зроблены рамонт сістэмы ацяплення, з-за якой на працягу некалькіх апошніх гадоў рэгулярна парушаўся тэмпературны рэжым у зімовы перыяд. У асабліва марозныя дні гэтай зімы тэмпература ў памяшканнях дзіцячага садку не падымалася вышэй за 15ºС, што прыводзіла да частых захворванняў дзяцей. Бацькі звярнуліся да дэпутата райсавета Дзмітрыя Кухлея з просьбай пасадзейнічаць вырашэнню праблемы. Паводле адказу на дэпутацкі зварот праектна-каштарысная дакументацыя на рэканструкцыю сістэмы ацяплення дзіцячага саду №4 і правядзенне адпаведных работ запланава на красавік-май 2010 года.

ЗАЯВА

## НАСТУПЛЕННЕ НА НЕЗАЛЕЖНЫХ




**Праваабарончая арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» шкадуе пра рашэнне Вярхоўнага суда Беларусі, які адмовіў у задавальненні іску Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ) да Міністэрства юстыцыі.**

«Учарашнім рашэннем суд адхіліў пратэст БАЖ супраць забароны Мінюста выдаваць сябрам асацыяцыі пасведчанні з надпісам «Прэса», — зазначаецца ў заяве міжнароднай арганізацыі. — Гэта азначае: журналісты-фрылансеры і журналісты, што супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, якія не атрымалі акрэдытацыю, пазбаўлены дакумента з пацвярджэннем іх прыналежнасці да прафесіі».

«Рэпарцёры без межаў» лічаць рашэнне Вярхоўнага суда Беларусі «яшчэ адным крокам у наступленні на незалежных журналістаў напярэдадні выбараў».

«У канцы 2009 года былі прыкметы таго, што беларускія ўлады дазволяць незалежнай прэсе працаваць свабодна, але зараз сітуацыя пагаршаецца напярэдадні мясцовых выбараў, якія пройдуць 25 красавіка, а таксама ў сувязі з будучымі выбарамі прэзідэнта», — гаворыцца ў заяве.

Нагадаем, рашэнне па іску БАЖ Вярхоўны суд вынес 22 сакавіка. Асацыяцыя журналістаў абскардзіла папярэджанне, вынесенае арганізацыі Мінюстам 13 студзеня.

Прычынай для папярэджання стала размяшчэнне на вокладцы пасведчання сябра БАЖ надпісу «Прэса», што, на думку чыноўнікаў, парушае нормы закона аб СМІ. Апрача таго, дзейны пры БАЖ цэнтр прававой абароны СМІ, зазначалася ў папярэджанні Мінюста, не прадугледжаны статутам грамадскага аб'яднання, а «задачы гэтага фарміравання, выкладзеныя ў палажэнні пра яго, выходзяць за межы статутных задач ГА «БАЖ».

**Паводле інфармацыі БАЖ**

СВЯТА



# ДЗЕН ВОЛІ

**Вольга ХВОІН**

**Сёлетняе адзначэнне Дня Волі — угодкаў заснавання Беларускай Незалежнай Рэспублікі — мала чым вылучалася ад папярэдніх мерапрыемстваў. Нешматлюдна, ужо традыцыйныя праблемы з гукаўзмацняльнай апаратурай, прамовы «па накатанай». Але вялікім плюсам гэтай вулічнай акцыі стаў яе мірны характар: і ўлады, і арганізатары змаглі ўсё ж не сапсаваць свята сутыкненнямі з міліцыяй ды разгонам мітынгоўцаў.**

Перад пачаткам мітынгу каля Акадэміі навук у цэнтры Мінска, што быў дазволены Мінгарвыканкамам як месца збору, супрацоўнікі міліцыі, адказныя за працу з журналістамі, так званыя прэс-афіцэры, паведамілі, што маюць інфармацыю, быццам бы падчас мітынгу рыхтуецца правакацыя «падобная да той, што была ўчыненая ў сталіцы ў 2008 годзе 3 ліпеня». На ўдакладняючыя пытанні, адкуль растуць ногі ў правакацыі, прэс-афіцэр адказаў: «З Расіі». Аднак, на шчасце, усё прайшло мірна і добразычліва. Пра магчымую правакацыю ведалі хіба толькі міліцыянты з металашукальнікамі ды сабакам, што аглядалі ці для пратаколу, ці для выгляду карчы і ліхтарныя слупы. Удзельнікі вулічнай акцыі пераходзілі ад адной кампаніі да другой, пераказвалі свае навіны ды цікавіліся планам мерапрыемства. А яго ніхто не ведаў, зрэшты, як і самі арганізатары, хаця ад пачатку гарачых настрояў, з якімі ходзяць штурмаваць кардоны, не было.

Мітынг пачаўся з хвіліны маўчання ў памяць пісьменніка Канстанціна Тарасава, развітанне з якім адбылося акурат 25 сакавіка. Пасля — шэраг традыцыйных прамоў палітыкаў, дзеячаў культуры. Гаварылі пра эканамічныя праблемы, дэмакратыю, незалежнасць, мову, культуру, праўду. Заклікалі да салідарнасці з Мікалаем Аўтуховічам і Уладзімірам Асіпенкам, над якімі цяпер ідзе судовы працэс па абвінавачванні быццам бы ў тэрарызме. Партыя БНФ абвясціла, што распачынае «месяц нацыянальнай салідарнасці», каб сабраць сродкі для хворых беларускіх дзяцей.

Пасля прамоў і надоўгай «літаратурнай праграмы», што прадугледжвала чытанне вершаў, якія, праўда, з-за кепскай апаратуры пачуў далёка не кожны, арганізатары прапанавалі людзям выйсці на тратуар да праспекта «на пяць хвілін», а пасля разыходзіцца па сваіх інтарэсах. Яшчэ хвілін дваццаць броўнаўскага руху побач з Акадэміяй навук, і каля дзвюх тысяч мітынгоўцаў пакрысе арганізаваліся ў кампаніі знаёмцаў — хто песні беларускія спяваць, а хто ў бар падняць келіх пад вокліч «Жыве Беларусь!». Яшчэ не Дзень Св. Патрыка, але ўжо і не пабітыя АМАПАМ да крыві людзі. Праўда, як і летась, невялікая група моладзі паспрабавала рушыць у бок цэнтру Мінска па забароненым уладамі маршруце. Пасля нядоўгага супрацьстаяння з людзьмі ў форме і яны адмовіліся ад задумы.

Па завяршэнні мітынгу адзін з лідэраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Павел Севярынец заўважыў, што Дзень Волі звязаны з абстрактным паняткам свабоды, і павёў вакол рукою, тым самым, відаць, акрэсліваючы межы нашай свабоды, і рэзюмаваў: «То добра, што людзі прыходзяць, збіраючца разам, каб адзначыць гэтае свята». З тым і пагодзімся.

ЗАКЛІК

## ЗНІЗЬЦЕ ПАДАТКІ!

**РГА «Перспектыва» накіравала дэпутатам абласных і Мінскага гарадскога саветаў прапанову наконт зніжэння ставак адзінага падатку. Тэкст адозвы апублікаваны на інтэрнэт-сайце аб'яднання прадпрымальнікаў.**



Як зазначаецца ў дакуменце, індывідуальныя прадпрымальнікі, плацельшчыкі адзінага падатку, «значна пацярпелі» ў апошнія гады ад прывязкі як падатковых, так і арэндных плацяжоў да курсу еўра. З-за гэтага фінансавае становішча абсалютнай большасці прадпрымальнікаў (96 працэнтаў — паводле вынікаў анкетнага апытання, праведзенага РГА «Перспектыва» ў снежні 2009 года) сур'ёзна пагоршылася, прыкладна 15 тысяч з іх знаходзяцца на мяжы банкруцтва.

Разам з тым, ІП — плацельшчыкі адзінага падатку «з'яўляюцца асноўнымі суб'ектамі гаспадарання, ад якіх залежыць праца рынкаў і гандлёвых цэнтраў і, адпаведна, забеспячэнне насельніцтва таварамі народнага спажывання», — заяўляе РГА «Перспектыва». Прадпрымальнікі, якія працуюць на рынках і ў гандлёвых цэнтрах, «забяспечваюць больш як трацiну агульнарэспубліканскага рознічнага тавараабароту, спажывецкі рынак бесперабойна забяспечваецца прымальнымі па цане і якасці таварамі», — гаворыцца ў адозве.

У выніку эканамічнага крызісу за студзень — снежань 2009 года аб'ём рознічнага тавараабароту праз усе каналы рэалізацыі склаў 55,9 трыльёна рублёў і павялічыўся ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам толькі на 3 працэнты. З 1 студзеня 2009 года па 1 студзеня 2010 года адбылося зніжэнне ўдзельнай вагі функцыянуючых гандлёвых аб'ектаў у гандлёвых цэнтрах у цэлым па краіне на 2,5 працэнта. Таксама адбылося зніжэнне ўдзельнай вагі функцыянуючых гандлёвых аб'ектаў і гандлёвых месцаў на рынках на 0,6 працэнта.

На думку «Перспектывы», гэта сведчыць не проста пра стагнацыю рынкаў і гандлёвых аб'ектаў краіны, «а пра першыя прыкметы глыбокага крызісу, далейшае развіццё якога непазбежна ахопіць увесь спажывецкі рынак краіны і будзе мець самыя негатыўныя сацыяльныя і эканамічныя наступствы».

У сувязі з гэтым РГА «Перспектыва» прапаноўвае абласным і Мінскаму гарадскому савету дэпутатаў разгледзець магчымасць знізіць падатак на 20 працэнтаў ад ставак, што дзейнічалі да прыняцця ўказа № 143, у параўнанні на беларускія рублі.

**Паводле БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КРОК НАПЕРАД, ДВА НАЗАД

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Перадвыбарчая кампанія ў мясцовыя саветы набірае абароты. Усё часцей апазіцыя задумваецца, ці варта ў іх удзельнічаць, і збірае з гэтай нагоды малыя і вялікія курултаі. Вынікі, шчыра кажучы, не радуюць.**



Photo.ByMedia.Net

Здавалася б, мясцовыя выбары — менавіта шанец для апазіцыі «стаць тварам да народа». Хаця б у тым, каб даведацца пра інтарэсы простых грамадзян і разам з імі паспрабаваць вырашыць іх праблемы. І гэтым зарабіць сабе балы на наступную прэзідэнцкую кампанію. Каб не было, як у той раз: «А што апазіцыя зрабіла?» — задаваліся пытаннем народ і беларуская тэлевізія. А апазіцыянерам і казаць было няма чаго, акрамя як жаліцца: «А што мы можам зрабіць, калі ў нас улады няма?» Зараз мясцовая кампанія дае шанец хаця б паспрабаваць штосьці зрабіць, каб потым казаць: «БТ хлусіць! Мы зрабілі тое, тое і тое!» На жаль, наўрад ці атрымаецца.

У нядзелю прайшоў з'езд адной з буйнейшых партыяў Беларусі — Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Нягледзячы на заклікі мясцовых актывістаў працягваць удзел у выбарах, з нязначнай большасцю было прынята рашэнне: АГП адмаўляецца ад удзелу ў выбарах як палітычная структура.

«Але ў той жа час мы не павінны шкодзіць тым партыйным кандыдатам, хто вылучаўся шляхам збору подпісаў і гатовы ісці да канца, адчуваючы падтрымку насельніцтва», — заявіў лідэр партыі Анатоль Лябедзька.

Дзіўная сітуацыя. Тым, хто «адчувае падтрымку насельніцтва», партыя, фактычна, у падтрымцы адмаўляе. Такім чынам, кампанію правядуць не «сябры АГП, падтрыманыя насельніцтвам», а «незалежныя кандыдаты, падтрыманыя насельніцтвам». А пра саму АГП як ніхто не чуў, так і чуць не будзе.

Больш плённа прайшоў сойм Партыі БНФ, які даў партыйным кандыдатам у дэпутаты магчымасць самастойна вызначыцца з фарматам далейшага ўдзелу ў мясцовых выбарах. Як растлумачыў адказны сакратар Партыі БНФ Уладзімір Лабковіч, партыйныя прэтэндэнты на дэпутацкі мандат не вераць у дэмакратычнасць выбараў, але маюць намер выкарыстаць выбарчую кампанію для прапаганды дэмакратычных каштоўнасцей.

Хочаш — ідзі ад Партыі БНФ, хочаш — як незалежны кандыдат, а хочаш — увогуле здымайся з выбараў. Гэта пазіцыя больш зразумелая: кожны сам вырашае долю сваёй адказнасці.

Такім чынам, здаецца, лібералы-АГП, прыняўшы рашэнне з'ездам аб няўдзеле, паступілі як заўзятыя кансерватары, а кансерватары-БНФ, якія перадалі ініцыятыву ў прыватныя рукі кандыдатаў, — як сапраўдныя лібералы. У суботу павінна прайсці Нацыянальная рада «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі», якая таксама будзе вырашаць, працягваць удзел у выбарах ці не. У сувязі з папярэдняй тэндэнцыяй, ці не пацвердзяць сябры БХД прынцыпы марксізму-ленінізму?

Тым часам у Вярхоўным судзе працягнуўся працэс па справе Аўтуховіча. Яго і заслухалі, як галоўнага фігуранта абвінавачання. І, здаецца, гэта абвінавачванне рассыпаецца на вачах.

«Першапачаткова наш арышт праводзіўся ў сувязі з паказаннямі нейкага Палтарака: нібыта ён дапамагаў мне перавозіць, разгружаць і захоўваць буйную партыю зброі, аўтаматаў, снайперскіх вінтовак, выбуховых рэчываў. У Ваўкавыск прыехалі прыкладна 150 супрацоўнікаў спецпадраздзялення «Алмаз», шукалі аўтаматы і ўзрыўчатку, але нічога не знайшлі. І калі мне прад'явілі абвінавачанне ў падпале дома Кацубы, я быў шакаваны», — сказаў Аўтуховіч.

Аўтуховіч не адмаўляе, што збіраў інфармацыю пра намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко і былога губернатара Гродзенскай вобласці Уладзіміра Саўчанко.

«І не толькі пра іх, — дадаў падсудны. — Гэта было звязана з тым, што Камянко неаднаразова спрабаваў незаконнымі метадамі знішчыць мой бізнес. Гэта звязана з фактамі карупцыі ў Ваўкавыску, і мы збіралі гэту інфармацыю для таго, каб потым даказаць сваю невінаватасць і незаконнасць дзеянняў Камянко».

Паводле слоў Аўтуховіча, усе сабраныя матэрыялы неаднаразова перадаваліся ім у КДБ, пракуратуру, Савет бяспекі. «Мы звярталіся нават да прэзідэнта. Аднак усе нашы звароты былі як гарох аб сцяну: ніхто не рэагаваў на факты карупцыі. Адзіны, хто імі займаўся, — гэта Казлоў, які тады працаваў кіраўніком УБАЗ па Гродзенскай вобласці. На падставе нашай інфармацыі і яго працы нават была распачата крымінальная справа аб карупцыі, якую потым замялі», — сказаў падсудны.

Аўтуховіч заявіў, што лічыць судовы працэс помстай за яго дзейнасць па раскрыцці фактаў карупцыі ў Ваўкавыску.

Канешне, Аляксандру Лукашэнку няма часу, каб рэагаваць на заявы ўсялякіх апазіцыянераў. Супрацоўніцтва з бразільскім штатам Гояс стане свайго роду плацдармам для пашырэння гандлёва-эканамічных сувязяў з Бразіліяй, заявіў Аляксандр Лукашэнка 22 сакавіка на сустрэчы з губернатарам штата Алсідэсам Радрыгесам Фільё. «Нам трэба за нешта ўчапіцца, каб з гэтага плацдарма мы маглі пашыраць наша супрацоўніцтва настолькі, наколькі гэта магчыма», — сказаў ён. Беларусь «акрэсліла ўзаемадзеянне з велізарным штатам Бразіліі, насельніцтва якога складае амаль 30 мільёнаў чалавек, з велізарным ВУП і вельмі развітай эканомікай, якая мае патрэбу ў тых таварах, якія вырабляе Беларусь».

Добра, можа быць, што Бразілія зацікаўленая ў беларускіх трактарах. Хаця злыя эканамісты кажуць, што найбольш іх цікавяць нашы калійныя ўгнаенні, якія цікавяць усіх. А трактары яны могуць і бліжэй набыць. Але што мы будзем экспартаваць з Бразіліі? Здаецца, акрамя знакамітага бразільскага маскараду і шмат-шмат дзікіх малпаў нас там нічога не цікавіць.

Хаця мы можам там лячыцца. Паводле звестак фтызіятрычнай службы, кожны другі хворы на туберкулёз выдзяляе бактэрыі, паведаміў 23 сакавіка на семінары ў Мінску намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра (РНПЦ) пульманалогіі і фтызіятрыі Алег Калечыц. Паводле яго слоў, гэта не азначае, што ў астатніх хворых не адбываецца выдзяленне бактэрый, але сведчыць пра больш шырокія магчымасці дыягностыкі.

Думаю, свежае бразільскае паветра — вось што будзе запатрабавана беларусамі. І нашай медыцыне палёгка. Галоўнае, каб усе мелі такія ж магчымасці туды паляцець, як і Аляксандр Рыгоравіч.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

Лявон Вольскі прэзентаваў новы сольны альбом «Белая яблыня грому» на вершы беларускіх класікаў — Францішка Багушэвіча, Яна Чачота, Адама Міцкевіча, Пімена Панчанкі, Пятруся Броўкі, Аркадзя Куляшова. Мэта праекта — вяртанне творчасці вядомых беларускіх паэтаў у сучасны культурны кантэкст. На прэзентацыі альбома, што адбылася ў Купалаўскім тэатры, прысутнічалі не толькі звычайныя гледачы, але і дыпламаты: пасол Літвы Эдмінас Багдонас, пасол Украіны Ігар Ліховы, пасол Швецыі Стэфан Эрыксан і ганаровы консул консульства Каралеўства Нідэрландаў Аляксандр Вінакураў.

Ідэю запісаць класіку ў сучасным выкананні Лявон Вольскі патлумачыў тым, што адчувае сябе «часткай беларускага народа». «Чытаць вершы беларускіх класікаў сёння не модна, яны настолькі адарваныя ад шырокіх мас! Нават у кругах інтэлектуалаў не прынята прызнаваць савецкую спадчыну: «Ой, ну хто там быў? Усё каля ўладнай кармушкі стаялі, лізаблюды…» Хоць там ёсць вельмі цікавыя вершы. У таго ж Танка, Панчанкі, Куляшова, — гаворыць артыст. — Прызнаюся, нягледзячы на сваё літаратурнае паходжанне, я сам Куляшова да гэтага не чытаў. Памятаю толькі «Цвёрда трымайся юнак на дапросе…» — і ўсё. Зараз мне смешна і незразумела, як так атрымалася. У мяне ж усе гэтыя кнігі на паліцах стаялі!»

### ВІТАЛЬ ГУРКОЎ



Упершыню ў гісторыі Беларусі наш спартовец выйшаў у фінальную частку спаборніцтваў К–1, якія аб'ядноўваюць усе ўдарныя віды спорту. Баец Віталь Гуркоў правёў тры двубоі за адзін вечар і атрымаў кубак чэмпіёна Усходняй Еўропы па К–1 MAX. Спаборніцтвы праходзілі ў сталічным Палацы спорту. Першая перамога была над палякам Лукашам Шульцам, другая — над чэмпіёнам Еўропы па боксе грузінам Энрыке Гагохія, апошнім пад націскам Гуркова здаўся прадстаўнік Беларусі Замін Гусейнаў. Перамогу Віталь прысвяціў сваім знаёмым і «сябрам сяброў», якія загінулі за апошні час у Маскве і Пецярбурзе.

Віталь Гуркоў тайскім боксам займаецца каля дзесяці гадоў, і, як лічыць баец, у гэты від спорту патрапіў выпадкова. Спачатку спрабаваў сябе ў баскетболе, футболе, спартовым арыентаванні. Але пасля патрапіў да «свайго» трэнера і пачаў мэтанакіравана займацца тайскім боксам.

Віталь Гуркоў — шматразовы чэмпіён свету па тайскім боксе.

### АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА



Палітык Анатоль Лябедзька ў чарговы раз пераабраны старшынёй Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Падчас XIII з'езду партыі, што прайшоў 21 сакавіка ў Мінску, за Лябедзьку прагаласавалі 89 дэлегатаў са 109 (82 працэнта — амаль «элегантная перамога»). Выбары прайшлі на безальтэрнатыўнай аснове. У якасці апанента дзеючаму лідэру партыі быў вылучаны прадпрымальнік з Барычава Віктара Гарбачоў, але ён узяў самаадвод, патлумачыўшы, што «бракуе сілаў, сродкаў і духу, каб узначаліць партыю», — паведамляе «Наша ніва». Цікава, што спадар Лябедзька ачольвае партыю ажно з 2000 года.

«Я разумею, што не з'яўляюся лідэрам палітычнай партыі ў тым сэнсе, як гэта ўспрымаюць у цывілізаваных краінах, — зазначыў у сваім выступе Анатоль Лябедзька. — Хутчэй за ўсё, мне даводзіцца выконваць функцыю антыкрызіснага менеджэра. І паверце, я, як ніхто іншы, ведаю найскладанейшы механізм Аб'яднанай грамадзянскай партыі». Апроч таго, палітык зазначыў, што апошнія месяцы ў партыі вялася «пэўная праца — мярзотныя дзеянні, якія больш характэрныя прадстаўнікам улады, а не дэмакратычнай апазіцыі», накіраваная на стварэнне кааліцыі ў супрацьвагу дзеючаму кіраўніцтву.

Намеснікамі старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі абраныя Яраслаў Раманчук і Леў Марголін.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# КУДЫ ПАЕХАЎ ЦЫРК?

Сяргей НІКАЛЮК

**Сакавік — месяц ідэалагічны. Такая традыцыя. Свой пачатак яна бярэ ад дакладу, які зрабіў «адзіны беларускі палітык» (АБП) на ідэалагічным семінары ў 2003 годзе.**



Час быў няпросты. З ростам рэальных прыбыткаў у рэспубліцы пачаліся праблемы, якія асабліва хваравіта перажываліся несвядомай часткай грамадства на фоне шчадротаў 2001 года. Рэйтынг АБП пайшоў уніз (глядзі табліцу). У тых умовах, якія склаліся, яму нічога іншага не заставалася, як ухапіцца за саломінку ідэалогіі. Балазе, савецкі досвед яшчэ не згубілі.

З падобнай праблемай сутыкнуліся і ў Расіі, толькі тое, што ў нас назвалі дзяржаўнай ідэалогіяй, у іх — нацыянальнай ідэяй. Для яе пошуку Крэмль сабраў групу інтэлектуалаў і выдзеліў адпаведныя рэсурсы. Прапановы пасыпаліся як з рога, але найбольш ёміста і лаканічна нацыянальную ідэю здолеў сфармуляваць географ Леанід Смірагін: «*Поправь забор, не с... в подъезде*». Аднак пасля доўгіх дэбатаў ідэю Смірагіна адкінулі з прычыны немагчымасці яе практычнай рэалізацыі.

У Беларусі да ўзроўню пад'езда вырашылі не апускацца. Напэўна, паўплывала гістарычная адукацыя галоўнага заказчыка. Мяркуйце самі: «...*Временем, судьбой, ситуацией Беларусь выдвинулась на, наверное, великую роль духовного лидера восточноевропейской цивилизации. И не потому, что мы этого хотим, что мы к этому стремились. Или потому, что мы такие умные. Так сложилось в силу нашего консерватизма*...»

Карацей, чацвёрты Рым! Калі мне памяць не здраджвае, манах Філафей пісаў у лісце Васілю III: «Царква Старажытнага Рыму загінула з-за сваёй ерасі. Брама Другога Рыму — Канстанцінопаля — была пасечана няверным туркамі». Трэці Рым (Масковія), трэба думаць, капітуляваў пад напорам гайдараўскіх рэформаў. А тут якраз і мы...

## Сакрэтныя пратаколы

Адзначу, што ў сакавіку 2003 года АБП увесь час перасокваў з ідэалогіі дзяржавы на ідэалогію грамадства. Бясспрэчна, «*общество (любое — С.Н.) не может существовать без целостного свода идей, ценностей и норм, объединяющих всех граждан*». А вось большасць сучасных краін без дзяржаўнай ідэалогіі выдатна абыходзіцца. Ёсць, канечне, выключэнні. Іран з яго аятоламі — першае, што прыходзіць у галаву.

Без дзяржаўнай ідэалогіі не маглі існаваць і традыцыйныя імперыі. У артыкуле «Цана расійскага сіндрому» я, у прыватнасці, адзначаў, што Расійская імперыя несла заваяваным народам ідэю праваслаўя. Тут усё зразумела, як і зразумелыя праблемы рускіх, якія ніяк канчаткова не пазбавяцца імперскіх звычак.

Але якім чынам такая прэтэнзія на ідэалагічнае месіянства магла сфармавацца ў геаграфічным цэнтры Еўропы? Мой адказ зводзіцца да таго, што не варта занадта вялікую ўвагу надаваць агучаным фармулёўкам. Гэтак жа, як у пакта Молатава—Рыбентропа былі сакрэтныя пратаколы, без якіх сапраўдны сэнс пакта зразумець немагчыма, так і ў афіцыйнага тэксту даклада маюцца дадаткі. Яны не былі апублікаваныя ў СМІ, але ў выглядзе зборніка матэрыялаў ідэалагічнага семінару знайсці іх нескладана.

Прывяду найбольш яркую цытату: «*Я трижды заходил на эту цель, как истребитель, чтобы вы поняли, для чего нужна идеологическая работа. Надо уметь удерживать власть. И не только удерживать, но и защищать. Лучше всего это делать идеологическими средствами*» (выдзелена аўтарамі брашуры).

А вось цытата з акадэміка Бабосава. Яго кнігамі па шырокім спектры гуманітарных навук забітыя ўсе кнігарні ў рэспубліцы (зразумела, ёсць сярод іх і падручнік па дзяржаўнай ідэалогіі): «Для падвышэння эфектыўнасці ідэалагічнай дзейнасці вельмі пажадана, каб усе кадры, якія займаюцца выхаваўчай працай, авалодалі сацыяльнай тэхналогіяй уплыву на масы». Сацыяльныя тэхналогіі, паводле акадэміка, — гэта сукупнасць прыёмаў для «ідэйнага ўздзеяння на асобных індывідаў і сацыяльныя групы людзей» з мэтай «найхутчэйшага і якаснага атрымання пажаданага выніку».

Такім чынам, мы і які ўжо раз вяртаемся да пытання наконт суб'екту беларускай палітыкі. Паводле беларускай Канстытуцыі, адзіным суб'ектам палітыкі з'яўляецца народ. Адпаведна, толькі ён мае права вызначаць, што варта лічыць «пажаданым вынікам». Але, як бачна з прыведзенай цытаты, на гэты конт маецца іншы пункт гледжання. І ён відавочна не супадае з палажэннямі Канстытуцыі.



www.3dway.org

Той, хто наіўна лічыць, што галоўная задача ідэалагічнай нарады ў сакавіку 2003 года была ў распрацоўцы дзяржаўнай ідэалогіі, — памыляецца. Перачытайце даклад. Ён прысвечаны будаўніцтву ідэалагічнай «вертыкалі» на «*уровнях государственного управления — как по территориальному, так и отраслевому принципу*».

## За што ёй плацяць?

Сакавік — месяц ідэалагічны. У сакавіку 2003 года дзяржаўная ідэалогія ў Беларусі нарадзілася, а ў сакавіку 2010-га памерла. Пра гэта на сайце «Беларускіх навін» паведаміў далёка не апошні чалавек у ідэалагічнай іерархіі — кіраўнік Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі. Шырокімі мазкамі ён намаляваў вельмі праўдападобную карціну сацыяльнай рэальнасці, у якой апынуліся «рабочы і калгасніца», і падкрэсліў, што гэта адбывацца «пры поўнай адсутнасці афіцыйнай ідэалогіі».

Гэта прызнанне спарадзіла безліч пытанняў. Да чалавека, як бы гэта мякчэй сказаць, з нізкім узроўнем IQ спадар Зімоўскі не падобны. Можа, у хаце нешта ў яго здарылася або на працы якіясьці непрыемнасці — рознае ж бывае... Прайшоў дзень, другі. Мінуў тыдзень, і вось у інтэрв'ю «Белгазеце» падбухторшчык беларускага ідэалагічнага балота растлумачыў, што рэалізаваць падобнае абмеркаванне яму даручыў АБП!

Тут у чарговы раз я не магу адмовіцца ад цытавання: «Прэзідэнт нічога ад ідэолагаў не чакае. І ведаеце чаму? Таму што ўсе зблыталі наяўнасць ідэалагічнай вертыкалі і наяўнасць ідэалогіі. Гэта не адно і тое ж. У нас ёсць ідэалагічная вертыкаль, я сам стаяў у вытокаў яе стварэння. Але ёй плацяць не за тое, каб яна ідэі генеравала. А ідэалогіі ў нас няма. Яе адсутнасць канстатуюць усе, і прэзідэнт уключна».

Многія аналітыкі ў прызнанні спадара Зімоўскага разгледзелі «наезд» на галоўнага штатнага ідэолага Беларусі намесніка кіраўніка адміністрацыі АП Наталлю Пяткевіч. Яе адказ не прымусіў сябе доўга чакаць. Ён прагучаў з Кобрына, дзе на абласную канферэнцыю сабраліся калегі Пяткевіч па ідэалагічнаму цэху. Аднак у адказе ўтрымлівалася не аспрэчванне, а згода з асноўнай крамольнай думкай кіраўніка НДТРК: «Сёння мы ўжо можам сказаць, што ідэалагічная вертыкаль у нашай краіне ёсць, і мы ўжо гаворым не пра станаўленне, а пра ўдасканаленне яе працы». Усё зразумела? У краіне ёсць ідэалагічная вертыкаль, а вось пра наяўнасць дзяржаўнай ідэалогіі, прынамсі з Кобрына, інфармацыі не паступіла.

Пра тое, што ідэалагічная вертыкаль у Беларусі далёка не віртуальная, шмат хто з суайчыннікаў ведае з сацыяльнай рэальнасці, што даецца ім непасрэдна ў адчуваннях. Выбарчая кампанія шанцы атрымаць падобныя адчуванні істотна павялічыла. Паведамленні кшталту: «пачасціліся выклікі сваякоў прэтэндэнтаў у выканаўчыя камітэты да начальнікаў ідэалагічных упраўленняў або да намеснікаў дырэктараў па ідэалагічнай працы на прадпрыемствах» нікога ўжо не дзівяць.

Як адзначыў у свой час АБП: «*идеологические работники — «исключительно штучный товар»*. З гэтым, сапраўды, не паспрачаешся. Больш таго, за права і магчымасць «штучнага товара» кантраляваць нашу добранадзейнасць, дзяржава расплачваецца з нашай кішэні.

## На свой страх і рызыку

Цырк дзяржаўнай ідэалогіі паехаў, а ідэалагічныя клоуны засталіся. Яны ўсе пры справе. Няма, мабыць, такой праблемы, за рашэнне якой не ўзялася б бюракратыя. Загадаюць саджаць кукурузу квадратна-гнездавым спосабам — яны адразу ж шпарка вазьмуцца за рэалізацыю. Загадаюць несці дзяржаўную ідэалогію ў масы — аналагічна. Але канчатковым вынікам іх высілкаў нязменна будзе новая бюракратычная структура, якая самім фактам свайго існавання пачне спараджаць дадатковыя праблемы. Для іх вырашэння будуць створаны дадатковыя бюракратычныя структуры. Так запускаецца бюракратычнае «кола агляду». Ці варта пасля гэтага дзівіцца, што ў краіне 57 кантрольных і наглядных інстанцый і 139-е месца ў свеце па Індэксу ўспрымання карупцыі.

Вось зусім свежая інфармацыя. Следчыя КДК і МУС выявілі беспрэцэдэнтныя махінацыі з дзяржаўнымі датацыямі, прызначанымі для падтрымкі аграпрамысловага комплексу Беларусі. Лік ідзе на дзесяткі мільярдаў рублёў. Калі ад рублёў перайсці да тон збожжа, на закупку якога гэтыя самыя мільярды сышлі, то атрымліваецца каля 1,5 мільёна тон. Нагадаю, беларускі каравай у 2009 годзе важыў 8,5 мільёна тон!

Сакавік — месяц ідэалагічны. На днях у Мінску завяршыўся рэспубліканскі семінар прадстаўнікоў «*штучного товара*». Здавалася б, пасля прызнанняў Зімоўскага, падмацаваных спасылкамі на АБП, пытанне пра наяўнасць/адсутнасць у Беларусі дзяржаўнай ідэалогіі павінна было апынуцца ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў семінара. Але, калі меркаваць па «*Советской Белоруссии*», гэтага не здарылася. Маё тлумачэнне такога парадоксу заключаецца ў наступным: нягледзячы на рытуальныя заявы пра адзінства нацыі, улада выдатна ведае, што не карыстаецца падтрымкай прыкладна 1/3 грамадства. Уздзейнічаць праз дзяржаўныя СМІ на апазіцыйна настроеных грамадзян яна не ў стане, а таму і быў распрацаваны абыходны манеўр.

Звернемся да першакрыніцы: «Ратуе пакуль сістэму той факт, што змянілася скіраванасць апазіцыйнасці як звонку, так і ўсярэдзіне. Заўважце, сёння ўжо ніхто не патрабуе змены рэжыму і ўлады — гэта выключна ідэалагічная апазіцыйнасць. Пры гэтым і я, і мае апаненты сыходзімся ў тым, што прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнка — геній. **Засталося прыпрэгчы тэму захавання ўлады да лібералізацыі**. Вось гэтым я на свой страх і рызыку і займаюся».

Дык вось куды паехаў цырк дзяржаўнай ідэалогіі! Ён паехаў у недзяржаўныя СМІ. Для таго, каб «прыпрэгчы тэму захавання ўлады да лібералізацыі», ад шараговых прадстаўнікоў «*штучного товара*» карысці няма ніякай. Іх задача — дзяліць беларусаў на добранадзейных і нядобранадзейных. А для працы з недзяржаўнымі СМІ патрабуюцца ідэолагі з цалкам іншым IQ, і такія, мяркуючы па ўсім, у дзяржавы ёсць.

**РЭАЛЬНЫЯ ГРАШОВЫЯ ПРЫБЫТКІ НАСЕЛЬНІЦТВА, У ПРАЦЭНТАХ ДА ПАПЯРЭДНЯГА ГОДА, І ЭЛЕКТАРАЛЬНЫ РЭЙТЫНГ ПРЭЗІДЭНТА ЛУКАШЭНКА ПАВОДЛЕ ДАДЗЕНЫХ НІСЭПД**

| Год | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рэальныя грашовыя прыбыткі | 114 | 128 | 104 | 104 | 110 | 118 | 118 | 113 | 113 |
| Рэйтынг Лукашэнкі* | 36 | 41 | 30 | 29 | 39 | 47 | 55 | 46 | 41 |

* Сярэднегадавы паказчык

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# СМЕХ З ЕЎРОПЫ ПРАЗ РАССТРЭЛЫ

Вольга ХВОІН

**У Беларусі прыведзеныя ў выкананне чарговыя смяротныя прысуды. Скарга асуджаных у гэты час знаходзілася на разглядзе ў Камітэце па правах чалавека ААН. Праваабаронцы заяўляюць пра парушэнне патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства і міжнародных абавязкаў, ратыфікаваных нашай краінай.**

Адзін з расстраляных — Васіль Юзэпчук — быў асуджаны да смяротнай кары 29 чэрвеня 2009 года за забойства шасці пажылых жанчын. Другому — Андрэю Жуку — смяротны вердыкт быў вынесены 22 ліпеня 2009 года за ўзброены напад і забойства мужчыны і жанчыны (вадзіцеля і эканаміста, што везлі зарплату) у лютым мінулага года. Яны безумоўна вартыя кары.

Аднак у праваабаронцаў падставаў для абурэння з'яўляецца парушэнне патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства і міжнародных абавязкаў, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь. І Юзэпчук, і Жук абскарджвалі свае прысуды, але апеляцыі былі адхіленыя. Абодва падавалі прашэнні аб памілаванні, аднак, паводле «Amnesty International», адмоўнае рашэнне кіраўніка дзяржавы было паведамлена асуджаным перад іх расстрэлам. У кастрычніку мінулага года Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў заявы гэтых вязняў і заклікаў беларускія ўлады не прыводзіць у выкананне смяротныя прысуды, пакуль яны разглядаюцца ў камітэце.

«Улады былі праінфармаваныя, што гэтыя скаргі зарэгістраваныя ў Камітэце па правах чалавека ААН, ёсць рэгістрацыйныя нумары, — гаворыць юрыст праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч. — Мы са свайго боку інфармавалі Міністэрства замежных спраў, Генеральную пракуратуру пра гэта, заклікалі не выконваць прысуды. І нам прыйшлі адказы, што інфармацыя вядомая. Улады выдатна ведалі пра ўсе працэдуры і, лічу, тым не менш свядома іх парушылі».

«Калі мы гаворым пра вынясенне судовых пакаранняў, то мусім зыходзіць з таго, што суд павінен быць незалежным падчас разгляду справы і пры вынясенні прысуду. Але само выкананне пакарання — выключна адміністрацыйнае рашэнне. Улады маглі гэтага не рабіць. Таму, безумоўна, у нас ёсць усе падставы гаварыць, што дзяржаўная машына спрацавала так не па інерцыі. Гэта было зробленa ў нейкіх мэтах. У якіх — мы можам толькі здагадвацца», — гаворыць кіраўнік Беларускага Хельсінскага камітэта Алег Гулак.

«Amnesty International» распаўсюдзіла зварот, у якім падкрэслівaeцца, што смяротныя пакаранні былі здзейснены неўзабаве пасля таго, як Парламенцкая асамблея Савета Еўропы прагаласавала за аднаўленне статусу адмыслова запрошанага для беларускага парламента з умовай, што Рэспубліка Беларусь абвесціць мараторый на прымяненне смяротнай кары. Апроч таго, з гэтай нагоды была зробленая сумесная заява старшыні камітэта міністраў Савета Еўропы Мішэлін Кальмі-Рэй, кіраўніка Парламенцкай асамблеі Меўлюта




Чавушоглу і генеральнага сакратара Турбьёрна Ягланда.

Вінаватыя за злачынствы мусяць быць пакараныя — гэта не аспрэчваецца. Беларусь не толькі адзіная прыводзіць у выкананне смяротныя пакаранні ў Еўропе, але і мае спецыфічныя працэсуальныя нормы ў гэтым аспекце правасуддзя.

Родныя Андрэя Жука даведаліся, што яго ўжо няма ў жывых, калі прывезлі чарговую перадачу ў СІЗА № 1, дзе знаходзіўся асуджаны. «19 сакавіка прывезлі перадачу, дзяжурны сказаў нам: іх некуды звезлі. Пытаюся, ці не самае страшнае? Адказвае — не. Пасля выйшаў нехта з адміністрацыйных работнікаў і сказаў: «Вы яго нідзе не шукайце, чакайце апавяшчэння», — расказвае Святлана Жук, маці расстралянага злачынцы. — Гэта быў шок. Я лічу, што гэта блюзнерства, як можна так здзекавацца з бацькоў? Калі я спрабавала даведацца хаця б дату, прасіла аддаць яго мне, начальнік сказаў: «Што вы тут дэбашырыце, зараз выклічам нарад, і вас забяруць». Усе выходныя ездзілі вакол Мінска па могілках, шукалі свежыя магілы...».

Прадугледжаныя заканадаўствам афіцыйныя паведамленні судоў, якія вынеслі смяротныя прысуды, аб іх выкананні да цяперашняга часу родным не дасланыя. Маці Андрэя Жука дайшла да Адміністрацыі прэзідэнта. «Мне адказалі, — гаворыць Святлана Жук, — што прэзідэнт па асабістых справах не прымае, можна толькі да ўпаўнаважанага. Па жывой чарзе я патрапіла да яго на прыём. Не ведаю, як можна назваць гэтага ўпаўнаважанага, ён малады, па ўзросту як мой сын, пачаў размаўляць са мной на падвышаных тонах. У выніку сказаў, што я магу толькі напісаць у Міністэрства ўнутраных спраў, каб мне паказалі магілу сына. Усё».

Калі чалавек здзейсніў забойства, то, натуральна, яму цяжка знайсці апраўданне, дый у большасці выпадкаў не варта. Але ў злачынцы ёсць бацькі, і для маці яе сын застаецца сынам. І яна мае права хаця б аплакаць цела свайго дзіцяці. Беларускія праваабаронцы будуць настойваць, каб родным выдалі целы расстраляных. У 1999 годзе Камітэт па правах чалавека ААН разглядаў скаргі асуджаных да смяротнай кары, працэсуальных парушэнняў эксперты не знайшлі, аднак камітэт прыраўняў дзейсныя ў Беларусі працэдуры выканання смяротнага пакарання да нечалавечай формы абыходжання.

Варта толькі дадаць, што Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і факультатыўны пратакол да яго, тым самым прызнаўшы кампетэнцыю Камітэта па правах чалавека ААН разглядаць індывідуальныя скаргі па магчымаму парушэнню якога-небудзь з правоў, выкладзеных у Пакце. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе выкананне агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаных міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы. Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь замацаваў прыярытэт міжнародных дамоваў над нацыянальным заканадаўствам, якое рэгулюе выкананне крымінальных пакаранняў.

У сувязі з выкананнем смяротных прысудаў Юзэпчуку і Жуку беларускія праваабаронцы агучылі і патрабаванне да кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь выконваць нацыянальнае заканадаўства і міжнародных абавязацельстваў, паважаць правы чалавека і найвышэйшую каштоўнасць — жыццё.

24 сакавіка суд Ленінскага раёна Мінска пакараў штрафамі ў 0,5 базавай велічыні праваабаронцаў Алеся Бяляцкага, Ірыну Тоўсцік і Валянціна Стэфановіча за правядзенне несанкцыянаванага пікета супраць смяротнага пакарання каля Адміністрацыі прэзідэнта.

ДЫСКУСІЯ

# ПАД ПАТРАНАЖАМ ЕЎРОПЫ

Вольга ХВОІН

**У Беларусі, каб прадстаўнікі дзяржаўных органаў і апазіцыі сустрэліся за адным сталом, патрэбна адна з дзвюх умоў. Або валявое рашэнне з Адміністрацыі на Карла Маркса, або міратворчае мерапрыемства пад патранажам еўрапейскіх структур.**

Гэтым разам пад патранажам Паўночнага савета ў Мінску адбылася канферэнцыя «Роля палітыкаў у грамадстве, якое мяняецца». Удзел замежнага боку (і трэба зазначыць высокі ўзровень яго прадстаўніцтва) збольшага звёўся да апісальных выступаў наконт мадэлі эканамічнага і палітычнага развіцця краін Скандынавіі і Балтыі.

Натуральна, выказваліся спадзяванні і наконт еўрапейскай будучыні Беларусі. Так, сябра прэзідыуму Паўночнага савета, адказны за кантакты з Беларуссю, дэпутат парламента Нарвегіі Дагфін Хойбротэн заявіў, што Беларусь можа ўвайсці ў «еўрапейскую сям'ю», але толькі калі тут будуць падзяляцца агульнапрынятыя прынцыпы свабоды і дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закону. Важным крокам мусіць стаць далучэнне Беларусі да Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабодаў.

Беларусы не прамінулі скарыстацца магчымасцю ды ўступіць са сваімі ўнутраным апанентамі ў дыскусію. Пасля ўзнёслага выступу прадстаўніка беларускага парламента Міхаіла Русага, які параўноўваў беларускую «адметную мадэль развіцця» са скандынаўскай ды заклікаў палітыкаў прыводзіць да нас інвестараў (па словах Русага, да рэалізацыі запланаваны сумесны праект з кампаніяй NEFCO — карпарацыяй Паўночнаеўрапейскіх краін па фінансаванню прыродаахоўных праектаў), якіх тут чакае цёплы прыём і гарантыі стабільнасці, з залі пасыпаліся пытанні. Балючыя і, на жаль, ужо доўгі час рытарычныя: правы і свабоды грамадзян, рэгістрацыя партый і грамадскіх аб'яднанняў, палітычныя вязні. Аднак канструктыўнага адказу ніхто не пачуў, толькі завучаныя і растыражаваныя, а месцамі і абсурдныя тэзы.

Напрыклад, наконт канфлікту вакол непрызнанага ўладамі Саюза палякаў Міхаіл Русы выказаўся так: «Дзейсны Саюз палякаў створаны палякамі, якія пражываюць у Беларусі, зарэгістраваны. Калі нехта хоча яшчэ адзін саюз стварыць, то такое не прадугледжана законам».

Прэтэнзіі да абмежаванняў па рэгістрацыі палітычных партый парламентарый лічыць надуманымі. «Я не ведаю выпадкаў, калі неабгрунтавана былі незарэгістраваныя партыі. Вось Калякін (Сяргей Калякін — кіраўнік левай партыі «Справядлівы свет») адну партыю ліквідаваў, другую стварыў. Калі вы не можаце сабраць усе дакументы, неабходныя для рэгістрацыі, — гэта вашы праблемы», — зазначыў Русы.

«Лепш не гаварыце ўвогуле, калі не ведаеце, — абуралася лідэр камуністаў. — Я не ліквідавала партыі і не стварыў новай. «Новы свет» — гэта тая ж партыя камуністаў Беларусі. Аднак мы з калегамі спрабуем на працягу чатырох гадоў стварыць грамадскае аб'яднанне «Гарызанталь». Чатыры разы мы праводзілі ўстаноўчы сход, і ніхто не можа патлумачыць, чаму нас немагчыма зарэгістраваць. Гэта не мае ніякага дачынення да дэмакратыі ў разуменні еўрапейскіх краін. Рэгістрацыя палітычных партый неабходная, каб яны мелі дадатковыя магчымасці. Чаму нашы партыі ўвесь час дыскрымінуюцца ў сваіх правах, гарантаваных Канстытуцыяй? Права на арганізацыю дэманстрацый, правядзенне мірных сходаў і іншыя. Чаму, калі, па вашых словах, мы рухаемся да дэмакратыі, у нас права прымяняецца ў забараняльным кантэксце?»

Лагічнай кропкай у гэтай дыскусіі стала заява Міхаіла Русага наконт прэтэнзій да наяўнасці ў Беларусі палітычных вязняў (пазіцыя не толькі мясцовых праваабаронцаў, але і ўплывовай «Amnesty International»). «У нас увогуле няма такіх артыкулаў у Крымінальным кодэксе», — адрэзаў парламентарый.

Што тычыцца практычнага складніка сустрэчы, то наўрад ці ён мае месца. Хутчэй, гэта звычайнае «зандзіраванне глебы» ды спробы ЕС пасадзіць за адзін стол прадстаўнікоў з розных бакоў палітычных барыкад.

Варта прызнаць, што спрактыкаванаму воку адразу бачна хваравітасць палітычнай атмасферы ў Беларусі. Таму гарантыі замежным інвестарам, пра якія ўвесь час паўтараюць прадстаўнікі афіцыйнага Мінска, залежаць не ад зразумелай цывілізаваным краінам сістэмы палітычных стрымак і процівагаў, а ўсё яшчэ ад волі аднаго чалавека.

▸ НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ СЛУЖБА БЕЛАРУСІ



Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Неўзабаве ў Беларусі павінны прыняць закон аб альтэрнатыўнай вайсковай службе. Гэтая навіна нечакана дала мне ключ да вобразу аднаго з самых заўважных прадстаўнікоў новай генерацыі — выпускніка Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа Глеба Лабадзенкі.**

Большасць з тых беларусаў, якім вядома пра існаванне Глеба Лабадзенкі, нават не здагадваюцца, што ён — паэт. Прычым прызнаны яшчэ ў тынэйджэрскім веку, што задакументавана, між іншага, у адной з найлепшых кніг белліткрытыкі за апошнія гады — «Паэтычным аглядальніку» Аляксандра Фядуты, дзе ў эсэ «Маніфест прыпэйджанага пакалення» аўтар аналізуе дэбютны Глебавы зборнік «Pager-вершы». Але для «нацыі паэтаў» умець пісаць вершы ў школьным веку — гэта як з дзяцінства дасканала валодаць замежнай мовай: лянівы пойдзе выдатнікам на філфак, працавіты атрымае ў дадатак да свайго «кунг-фу» якую-небудзь карысную прафесію. Вось і чуеш час ад часу ад людзей, блізкіх да эпіцэнтру сучаснай літаратуры, маўляў здольны вершаскладальнік Лабадзенка толькі і робіць, што разменьвае талент на журналістыку.

Але нават не аб працы Глеба ў «Камсамольскай праўдзе ў Беларусі», якая і зрабіла яму імя, і працягу карэспандэнцкай кар'еры ў газеце «Звязда» хачу я сёння павесці гаворку. Шчыльней за ўсё прыцягвае маю да яго ўвагу яго пасіянарная, гіпеャктыўная, але ўсё ж такі прадуманая, мэтанакіраваная і плённая грамадская дзейнасць. Некаторыя называюць гэта «менеджментам нацыянальных праектаў». Але мне здаецца, тут не пасуюць такія ўзнёслыя саманазвы. Бо гаворка аб штодзённай працы руціннейшай за арганізатарскую, нуднейшай за масавікова-зацейніцкую. Калі ўжо называць гэта нейкім існым паняткам, то Глеб Лабадзенка — жаўнер-альтэрнатыўшчык на службе ў Беларусі. Але не ў агульнапрынятай Беларусі, а ў нашай, беларускай.

## Агонь у вачах

Амаль немагчыма пакуль што адслужыць на карысць радзімы, не пайшоўшы ў «нармальнае» войска, беларускаму хлопцу, калі браць зброю ў рукі яму не дазваляюць рэлігійныя або маральныя перакананні. Значна прасцей з гэтым у Германіі. Адзін мой знаёмы бюргер, які праходзіў альтэрнатыўную службу, не хаваў, што хітрыў перад шматлікімі камісіямі, каб давесці свой хранічны пацыфізм. Альтэрнатыўшчына лічыцца ў Германіі добрым спосабам павандраваць па Еўропе.

Але нават гэты бюргер прызнае: сярод нямецкіх маладых валанцёраў даволі шмат «прыпыленых» — то бок, сапраўды ідэйных, у якіх вочы гараць дапамагчы бліжняму. Менавіта такія хлопцы, метадам натуральнага адбору, трапляюць у Румынію, Украіну, Беларусь. Вось і выходзіць: хворых на рак беларускіх дзяцей ды вар'ятаў у псіхлякарнях даглядаюць спагадлівыя 19-гадовыя нямецкія хлопцы. За час службы ім спаўняецца дваццаць: рэаліі сінявокай робяць з хлапчукоў мужчынаў не горш ад Бундэсверу.

Вочы, якія гараць дапамагчы бліжняму, я бачу шторазу, калі сустракаю Глеба Лабадзенку.

## Нямодны ліцэіст

Невыпадковая акалічнасць: Глеб — выпускнік Коласаўскага ліцэю. Але, нягледзячы на грунтоўную гуманітарную адукацыю, ім атрыманую, тыповым выпускніком гэтай легендарнай установы наваць яго не выпадае... Калі я пераходзіла ў восьмы клас, маці расказала мне пра магчымасць паступіць у такі выдатны ліцэй, і нават крыху агітавала зрабіць гэта. Але многіх апалагетаў нацыянальнага Адраджэння вельмі здзівілі б яе матывацыі: «Гэта выдатная ўстанова! Яе скончыў сын мастака N., там вучыцца дачка пісьменніка X. і дзеці дэпутата Y.!» Мама захоплена расказвала пра навучальныя метады і праграмы ліцэя, аб канцэпцыі кшталтавання элітаў…

У дзевяностыя аддаваць дзяцей у Коласаўскі было модна. У гады, калі з Ліцэя выпускаліся Франак Вячорка і Глеб Лабадзенка, маці плакала, чытаючы газеты: «Бедныя дзеці, бедныя бацькі… Пачварна тое, што адбываецца, але я ніколі б не дазволіла табе вучыцца ў падполлі!»

З многімі тымі, хто паступіў у Ліцэй у гады, калі я не стала туды паступаць, я пазнаёмілася, калі стала студэнткай. Гэта мае аднакурснікі, калегі ці проста знаёмыя — цудоўныя, адораныя раздзяўбаі, з якімі я маю шмат агульных інтарэсаў, міла баўлю час і плённа супрацоўнічаю, — але мне і да галавы не прыйшло б разглядаць гэтую памяркоўную багему як «герояў новага часу». У Глебе ж элітная нацыянальная адукацыя абярнулася іншым бокам медаля: ён бязмежна верыць у беларускую Беларусь і змагаецца за яе сваімі сродкамі. Альтэрнатыўнымі. Можна нават сказаць, магічнымі.

Менавіта на час яго вучобы прыпала закрыццё Коласаўскага і змаганне вучняў і настаўнікаў з дзяржадміністрацыяй. Не без падставаў сцвярджаюць, што верш ліцэйскага выкладчыка літаратуры Андрэя Хадановіча «Гары Потэр, ліцэіст» мае на ўвазе Глеба, аднаго з самых любімых вучняў аўтара. Але насуперак Хадановічавым метафарам, дбаючы пра сваю беларускую Беларусь Лабадзенка не выходзіць на штодзённую вайну з бутэлькай кактэйлю Молатава. Яго ўзбраенне — асадка, фотаапарат, блог і мабільнік.

## Забойства двух зайцаў

Ёсць тып маладых людзей, якія ў сталым веку жывуць з мамай. У жаночым асяроддзі ходзіць шмат злых і кплівых показак пра такіх таварышаў. Дык вось, Глеб у свае 24 гады не проста не жыве з бацькамі — ён стаіць на яшчэ вышэйшай прыступцы самастойнасці. Глеб жыве з бабуляй. Гэтак і ў грамадскай дзейнасці Глеб найбольш чула ставіцца да людзей сталага веку. Ён, натуральна, шмат пяру ўкладае ў сваіх сяброў-аднагодкаў, але гэтак жа, а мо' і больш аддана, ён прапагандуе тое, што стваралі і ствараюць значна старэйшыя за сённяшніх дваццацігадовых. Сацыяльная служба нацыянальнай культуры — вось як можна назваць гэту напаўдабрачыннасць.

Лабадзенка — цімуравец, а дакладней, сам Цімур, які малюе бел-чырвона-белыя значкі на плотах тых людзей, якім дзячыць за іх шматгадовую працу сваёй дапамогай. Пры гэтым яго амплуа — не маленькі стары. Яго роля — руплівы ўнук, на якога глядзяць, цокаючы языком і завочна сватаюць любімай роднай унучцы. Якая ў гэты момант чамусьці вельмі далёка…

У блогу *labadzenka.by* цяжка пратаўкнуцца ад банераў, якія рэкламуюць яго стыхійна-энтузіястычныя піяр-праекты. Праект «Радзівілы», які пачаўся пасля знаёмства з 92-гадовай князёўнай Альжбэтай Радзівіл і выліўся ажно ў два візіты сям'і беларускіх магнатаў на гістарычную радзіму, адзін з іх — на афіцыйным узроўні. Радзівілаўскі радавод Глеб ведае, як свой, прычым адлік усім Радзівілам вядзе ад «свайго цэнтру каардынат» — князёўны Альжбэты.

Праект «Беларускія паэты чытаюць вершы на блогу», дзе з дапамогай інтэрнэт-тэхналогій атрымліваюць голас Мікола Аўрамчык, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі. І, канешне ж, праект «Рыгор Барадулін». Шчыраваннямі Лабадзенкі выйшла ці выходзіць ужо некалькі кніг дзядзькі Рыгора, грошы за якія, што немалаважна, дасталіся аўтару — калі бярэш удзел у кампаніях вакол гэтых кніг, перажываеш незабыўныя ўражанні цуду грамадскай салідарнасці — «сама сабой» арганізоўваецца грамадская падпіска, ахвяраванні сцякаюцца з усёй Беларусі.

Ёсць у гэткай Глебавай самаахвярнасці нюанс. Цімураўцы робяць дабро старым людзям ананімна. Альтэрнатыўны жаўнер штовечар ходзіць да куратара і адзначае працадні. Бо кожнае намаганне павінна яму залічыцца. Усё лагічна: мадэль паводзінаў Глеба абсалютна несавецкая. Але, думаю, у імкненні «зрабіць імя на імяністых» няма ніякага разліку. Мае месца прыродны дар Глеба забіваць двух зайцаў. Звазіў пані Альжбету Радзівіл у Нясвіж паказаць ёй палац яе маладосці — напісаў пра гэта артыкул, які заняў першае месца ў конкурсе Беларускай асацыяцыі журналістаў. На газетных інтэрв'ю з пісьменнікамі, якіх перасталі чытаць нават у школе, ён бессаромна зарабляе. Але захапляе сам факт, што Лабадзенка-журналіст здатны распавесці пра старых такой мовай, што гэта цікава маладым. Мяркую, шмат хто памятае пераадавіцу самай жоўтай газеты РБ «Камсамолкі», дзе аднойчы замест расійскіх поп-зорак мы ўсе пабачылі дзядзьку Рыгора на кані.

## У імя Сцягу

На мой погляд, ранні старт у кар'еры адбыўся на дзейнасці майго героя ладным дамешкам інфантыльнасці ва ўсім, што ён робіць. Напрыклад, не магу не зазначыць, што Глеб Лабадзенка — чалавек, які паверыў у Паўла Латушку як надзею беларускай Беларусі. Але, магчыма, не варта ўспрымаць інфантыльнасць як яўны недахоп — яна можа быць палівам, якое круціць рухавік цывілізацыі. Яшчэ адной выдатнай ілюстрацыяй для партрэту Глеба Лабадзенкі я лічу показку, якую ён з уласцівай яму самаіроніяй расказаў пра сябе сам.

«Калі я прыязджаю на сваё лецішча пад Стоўбцамі, — расказваў Глеб, — я заўжды ўздымаю над участкам бел-чырвона-белы сцяг. Па-першае, мае сябры, чые лецішчы па суседстве, могуць бачыць, што я на месцы. Па-другое, я вывучаю: а як да нашага сцяга ставяцца самыя розныя людзі? Трэба скажаць, стаўленне хутчэй пазітыўнае — абураныя выкрыкі а-ля «Бэнээфаўцы праклятыя!» можна пачуць вельмі рэдка.

І вось аднойчы сяджу я каля дамка між ялінак ды бярозак з ноўтбукам, дапісваю тэрміновы артыкул. І тут каля майго плоту спыняецца дзядзька, прытуляе ровар да плоту і звяртаецца да мяне:

— Малады чалавек, падайдзіце сюда, пажалуйста!

Падыходжу, гатовы да суворай ідэалагічнай бойкі за сцяг, за мову, за «Пагоню»… А дзядзька і кажа:

— Я, малады чалавек, з вамі даўно хацеў пагаварыць, але як ні еду — вы ўсё спіце. І вот наканец я вас увідзел. Знаеце, мне очень нравіцца ваш флаг. Маладзец, што падымаеце, у душы я з вамі. Але такія дзялы, у нас увесь каапэрацыў абеспакоены, на ваш шчот. Малады чалавек, вы пасматрыце, што робіцца ў вас на ўчастку!!! Нейкае ламачча, рызэе паўсюль, паленніца раскіданая, быллём усё парасло… Сваім участкам, малады чалавек, вы пазорыце этат флаг!»

Упершыню ў жыцці, прызнаўся Глеб, ён не знайшоў, што сказаць чалавеку ў адказ. Рэшту дня ён прабавіў, парадкуючыся на сваіх шасці сотках.

Калі разглядаць «беларускую Беларусь» як занядбанае лецішча, якое засталося нам у спадчыну ад бацькоў, то Глеб — гэта такі праставашынскі дзядзя Фёдар, які дзелавіта прыбіраецца на ўчастку. Таму што зрабілі заўвагу старэйшыя сябры каапэратыву. Таму што наша краіна мусіць быць прыгожай. Таму што ганьбіць Сцяг ну ніяк не выпадае. Таму што альтэрнатыўная служба — не тая, якая ідзе, калі жаўнер спіць.

---

## ГАРЫ ПОТЭР, ЛІЦЭІСТ

Андрэй ХАДАНОВІЧ

**...Я нарваўся на шалёных троляў на польскай мяжы**
**ды ў Мінску крыху не паразумеўся ў бары**
**з вампірам — а так усенька было гладка...**
**Дж. К. Роўлінг. Гары Потэр і Ордэн Фэнікса**

Гары Потэр, выдатнік у Гуманітарным ліцэі,
пераможца на алімпіядах па бел-чырвона-
белай магіі, зноўку ў пошуках панацэі:
дух закону ці — па традыцыі — зуб дракона?

Бо ў газетах вусаты гоблін з кілішкам жытняй,
над мяжою ў паветры вісяць птушыныя коркі,
пошту з выраю рэквізуюць ужо на мытні
то шалёныя тролі, то оркі з Мар'інай горкі;

бо дарога даўгая й рэклама задарагая,
бо сышлі ў шоў-біз настаўнікі ды сяброўкі,
бо чырвона-зялёная магія перамагае
й цуда-зёлкі ідуць на экспарт у складзе зуброўкі;

бо чароўнаю палачкай стаўся дручок гумовы
й барада тэрарыста-джына прамокла да ніткі,
бо ў астатніх школах не вучаць птушынай мовы,
а палёты на памяле спыняюць зеніткі;

галасы аднадумцаў гучаць з кожным днём ахвярней,
і штодня складаней трымацца нейтралітэту,
жлукціць безалькагольнае піва ў таннай кавярні
ў атачэнні занудаў з варожага факультэту...

Закаркоўвае пляшку й выходзіць на ліпеньскі водар.
Сквер Марата Казея, а ў пляшцы —
кактэйль для цвярозых.
Ён, вядома, ізноў пераможа, бо ён Гары Потэр,
ратавальнік вялікіх дзяцей і маленькіх дарослых.

**З кнігі «Лісты з-пад коўдры» (Мінск, 2004 г.)**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 31 САКАВІКА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00.**
**23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты».
**10.00** Серыял «Агні вялікага горада».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Сакральнасць гомельскай плыні» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Добры дзень Вам!».
**14.05** Мастацка-публіцыстычны фільм «Мой любімы небеларускі акцёр» (БТ).
**14.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Альманах вандраванняў.
**15.55** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**16.45** Серыял «Агні вялікага горада».
**17.40** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.35** Дзённік «Мінск - Вена-2010».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйны серыял «Сваты».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Лігі чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Арсенал - Барселона. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Цыганкі». Шматсер. фільм.
**22.10** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Гарадскі паляўнічы». Японія-Ганконг, 1993 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Фільм «Людзі Шпака» (Расія).
**11.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.15** Спорт-кадр.
**12.45** Камедыйная меладрама «Дзякуй, дзеці ў парадку» (Францыя). 1-я серыя.
**13.35** «Беларускі акцэнт».
**14.00** Мультфільм.
**14.10** Пазакласная гадзіна.
**14.25** «Лабірынты: драўляныя храмы Прыкарпацця». Фільм першы.
**14.55** Медычныя таямніцы.
**15.20** Дэтэктыў «Зброя» (Расія).
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Фільм «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.10** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны раўнд. Жанчыны. Беларусь-Германія.
**23.35** Дэтэктыў «Зброя» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Жыл-быў вясёлы чалавек. Аркадзь Хайт». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «След саламандры». Расія, 2009 г. Заключныя серыі.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Суд». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Целаахоўнік». «Збіты лётчык». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Гістарычныя хронікі» Дак. фільм.

### НТВ

**06.00, 09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Сёння.
**06.10** Сёння раніцай.
**07.30** «Без рэцэпту».
**08.00** Проста цырк.
**08.30** Рускае начынне.
**09.25** Сярэдні клас.
**10.00** Дачны адказ.
**11.05** Серыял «Справа была ў Гаўрылаўцы».
**12.40** Серыял «Захопнікі». 6-я серыя.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**14.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.35** Выратавальнікі.
**16.10** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**17.05** Серыял «Крымінальнае відэа».
**18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.05** Серыял «Таямнічая выспа» (Канада).
**19.35** Гадзіна суду.
**20.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Захопнікі». 7-я серыя.
**21.15** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**22.15** Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне.
**22.40** Серыял «Карыда - гэта жыццё» (Іспанія).
**23.50** Серыял «Крымінальнае відэа».
**00.40** Камедыя «Трэмбіта».
**02.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**09.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**12.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. 1/4 фіналу.
**14.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**17.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. 1/4 фіналу.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Маямі). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**21.50** Абранае па серадах.
**21.55** Навіны коннага спорту.
**22.00** Гольф. Тур PGA. Турнір Transitions (Тампа-Бэй, ЗША).
**23.00** Гольф. Тур PGA. Турнір Арнольда Палмера (Арланда, ЗША).
**00.00** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Андалусіі (Алоха, Іспанія).
**00.30** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Чэмпіянат Марока (Махамедыя).
**00.40** Гольф-клуб.
**00.45** Яхт-клуб.
**00.50** Абранае па серадах.
**00.55** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Італіі (Турын). Паказальныя выступы.
**02.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** На колах.
**17.40** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.25** Аблічча таталітарызму: «Расія. XX стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 1 і 2.
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.35** Форум (ток-шоу): «Дзень Волі», ч. 2.
**20.15** Маю права (праваавая праграма).
**20.35** Без рэтушы: «Танцуючы з мядзведзем», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Сузор'е Паўднёвага Крыжа», камедыя, 2001 г., Аўстралія.
**22.55** Аб'ектыў.

## 1 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты».
**10.00** Серыял «Агні вялікага горада».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Дзённік «Мінск - Вена-2010».
**12.10** Камедыйная меладрама «Як знайсці ідэал» (Украіна).
**13.45** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласны персанаж.
**15.55** Серыял «Разлучніца» (Расія).
**16.50** Серыял «Агні вялікага горада».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрэсаў.
**19.55** Камедыйны серыял «Сваты».
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.10** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Цыганкі». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Выпрабаванне Акілы». ЗША, 2006 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.35** Экспедыцыя.
**12.00** Бітва экстрасэнсаў.
**13.05** Камедыйная меладрама «Дзякуй, дзеці ў парадку» (Францыя). 2-я серыя.
**13.55** «Беларускі акцэнт».
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Жывы гук.
**15.20** Вострасюжэтны дэтэктыў «Зброя» (Расія).
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Жаночая ліга.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. 1/4 фіналу. Бенфіка - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.25** Футбол. Ліга Еўропы. Агляд дня.
**01.15** Культасвет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Целаахоўнік». «Збіты лётчык». Расія, 2009 г.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Суд». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Целаахоўнік». «Збіты лётчык». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Вызваліцелі». «Танкісты». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.10** Сёння раніцай.
**07.30** Авіятары.
**08.00** Проста цырк.
**08.30** Залаты пыл.
**09.00** Сёння.
**09.25** Сярэдні клас.
**10.05** «Вочная стаўка».
**11.05** Серыял «Справа была ў Гаўрылаўцы».
**12.00** Сёння.
**12.40** Вострасюжэтны серыял «Захопнікі». 7-я серыя.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**14.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.00** Сёння.
**15.35** «Першая кроў».
**16.10** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Крымінальнае відэа».
**18.00** Сёння.
**18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.05** Прыгодніцкі серыял «Таямнічая выспа» (Канада).
**19.35** «Справы сямейныя».
**20.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Захопнікі». 8-я серыя.
**21.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**22.15** Сёння.
**22.40** Серыял «Карыда - гэта жыццё» (Іспанія).
**00.10** «Школа зласлоўя».
**00.55** Дэтэктыўны серыял «Крымінальнае відэа».
**01.45** «У пошуках Францыі».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**12.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Маямі). 1/4 фіналу.
**14.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**14.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**17.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Маямі). 1/4 фіналу.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Маямі). 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Маямі). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**21.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Collizion/La Nuit des Titans.
**00.45** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.35** «Шыралі – ноша клопату», маст. фільм, 1986 г., Аўстралія. 2 серыя.
**19.05** Сальда (эканамічная праграма).
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Прыгоды Ціўкі», мультсерыял.
**19.40** Дэмакратыя на штодзень: «Самакіраванне».
**19.55** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**20.15** Форум (ток-шоу): «Алергія на войска».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**22.05** Без рэтушы: «Танцуючы з мядзведзем», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**22.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №3 (41)
(сакавік)

www.litbel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«АСОБЫ»: перад'юбілейны артыкул «Высакосныя гады Віктара Казько» .... 2

«ПАЭЗІЯ»: вершы Галіны КАРЖАНЕЎСКАЙ .... 3

«ПРОЗА»: фрагмент новага рамана Юры СТАНКЕВІЧА «П'яўка» .... 4

«ВАРШТАТ»: узвышэнскія адкрыцці Марыі НОВІКАВАЙ і пераклады з Філіпа ЛАРКІНА .... 5

«ПРОЗА»: «вострае» апавяданне «Фотамайстар» Уладзіміра ДАМАШЭВІЧА .... 6–7

«БЫЛІЦА»: тэма месяца — аповед «Налепка, альбо Знакі Вонкавай вайны» .... 8


ДЗЕНЬ ВОЛІ

# АД БНР — ДА БЕЛАРУСІ

Генрых ДАЛІДОВІЧ

**У ноч з 6 на 7 студзеня 1918 года ленінскі ўрад разагнаў Устаноўчы Усебеларускі з'езд — «вчерашний день революции»: на гэты форум трапіла мала бальшавікоў, там загучаў зусім не бальшавіцкі тон, адпаведна ў выніку ўлада законна магла перайсці да кааліцыі, дзе бальшавікі былі б у меншасці, і былая Расійская імперыя пайшла б далей не ленінскім шляхам. Савецкі ўрад нанёс паражэнне не толькі народнаму волевыяўленню, але парламентарызму і дэмакратыі, ступіў на сцяжыну да сваёй дыктатуры.**




Беларускі рух, што да снежня 1917 года набыў досыць значны размах і мог на законным грунце аформіцца ў нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт краю, з-за мясніко́ўскага насілля апынуўся ў крызісе: той-сёй з відных дзеячаў марнеў за кратамі, іншыя мусілі пайсці ў глыбокае падполле.

Тыя беларускія дзеячы, хто ацалеў на волі, на тайных сходах пастанавілі: 1) Першы Усебеларускі з'езд разагнаны мяснікоўцамі незаконна; 2) Савет / Раду з'езда прызнаць выканаўчым органам з'езда, і яна, Рада, павінна ажыццяўляць усе пастановы з'езда; 3) папоўніць Раду і даць права адводу, адклікання і кааптацыі; 4) БАК і іншыя беларускія суполкі неадкладна спыняюць сваё існаванне і перадаюць усе свае справы, маёмасць Радзе; 5) Цэнтральная вайсковая рада існуе як падпарадкаваны орган Радзе з'езда; 6) 2-гі Усебеларускі з'езд склікаецца ў найбліжэйшы час і г.д.

Новае папаўненне (а ў ім былі вельмі вядомыя на той час у Менску людзі, скажам, былы галава гарадской думы) ва ўмовах, што склаліся, спакваля пачало прыбіраць беларускі рух у свае рукі, асабліва эсэры. Якраз яно перад наступленнем Доўбар-Мусніцкага і немцаў склала спіс Народнага сакратарыята Беларусі — па яго словах, «урада, які цяпер мусіць абараняць інтарэсы дэмакратыі».

Народны сакратарыят прыняў рэзалюцыю: «Родная старонка наша апынулася ў новым цяжкім стане. Дзе цяпер улада, што была тут, няведама, мы стаімо перад тым, што край можа быць заняты нямецкімі войскамі. Мы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі. Беларускі народ павінен здзейсніць сваё права на поўнае самавызначэнне, а нацыянальныя меншасці — на нацыянальна-персанальную аўтаномію. Правы нацыі павінны знайсці сваё здзяйсненне шляхам склікання на дэмакратычных асновах Устаноўчага Сойму».

Мінск чарговы раз стаў у цэнтры ўвагі не толькі расійскай, але і еўрапейскай грамадскасці: сюды накіраваліся немцы, сюды заспяшаўся Доўбар-Мусніцкі, каб першым увварвацца ў горад і падаць яго немцам як даўняе польскае «място», адпаведна адразу ж вылучыўшы і тут польскае пытанне. Доўбар-Мусніцкі меў перавагу і значную, але не рызыкнуў спажыць яе перад носам у немцаў, якія адносіліся да яго падазрона, мусіў лічыцца з Народным сакратарыятам, падзяліўшы з ім горад на сферы ўплыву.

Што загадаем рабіць у гэтых умовах Народнаму сакратарыяту? Апусціць нос, далей не дбаць пра свой люд, чакаць выніку нямецка-бальшавіцкіх варункаў? Бясспрэчна, той выбраў адзіна правільны шлях: дзейнічаць у падполлі.

Падпольныя сходкі Рады снежаньскага з'езда, Народнага сакратарыята праходзілі са спрэчкамі. Яны, спрэчкі, ішлі вакол цэнтральнага і самага хвалюючага ды балючага: што і як рабіць, на каго цяпер арыентавацца? Неўзабаве выпрацавалі і прынялі Другую Устаўную Грамату, дзе ўжо канкрэтызавалі свае арыенцыры:

«1. Беларусь у рубяжох рассялення і лічэбнай перавагі беларускага народу абвяшчаецца Народнай Рэспублікай.

...5. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчаецца свабода слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў, безумоўная свабода сумлення, незачэпнасць асобы і памяшкання.

...7. У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі права прыватнае ўласнасці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца без выкупу тым, што самі на ёй працуюць».

Зразумела, гэты дакумент не мог спадабацца ні Берліну (няма яму паклону), ні мяснікоўцам, якія зусім не жадалі страчваць уладу.

У Менск, паколькі цяпер быў вольны праезд, прыбыла невялікая дэлегацыя з Вільні, але ў ёй былі браты Луцкевічы — сярэдняга веку людзі (ім яшчэ не было і 40), але ветэраны палітычнага і грамадскага руху, ідэолагі беларускага адраджэння.

Ідэю незалежнасці ды яшчэ, як і ў Вільні, з просьбай падтрымкі Германіі многія менчукі — не толькі сярод эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, земцаў, але і ў Грамадзе, Народным сакратарыяце, Радзе БНР — успрынялі як бомбу. Што — мы без Расіі-карміліцы? Без яе цыцаў з нафтай? Без яе штыкоў? Калі не прападзём, дык нас жа глыне Германія ці яшчэ хто! Былі прапановы адкрыты 25 сакавіка з'езд лічыць толькі дыскусійнай нарадаю. Ды з'езд адбыўся, прыняў рэзалюцыі, абраў кіруючыя органы БНР: прэзідэнт, старшыня і народны сакратар замежных спраў, народны сакратар скарбу, народны сакратар асветы, народны сакратар кантролю, народны сакратар вайсковых спраў і маскоўскі консул.

А гэта — з Трэцяй Устаўной Граматы: «Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай».

Злашчасная тэлеграма кайзеру прывяла да крызісу БНР. Яе ўрады пачалі пераграсацца і мяняцца, але зноў жа справа была не толькі «бумажная»: беларуская мова была абвешчаная дзяржаўнай, пачаліся захады для адкрыцця нацыянальных навучальных устаноў, запрацавалі некалькі соцень беларускіх школ і гімназій, адчыніліся Мінская вышэйшая музыкальная школа і Мінскі педагагічны інстытут, рыхтаваліся адкрыць універсітэт, з'явіліся выдавецтвы і беларускія газеты, ажывіліся асяродкі культуры, а ўлетку ўжо мелі свае консульствы ў Літве і Украіне, накіравалі дыпламатаў у іншыя краіны, пачалі выдаваць пашпарты БНР і ўзаконілі нацыянальныя сімвалы: герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг (пазней БНР не прызнаюць ні Масква, ні Варшава, але гэта дэ-юрэ ці дэ-факта зробяць Літва, Латвія, Эстонія, Чахаславакія, Балгарыя, Фінляндыя, Турцыя ды іншыя дзяржавы, якія запрасілі да сябе беларускія дыпламатычныя і вайсковыя місіі, консульствы і прадстаўніцтвы).

Канечне ж, Беларускай Народнай Рэспубліцы тады, у кручаным 1918-м, за адзін год у самых што ні ёсць жудасных умовах было проста не пад сілу зрабіць шмат, ды ёй, бадай, удалося дабіцца самага галоўнага: паўстаць з попелу, сцвердзіцца і заявіць свету пра яшчэ адну дзяржаву — БЕЛАРУСЬ.

**Фрагменты нарыса «БНР—БССР: Роздум аб пакутным шляху беларускай дзяржаўнасці».**

▸ ПРОФІЛЬ

# ВЫСАКОСНЫЯ ГАДЫ ВІКТАРА КАЗЬКО

**Уладзімір КАВАЛЕНКА**

**Лёс абышоўся з ім жорстка на самым пачатку жыцця. Праз год пасля нараджэння пачалася вайна. Неўзабаве ў Калінкавічы, іншыя вёскі і мястэчкі прыйшлі акупанты, якія пачалі ўсталёўваць «новы» парадак. Сям'я Казько была вымушана прыстасоўвацца да трагічных ваенных абставін. Малалетні Віктар, ягоная сястрычка, маці хаваюцца ад ворага. Церпяць нястачу, уцякаюць у лес, на балота, туляцца ў незнаёмых людзей. Ад выбуху бомбы гіне маці, замярзае сястрычка. А Віктар цудам застаецца жывы. Каб пачаць доўгі шлях беспрытульнага падлетка пасля вайны. Бацька, які застаўся жывы, завёў новую сям'ю, дзе будучы пісьменнік належнай увагі і цяпла не адчуў. Таму гадаваўся ў Вільчанскім і Хойніцкім дзіцячых дамах. Дасягнуў паўналецця і быў вымушаны думаць і дзейнічаць, каб самастойна зарабіць на кавалак хлеба. Паехаў у Сібір, вучыўся ў Кемераўскім горным тэхнікуме, працаваў у шахце і ў геолагаразведцы.**



Фота Б.Сачанкі

«Сібірскі» перыяд ягонага жыцця вельмі важны для разумення станаўлення В.Казько як асобы, грамадзяніна і, натуральна, пісьменніка. Уласнаперажытае ў гэты час замацавана ў мастацкіх формах: аповесці «Цёмны лес — тайга густая» (1973), «Дзень добры і бывай» (1974)…

Камбінацыі з мастацкім часам і прастораю (хранікальнае цячэнне сюжэта і рэтраспекцыі), арганічнае выкарыстанне вуснапаэтычнай народнай творчасці і зварот да міфалогіі, выкарыстанне для больш поўнага раскрыцця характару героя «плыні свядомасці», элементаў прыпавесці, апора на рэгіянальныя асаблівасці той мясцовасці, аб якой вядзецца гаворка, дзе найбольш натуральна выяўляецца аўтарская канцэпцыя сучаснага аўтару чалавека і навакольнага свету, — усё гэта характэрна прозе В. Казько. Дзіма Прыгода з аповесці В. Казько «Высакосны год» (1972) паехаў шукаць рамантыкі. Адзін з шаснаццаці падлеткаў-беларусаў, ён адразу ж трапіў у самую гушчыню «бітвы за ўраджай» на цалінных і залежных землях. Падлетку-беларусу, які ведаў цану пасляваеннага хлеба, было балюча сачыць, як гіне сабранае зерне. Яно проста згаралася ў буртах, ператваралася ў вугаль. І гэта ў той час, калі ў пасляваенным Савецкім Саюзе катастрафічна бракавала ўраджаю. А яшчэ была настальгія. Успаміны аб дарагой яму Беларусі, дзе ён нарадзіўся і стаў падлеткам. І згадкі пра вайну, якую ён запомніў у два ці тры гады. Не ўсё, вядома, а фрагментарна. Самае яркае і трагічнае. У хату, дзе туляцца маці, сястрычка і ён, трапляе снарад. Маці гіне, хлопчык уцякае, пакідаючы сястрычку. Чамусьці спрабуе коўзацца на лёдзе. Гэта, відаць, было своеасаблівай дзіцячай рэакцыяй на смерць. Потым даведваецца, што сястрычка замерзла ў халоднай хаце, чапляючыся ў апошнія хвіліны за халодны труп маці. Сам пісьменнік пазней прызнаваўся, гэта неаднаразова падкрэслівала крытыка, што шматлікія рэтраспекцыі ў аповесці «Высакосны год» звязаны з комплексам віны за гэту трагедыю. Асновай раздзела твора пад назвай «Дарогі» з'яўляецца канфлікт свядомасці, псіхалогій. Малога і дарослага. Аўтар «выцягвае» ланцужкі зрокавай памяці. Яны ўзнікаюць па пэўнай асацыяцыі і складаюць аснову кампазіцыі раздзела і ўсёй аповесці.

Раздзелы «Дома» і «Абкатка Сібірру» напісаны, як здаецца, з пазіцыі і псіхалогі дарослага чалавека. Дзіма Прыгода вяртаецца з далёкіх краёў, каб сустрэцца з роднымі і блізкімі. І з дзяцінствам. Гэта і радасна, і горка. Нанава абуджае памяць. Не ўсё так проста выглядае тут, на Палессі, дзе жыццё паступова залечвае раны вайны, але яны яшчэ балюча смыляць. Бацька Дзімы застаўся жывы. Пасля вайны стварыў сям'ю, дзе было шмат дзяцей. У родным доме Прыгоду сустракаюць зводныя сёстры і браты, мачыха…

Наступныя раздзелы аповесці напісаны ў тым жа зрокава-асацыятыўным плане, дзе малюнкі пасляваеннага жыцця, убачаныя, перажытыя аўтарам у Сібіры, у час сустрэчы з радзімай чаргуюцца. Гэта служыць выяўленню мастацкай канцэпцыі. Простай, як нараджэнне і плач дзіцяці: «Мой дом у Беларусі. Там я галадаў, замярзаў, там я марыў пра багатую Сібір. Сібір — добрае месца, выдатнае месца, край мужных і моцных людзей. Але гэта не маё, маё не тут. Каб жыць у Сібіры, быць чалавекам, трэба роўна столькі мужнасці, каб быць ім у Беларусі. Я выбіраю Беларусь. Яна мяне выбірае.»

Завяршае аповесць раздзел «Сустрэча», пабудаваны на суіснаванні рэалістычных сцэн (наведванне галоўным героем магіл маці і сястрычкі) і містычных (гутарка са старою Васілісаю, з самім сабою, трызненне ў сне, з'яўленне на той свет, сустрэча з Богам і маці).

Так празаік падводзіць першую рысу ў вялікім ланцугу мінулага свайго героя. Але не ўсе праблемы, заклятыя пытанні жыцця да канца вырашаны. Над імі пакутуюць Андрэй Разорка з «Аповесці пра беспрытульнае каханне» (1975) і Колька Лецечка з аповесці «Суд у Слабадзе» (1978). Калі першы спрабуе, па словах П. Васючэнкі, «уцячы ад самога сябе, ад цяжкай памяці пра вайну, з надзеяй адшукаць свет, «які не ведае вайны»», то другі вяртаецца да спрадвечных вытокаў, да Радзімы на Палессі. Ствараецца ўражанне, што і Андрэй, і Колька хварэюць душэўна. А перадумовай усяго — іх фізічнае калецтва. Адсюль устойлівы матыў пакінутасці, непатрэбнасці і бессэнсоўнасці існавання. І толькі каханне здольнае вярнуць да жыцця і сэнсу ў ім. Крытыкі (Н.Ігрунова) справядліва падкрэсліваюць, што героі прыгаданых аповесцей В. Казько воляй аўтара павінны спачатку прайсці праз пекла жыцця, каб адчуць сябе шчаслівымі. Знаходжанне малалетняга Разоркі ў нямецкім канцлагеры, Лецечкі ў якасці донара нямецкіх салдатаў і афіцэраў у кіндэрхайме і ёсць тое пекла, якое назаўжды скалечыла іх.

Асноўны канфлікт аповесці «Суд у Слабадзе» знаходзіцца ў сферы пачуццяў, духоўнасці, падсвядомага. З адлюстраваннем складанасці ўнутранага свету падлетка, які перамагае ў сабе пачуццё помсты, набліжаецца да хрысціянскіх ідэалаў выкуплення віны, грахоў не ўласных, В. Казько спраўляецца выдатна. Гэта ставіць празаіка ў кантэкст аўтараў т. зв. «дзяцей вайны» (М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, В. Адамчык, Б. Сачанка, І. Пташнікаў), у творах якіх суадносіны паміж аўтабіяграфічным і мастацкім розныя. У В. Казько шырэйшыя матывы маральнага суда, адчування віны, складанасці навакольнага свету і адказнасці за сваю прысутнасць у ім. Таму творы яго акрамя простага сюжэту насычаны міфалагічнымі і біблейскімі асацыяцыямі, прароцтвамі і матывамі ўсясветнага суда і ачышчэння.

Біблейскі Эдэм, абсалютная гармонія прыроды і чалавека, ідэал некранутасці («нерушы») — Радзіма пісьменніка, прыпяцкае Палессе. Асабліва вылучаецца на гэтым фоне аповесць «Цвіце на Палессі груша» (1978), найбольш лірычная, як песня, зрокава-вобразная ў творчым «багажы» В.Казько: «Кожная мясціна на Беларусі адметная не толькі нечым сваім непаўторным, зямлю скрозь прайдзі — нідзе не сустрэнеш, але і сваёй гаворкай. Асабліва ж вылучаюцца ёй палешукі, а сярод палешукоў — вось гэтыя людзі, што пры рацэ, што жывуць у адной з Яўменам вёсцы сярод лясоў. У гэтых лясоў і ў той жа ракі бралі яны свае слова... І адначасова са словам перад табой паўстае і рэч, пра якую ідзе гаворка, паўстае і сам чалавек. Коціцца, коціцца над зямлёй яго пявучае слова, як тая рэчка, ціха, але няспынна коціць свае воды сярод белых пяскоў, рудых і зялёных балацін, ніцых лазнякоў, як шумяць іх гаманкія бары, гаі і дубровы: «Палеээ-сся-аа»». Сапраўдны гімн Палессю і яго жыхарам!

Галоўны герой аповесці Яўмен Ярыга ад нараджэння нямы. Ён надзелены першароднасцю светаўспрымання, наіўнасцю. Абмежаваны фізічна, ён, тым не менш, валодае вялікім багаццем адкрывальніка цеснай сувязі чалавека і прыроды. Нельга не ўбачыць тут блізкасць мастацкіх канцэпцый В. Казько і Ч. Айтматава, В. Астаф'ева, В. Распуціна, І. Друцэ, В. Карамазава. Сказалася, відаць, цеснае яго знаёмства з рускай прозай, вучоба ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага. Цесныя кантакты, дружба з вядомымі мастакамі слова прымусілі пановаму паглядзець і на хараство роднага яму Палесся. Бліжэй за ўсё В. Казько В. Астаф'еў і В. Распуцін. У нацыянальнай жа прозе ён як бы паралельнымі сцежкамі ідзе з В. Карамазавым (раман «Пушча»).

Сваю этычную і эстэтычную пазіцыю В. Казько перадае з дапамогай «плыні свядомасці» Мацея Роўды, Махахея, Ненене, Барздыкі, састарэлага дзеда Дзям'яна, часам маладзейшых персанажаў — Ваські Брытана, Надзькі. Рэфлексіі пазбаўлены прыхільнік сілы і рэвалюцыйных узаемаадносін з навакольнай прыродай — адзін з кіраўнікоў суцэльнай меліярацыі палескіх зямель — Шахрай. Апошні выконваў і гатовы быў любой цаной «перамагчы» яе. Вынішчаць унікальную фаўну і флору, абязводжваць глебы, паварочваць нават вялікія рэкі Сібіры ў адваротным напрамку. Ён, як і Башлыкоў з «Палескай хронікі» І. Мележа, любой цаной выконваў загады партыі камуністаў, не лічыўся з лёсамі простых людзей, аховай навакольнага асяроддзя. Дзеля «вялікага» будучага ўраджаю на пераўтвораных былых балотах губляе крэўнае яднанне з зямлёй. Для Палесся такая падзея азначала па сваёй трагічнасці бальшавіцкі пераварот, грамадзянскую вайну, калектывізацыю, або Вялікую Айчынную. Не ў дробязны маральна-бытавы, эканамічны канфлікт уступае з ім Мацей Роўда, для якога страта балотнай багны ў ваколіцы Княжбора раўнацэнная разбурэнню сусвету, чалавечых асноў быцця.

Канцэптуальна В. Казько на баку тых, хто разумее, што раз'яднанне з зямелькай пацягне за сабою вялікія маральныя праблемы. З дапамогай метафорыкі, ужывання сімвалічных, фальклорна-легендарных вобразаў і сцэн ды іх пэўнага перабольшвання часам В. Казько малюе меліяраваную зямлю як «зону знішчэння», вельмі падобную будучую «зону адчужэння» на Палессі пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі…

Своеасаблівым развітаннем з улюбёнымі тэмамі стаў для В. Казько раман «Хроніка дзетдомаўскага сада» (1986). Гэта лагічны працяг папярэдняй творчасці празаіка, дзе ён працягвае эксперыментаваць у галіне зместу і формы: адухаўленне і антрапамарфізм, шматлікія рэтраспекцыі, «сумяшчэнні» часава-прасторавых катэгорый, кінематаграфічная і асацыятыўная будова сюжэту. Твор шмат у чым нагадвае пошукі В. Распуціна («Развітанне з Мацёрай»), Я. Брыля («Птушкі і гнёзды»), А. Жука («Паляванне на Апошняга жураўля»), Ч. Айтматава («Плаха») і іншых. Гісторыя зубра Сноўдалы, лёс страчанага і адноўленага Саду, мастацкая гісторыя Мар'яна Знаўца і Сідара Місцюка, сцэны канца свету (высыханне стогадовых дубоў, знікненне баброў, нашэсце пацукоў і мышэй, пажар) прызваны драматызаваць і паглыбляць асноўны канфлікт рамана, заклікаць да міласэрных адносін з прыродай і чалавекам у ёй. Натуральна, што на такі характар вырашэння жыццёвых калізій, на ўсю паэтыку рамана не магла не ўплываць трагедыя, якая адбылася на Палессі адначасова з выхадам твора ў свет: Чарнобыль.

Згаданая традыцыя нацыянальнай прозы, распачатая К. Чорным, М. Гарэцкім, працягнутая Я. Брылём, А. Адамовічам, даволі ўстойлівая і перспектыўная. Значнае месца тут належыць, безумоўна, В. Казько, В. Карамазаву («Краем белага шляху»), А. Дудараву («Злом»). У гэтым сэнсе цікавыя па-свойму аповесці «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел», «Прахожы» і раман «Бунт незапатрабаванага праху», напісаныя В. Казьком у канцы XX-га і пачатку XXI-га стагоддзяў. Гэта новы крок празаіка ў асэнсаванні хуткаплыннага жыцця нашага сучасніка. Ствараецца новая і па сутнасці старая разнавіднасць інтэлектуальнага, філасофскага, псіхалагічнага рамана, які патрабуе ўдумлівага чытання, роздуму аб сэнсе існавання, месцы чалавека ў акаляючай прыродзе, сусвеце.

У год юбілею пісьменніка (23 красавіка Віктару Апанасавічу споўніцца 70 гадоў), на піку яго творчага жыцця трэба пажадаць яму здароўя, новых здзяйсненняў ды ажыццяўлення мараў і фантазій.

**Скарочаны варыянт артыкула дацэнта кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны У. П. Каваленкі «…І нерушы шукай».**

ВЕРШЫ

# ХАЙ НАС БУДУЧЫНЬ СТРОГА НЕ СУДЗІЦЬ…

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

***

*Між вод акіянскіх,*
*на лапіках сушы*
*Прыходзяць пажыць*
*усё новыя душы.*

*Да розных народаў,*
*у кліматах розных,*
*Хто болей, хто меней,*
*хто рана, хто позна.*

*Хто ў сем'ях заможных,*
*а хто сіратою*
*Свой век адбывае*
*на пару з бядою.*

*І кожны аднойчы —*
*глухі, безгалосы —*
*Апошні свой выдых*
*пашле да нябёсаў.*

*І толькі анёл*
*разбярэ на мяжы*
*Дакор, што пакутваў,*
*падзяку, што жыў.*

***

*Сярпок вісеў над нашым домам*
*(Хоць ты яго на мінарэт!),*
*І праз яго здаваўся свет*
*Якімсьці новым,*
*незнаёмым.*

*І зорка ветліва мігцела,*
*І нават вулічны ліхтар*
*Не адвярнуў свой бледны твар…*
*Я ўсё стаяла і глядзела.*

*А без кашулі белай люты*
*Кранаўся рук і шчок маіх.*
*Ды хоць салодкім здаўся міг,*
*А дзень быў горкім, як атрута.*

***

*Анёлак на плячы сядзеў,*
*І бачыў: шлях мой невясёлы,*
*Але спыніць не захацеў*
*Ці, можа быць,*
*не меў дазволу.*

*Ішла. Належала ісці*
*Да прорвы самай — прымусова,*
*Каб невымерна мог расці*
*Настаўнік —*
*вопыт мой жыццёвы.*

*Няхай бы рос, я не супроць.*
*Ды каб страхоўкі трошкі хоць!*

***

*Гаротны, хто праўду шукае,*
*Бо праўда высока лятае.*
*Ці рыбінай плавае ў моры,*
*Ці ў сейфе стальным*
*на запоры.*

*У склепе, дзе плесня і мухі,*
*На вышках,*
*дзе прадзедаў духі.*
*Альбо пад матрасам схавана*
*Ці горш — у зямлю закапана.*

*Ні следу няма і ні знаку,*
*Не знойдуць прыбор і сабака…*
*Ды дзе б ні была яна, праўда, —*
*Свайму затачэнню не рада.*



***

*Я да ўсіх вас прыйду і скажу:*
*— Дык аддайце, што вы пазычалі.*
*Адбіралі. Выманьвалі. Кралі.*
*(Мімаходам плявалі ў душу.)*

*Не жадалі, гаворыце, зла?*
*Зло вы самі, яго ўвасабленне.*
*Не паставіць мяне на калені,*
*Хоць і доўга малою была.*

*Мой дзіцёнак унутраны спіць.*
*Ён цяпер за шчытом, у бяспецы,*
*Так надзейна схаваны у сэрцы,*
*Што ніякай страле не прабіць.*

***

***«Наша жыццё — сон Бога.»***

*Богу сніцца кашмар трэці дзень,*
*Ён хацеў бы прачнуцца*
*І ад гэтага сну страсянуцца:*
*«Прападзі, прападзі, страшны цень!»*

*Бог хацеў бы прыемнае сніць —*
*Ну там райскія долы…*
*Бог хацеў бы людзей бараніць*
*З дапамогай анёлаў.*

*З-за мяне непакоіцца ён.*
*Прападзі, прападзі, кепскі сон!*

***

*Два недалюбленых дзіцяці*
*Раслі, каб некалі сустрэцца.*
*І кожны лішнім быў у хаце,*
*І кожны марыў, каб сагрэцца.*

*Калі ж жыццёвыя дарогі*
*Ў адну спраміліся аднойчы,*
*Нагараваліся, нябогі,*
*І разбягаліся ўжо двойчы.*

*Што значыць*
*шлях наш невясёлы?*
*Якія тайны нас злучылі?*
*Мы — два наведвальнікі школы,*
*Дзе болей розгамі вучылі.*

***

*Хай кожнаму будзе адплата —*
*Хто добры і хто ліхадзей.*
*Самая чорная здрада —*
*Што ад любімых людзей.*

*Самая горшая рана —*
*Што на душы, на душы…*
*Калі абалонка сарвана —*
*Лекуйся: вершы пішы.*

## Антыутопія

*Каб лета з зімой не зраўнялася!*
*І прыйдуць тады назаўжды*
*Не то нясканчоная восень,*
*Не то безупынку прадвесне.*

*У вулеях пчолкі змарнеюць,*
*Адмовіцца жыта расці.*
*А дрэвы,*
*ў разладзе з прыродай,*
*Зусім распрануцца і вымруць.*

*Сярод дыктатуры туману,*
*Дзе шэрае пошасці шал,*
*Мы самі сябе адрачэмся*
*І станем,*
*як парасткі ў склепе.*

*Хімічную ежу засвоім,*
*Хімічныя ўсцягнем тканіны*
*І будзем тлумачыць унукам,*
*Што сонца далёка, ды ёсць.*

## Да пана Ёдкі

*Санаторскі народ*
*павялі да Наркевіча-Ёдкі.*
*Два сабачкі ўвязаліся следам,*
*два смелых жукі.*
*Шлях быў новым,*
*падаўся зусім не кароткім —*
*Праз Усу і да іншай*
*скаванае лёдам ракі.*

*Нёман там з Неманцом,*
*там былога руіны і рэшткі.*
*Славу Ёдкі калісьці*
*Еўропа прызнала сама.*
*І бабулі, адстаўшы,*
*па снезе спяшаліся бежкі,*
*І няўцямнаю, спячаю памяць была,*
*як зіма.*

***

*Так нязвыкла за вокнамі вее…*
*Ад мяцеліц адвыклі мы ўсе.*
*Торым сцежкі свае пакрысе,*
*Прывітаўшы пару Вадалея.*

*Хай нас будучынь строга не судзіць:*
*Недасеў, недабор, неўмалот…*
*Новы час,новых думак палёт.*
*Падштурхоўваюць тых, хто марудзіць.*

***

*Вясною бывае пара халадоў.*
*Сцінаюцца кветкі ад лютага ветру,*
*Нібыта хацелі б схавацца у нетры.*
*Бывае, бывае пара халадоў.*

*Галоўнае — вытрымаць, ператрываць.*
*На жаль і на шчасце, жыццё паласатае.*
*Становішча зорак, сезоны і даты,*
*Адносіны, лёсу кірунак, зарплата —*
*Мяняецца ўсё!*
*Застаецца чакаць.*

## Роздум пра муху

*Перайманне А.Вярцінскага*

*Муха сядзіць на варэнні.*
*Гэтага мала, што села.*
*Можа быць,*
*села і не паела.*
*Можа быць, з'ела меней,*
*Чымся хацеў яе апетыт.*

*Далей перайду на петыт.*
*Ці моцным было памкненне*
*Удосталь паесці варэння?*
*А мо спрацавала інерцыя?*
*Альбо мела месца камерцыя?*

*Мо папрасіла сяброўка,*
*Адмовіць было нялоўка.*
*А раптам галодныя дзеці*
*Плачуць,*
*дык як тут есці?*

*Дапусцім таксама*
*(што верагодна):*
*Салодкае есці ёй шкодна,*
*Не тут кажучы — дыябет…*
*А што як у мухі*
*не скора абед,*
*Ды перакусваць не раіць дыета?*

*Дзеці!*
*Падумаць вам раю пра гэта.*
*Колькі у нас на шляху перашкод,*
*Колькі абставінаў розных,*
*прыгод!*
*Горай бацькоўскай папружкі*
*Чужая бліскучая стужка.*

*Так што прыпавесць пра варэнне*
*Вялікае мае значэнне.*

***

*Эпоха лёдавых палацаў*
*Калісьці пройдзе, спадзяюся.*
*Ўздыхнецца лёгка*
*Беларусі*
*І перастануць мо баяцца*
*Маўклівыя,*
*што вечна з краю.*
*Рабы з партфелямі, бывайце!*
*Вас нават Бог не пакарае,*
*Бо вы як смецце*
*ў нашай хаце.*

## Вопыт

*Жыццё паспрабуй раскладзі*
*на мінуты…*
*Ёсць вопыт любові*
*і вопыт пакуты.*

*У кожнага свой абавязак і клопат.*
*Ёсць вопыт багацця*
*і беднасці вопыт.*

*Шмат іншых бывае: калецтва, няволі,*
*Раптоўнае смерці…*
*(Даволі, даволі!)*

*Ды толькі не кажам*
*удзячныя словы*
*За вопыт набыты наш,*
*цяжкі і новы.*

***

*Абставіны аслабілі ціскі.*
*Надоўга? Невядома.*
*Лёс такі.*
*Ён лёгкім не бывае, як вада*
*Не можа быць сухою.*
*Злыбяда*
*Суправаджае ўсіх нас на зямлі.*
*Мы б з ёй пасябравалі,*
*каб маглі,*
*Мы б даравалі Богу і людзям,*
*Каб трошачкі лягчэй*
*жылося нам.*

*А зрэшты —*
*што ім наша дараванне?*
*Прабачаць і яны,*
*як нас не стане.*

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# П'ЯЎКА

## З НОВАГА РАМАНА

Юры СТАНКЕВІЧ



Квартал, дзе я цяпер спыніўся, змешаны. У сэнсе яго насельнікаў. У адрозненне ад больш забяспечаных, тут няма камунальнай сістэмы абароны з высокімі мурамі, абсталяваных фотаэлементамі (у такіх кварталах-камунах жывуць людзі, якія аб'ядноўваюцца па рэлігійнай, крымінальнай, расавай ці якой іншай карпаратыўнай супольнасці, а таксама геі, транссексуалы і лесбіянкі). Ён больш небяспечны і часта бывае полем, на якім са зброяй высвятляюць свае адносіны, змагаючыся за сферы ўплыву, а, значыць, за ваду, ежу і правы на секс шматлікія маргіналы. Увогуле, нашая квазікраіна, не абароненая ў свой час пазбаўленымі свядомасці продкамі, нагадвае своеасаблівы еўрапейскі этнічны гноеадстойнік. І хоць у суседніх не намнога лепш, тут, у нас, здолела выпладзіцца тое, што выклікае ўвогуле пераацэнку вартасці самога жыцця…

Я ведаў, што як толькі зачыню за сабой дзверы, то адразу апынуся ў сістэме кантролю. Гэта татальная сістэма была запушчана ў мегаполісах гадоў дзесяць таму і з пераменным поспехам выкарыстоўваецца і цяпер, бо шматлікія напаўкрымінальныя і крымінальныя суполкі, якія ў апошні час набылі амаль легальны статус і лёгка фармавалі ўрадавыя колы, адпаведна напрацавалі свае меры абароны. За жыццёвым рухам, што бясконца віруе ў Мегаполісе, назіраюць спадарожнікі (хоць большасць з іх ужо згарэла), тысячы відэакамер суправаджэння, ахоўных відэакамер дробных прадпрыемстваў, фірм, супермаркетаў, банкаў, забаўляльных і сексаабслуговых установаў ды проста ўсялякіх прытонаў. Я ведаў, што камеры назірання аснашчаны оптыкай, якая дае моцнае павелічэнне. Камеры гэтага ці аналагічнага тыпу дазваляюць бачыць і скрозь фіранкі. Я таксама ведаў, што сярод безлічы звычайных спадарожнікавых антэн ёсць замаскіраваныя пад іх камеры слыхавога назірання. Даўно распаўсюджанай з'явай стала і выкарыстанне сотавых «надалоннікаў» як праслухоўваючых — увод адмысловага кода робіць сотавы тэлефон менавіта такой прыладай.

На амаль кожнага з нас, як я ведаю, пры нараджэнні раней заводзілася спецыяльнае дасье, куды заносіліся не толькі адбіткі пальцаў, а і асобныя выказванні і ўчынкі. Нашыя ўлады заклапочаныя цяпер галоўным чынам сваёй бяспекай, на што і выдаткоўваюцца асноўныя сродкі, а ўсё астатняе, у прыватнасці, бяспека саміх грамадзян — у іх асабістых руках. Я рэдка выходжу з дому без нажа ці рэвальвера, хаця валоданне зброяй без дазволу забаронена і жорстка караецца спецслужбамі…

Я збольшага павячэраў штучным бутэрбродам, падобным на мыла, а потым дацягнуўся да пульта і ўключыў уманціраваны ў сцяну тэлевізар — яго старадаўнюю мадэль. З экрана зазыўна заўсміхаліся напаўаголеныя юрлівыя прыгажуні, трансвестыты і педэрасты, напамажаныя каментатары бралі інтэрв'ю ў заўсёды задаволеных жыццём людзей, часам прапаноўваліся карцінкі нейкіх тэхналагічных распрацовак, падлічваліся сумы прыбыткаў.

Потым экран надоўга захапіў футуролаг — штучна маладжавы чалавек сярэдняга веку, з паголеным чэрапам і густой чорнай барадой.

«Пераадолець смерць, — вяшчаў ён, — гэта адыёзная, нечуваная задача, якую раней чалавек не мог перад сабой паставіць, але гэта задача бачыцца вырашальнай сёння. Ёсць праблемная тэорыя і не спыняецца практыка, ёй заняты тысячы навукоўцаў. Цяпер замест марных дыскусій мы прапануем дакладную тэхналогію бессмяротнасці свядомасці. Гэта тэхналогія адразу зменіць усё наша жыццё. Знікнуць нацыянальнасць і яе атрыбут — мова»...

…«Галоўнае для нас — перанос фокуса «Я» свядомасці на камп'ютэрнае асяроддзе, — прадракаў далей футуролаг. — Як жа такое вырашаецца? А вось як: сама ўласцівасць памяці заключаецца ў тым, што яна пастаянна абнаўляецца, і прыкладна дзевяноста адсоткаў вобразаў перыядычна актыўна выкарыстоўваюцца праз асацыятыўныя сувязі паміж імі, зноўку нібы перазапісваючыся. Калі дапаўняльныя блокі памяці стануць таксама ўдзельнічаць у гэтым працэсе, то за кароткі тэрмін гэтыя блокі будуць утрымліваць каля дзевяноста адсоткаў вобразаў з памяці свядомасці. А калі чалавек будзе жыць з гэтымі блокамі памяці пяць ці дзесяць гадоў, то яны будуць утрымліваць практычна сто адсоткаў вобразаў, якія назапасілі за мінулы перыяд жыцця. Пытанне пераносу фокуса «Я» свядомасці вырашаецца такім чынам «само сабой», бо смерць цела і мозгу не наносіць страты свядомасці, памяць якой і фокус «Я» па-ранейшаму паўнавартасна функцыянуюць у дапаўняльных блоках памяці. Але вось душа? Як быць з ёй? — пытаюцца многія. Адразу скажу вам адказна: яна не матэрыяльная рэч, а значыць, яе няма… Замест яе мы маем фокус «Я» нашай свядомасці».

Адначасова з гэтымі слоўнымі ванітамі, якія вяла ўспрымаў мой слых, вочы міжволі машынальна выхоплівалі змест амаль незаўважнага бягучага радка ў ніжняй частцы дысплея: «Кніга — самая шкодная рэч для грамадства. Яна слепіць вочы, атрафіруе слых, псуе мову, служыць распаўсюджваннем зжыўшых сябе ідэй і варожых намераў, абгрунтоўваючы пошук так званай Ісціны. Але што ёсць Ісціна? Ісціна — гэта мана. Здавайце кнігі службам бяспекі, знішчайце іх»;

«Віленій Магабва, жыхар 52-га квартала Мегаполісу разрэзаў з дапамогай электрычнай пілы свайго былога сужыцеля, а цела па частках вывез на звалку. Злачынца арыштаваны…»

«Да гэтага часу, — прадракаў, між тым, далей футуролаг, — галоўнай якасцю нацыянальнай прыналежнасці з'яўлялася мова. Менавіта яна дзяліла чалавецтва на народы. Але навошта нам цяпер асобная мова? Мы прапануем вам трансмог агульнай іншаземнай мовы. Падключаючы такі трансмог да сваёй свядомасці, вы імгненна пачнеце гаварыць на іншаземнай мове, як на роднай. Хто як хоча, той так і будзе гаварыць. Гэта адрыне ўсе нацыянальныя адрозненні паміж людзьмі. Моўныя трансмогі — бомба, якая ўзарве наш свет. У самы кароткі час адбудзецца нечуваная інтэграцыя чалавецтва ў адзіную супольнасць. Любы чалавек, выкарыстоўваючы трансмог любой мовы народаў свету, здолее стаць на нейкі час «свядомасцю іншай нацыянальнасці», прыняўшы гэтую новую мову ў якасці другой роднай. Знікне ўсялякая ксенафобія. Далой ксенафобскую прапаганду!»

«Толькі што адбыўся замах на былога сакратара ідэалагічнага аддзела Партыі Бессмяротнасці Ёхана Цынка, які вяртаўся дамоў у квартал 240. Яго машына была абстраляна з аўтаматычнай зброі злачынцам, які знаходзіўся ў прыпаркаваным непадалёку пазадарожніку. Атакаваны чальцамі службы бяспекі нападаўшы быў забіты. Забіты два ахоўнікі. Ёхан Цынк не пацярпеў».

«Так, — працягваў з экрана барадаты гаварун, — тысячы фанатыкаў-нацыяналістаў захочуць пасля смерці сваёй біямасы заставацца ў межах сваёй краіны і сваёй мовы, працягваючы служыць нацыяналісцкай ідэі. Але, як мы ведаем, іх мала…»

Разбудзіў мяне сігнал надалонніка. За вакном ужо рассвітала, тэмпература паветра крыху зменшылася, але было амаль таксама задушліва, як і ўчора вечарам.

Таймер паказваў чвэрць на сёмую гадзіну. Я са здзіўленнем пабачыў, як на дысплеі высвеціўся твар маёй учарашняй наведвальніцы — жанчыны па імені Мойра. Ужо выходзячы на сувязь, я машынальна адзначыў, што з яе боку было ўключана супрацьпраслухоўваючае прыстасаванне.

— Слухаю, — чамусьці з хваляваннем сказаў я.

— У мяне намер зайсці да вас неадкладна. Вы адзін, спадар Берташ?

— Так.

— Тады, калі вы не супраць, адчыніце дзверы. Я побач.

— Згода.

Я яшчэ раз зірнуў на гадзіннік, каб упэўніцца ў тым, што не памыліўся і цяпер сапраўды яшчэ вельмі рана. Гэтая жанчына прыйдзе. Чаму яна спяшаецца? Яна адна, ці па-ранейшаму з тым маўклівым Платонам? — замільгалі ў маёй галаве недарэчныя і малавытлумачальныя пытанні. Урэшце, я адчыніў і стаў чакаць.

Праз некалькі хвілін госця з'явілася на парозе. Я ўбачыў, што замест сукенкі на ёй быў ільняны камбінезон са шлейкамі, а валасы на галаве падабраны пад спартыўную бейсболку; толькі ўся вопратка чамусьці выглядала бруднай і ў некалькіх месцах была пашкоджанай. Праз аголенае перадплечча чырвонай пісягай цягнулася свежая драпіна. Жанчына выглядала не зусім адэкватнай, і я зразумеў, што нешта здарылася. Урэшце, я не памыліўся.

— Ваш спадарожнік, — спытаў я, — ён таксама прыйдзе?

— Платон не прыйдзе, — праз паўзу адказала яна, і твар яе сутаргава перасмыкнуўся.

Я знерухомеў.

— Што здарылася?

— У мяне праблема, спадар Берташ, — выдыхнула яна, — мне патрэбна дапамога.

Я моўчкі ўзяў яе за руку, правёў у пакойчык і пасадзіў на канапу. Але яна падхапілася з месца, скінула з галавы бейсболку і пачала нервова хадзіць: сем крокаў у адзін бок, паварочвалася і рабіла столькі ж назад.

— Здыміце чаравікі, — прапанаваў я будзённае, чакаючы тлумачэння.

Яна паслухалася, але хадзіць не перастала.

— У душавой ёсць вада? — нечакана спытала яна, спыніўшыся.

— Наўрад ці.

Тым не менш, я зазірнуў у душавую і павярнуў кран. Вада палілася, і я ўспомніў, што пры засяленні заплаціў за кубаметр даволі адчувальную суму. Як заўсёды, ваду тут уключалі хіба што ноччу.

— Зараз, — сказала яна распранаючыся, — я ўсё растлумачу. Толькі пастаю хвіліну пад душам. Вы не супраць? Я вельмі шкадую, што прымушаю вас непакоіцца. Прабачце.

Яна знікла за дзвярыма, і я пачуў, як палілася вада, пасля чаго знайшоў свежы ручнік і, прычыніўшы дзверы, павесіў яго на вяшак. Мельгам убачыў жанчыну, якая ўжо стаяла пад струменем вады, і ацаніў яе целасклад: стройныя даўгія ногі, акруглыя клубы, шырокія плечы — пэўна, такімі і выглядалі старажытныя амазонкі.

— У вас знойдзецца які халат? — спытала яна праз хвіліну. Шум вады знік.

Я адказаў, што не нашу халатаў і прапанаваў ёй накінуць маю кашулю, на што яна моўчкі згадзілася.

— Мяне ўжо, магчыма, шукаюць, — неяк вяла канстатавала жанчына па імені Мойра. — Я мушу неўзабаве ісці.

Я хутка кеміў і ведаў за сабой гэтую немалаважную якасць. Ланцужок нейронаў у маёй галаве, пэўна, перасталяваўся належным чынам, бо праз некалькі секунд я ўзнавіў у памяці бягучы радок з экрана тэлевізара, і ўспомніў фрагмент тэксту. Няўжо гэта так?

— Замах на былога сакратара ідэалагічнага аддзела партыі Бессмяротнасці… Забітыя двое ахоўнікаў і нападаўшы. Ёхан Цынк застаўся жывы.

— Дык гэта вы зрабілі замах на Ёхана Цынка? — вырвалася ў мяне.

Жанчына знерухомела.

— А вы лічыце, што той варты жыцця? — адказала яна пытаннем на пытанне.

— Мне напляваць, — шчыра сказаў я, — але ці трэба падстаўляцца пад кулі з-за нейкіх дзяржаўных клапоў? Дарэчы, чыя гэта была ідэя і навошта было ісці на яе выкананне, не падрыхтаваўшыся як след?

— Вось вы б схадзілі?

— А што гэта дасць? «Людзей-ценяў» большасць.

Але тут я замаўчаў, бо спрэчка ў такі момант была бессэнсоўная, а зрабіў нешта такое, на што б адразу не рашыўся ў іншай сітуацыі. Я сеў з ёй побач і абняў яе за плечы, са шкадобай заўважыўшы, што яе цела ўсё яшчэ нервова ўздрыгвалася пад маімі далонямі.

— У цябе знойдзецца што-небудзь з транквілікаў? — спытала яна, гледзячы ў падлогу і перайшоўшы на «ты».

— Не. Я іх не ўжываю.

З дапамогай маіх пытанняў яна паступова паведаміла ўсё, што адбылося з імі за апошнія суткі. Платон, як я павінен быў здагадвацца, з'яўляўся чальцом невядомай мне забароненай радыкальнай суполкі. Як дарэчы, і яна, Мойра. Як я збольшага ведаў, у краіне дзейнічаюць ці, наадварот, чакаюць у кансервацыі свайго часу, неардынарныя, сур'ёзныя людзі, не аперэтачныя змагары на словах, а халоднакроўныя выканаўцы, якіх улады, выявіўшы, адразу скіроўваюць у фільтрацыйна-папраўчыя лагеры, дзе і знішчаюць.

— Платон не пасвяціў мяне ў свае планы пасля сумеснага наведвання вас, спадар Берташ, але вы яго нечым цікавілі, і ён прыходзіў адмыслова, а мне параіў чакаць яго ў адным з трэццеразрадных гатэляў, патлумачыўшы, што, калі не вернецца праз некалькі гадзін, то варта ехаць у Новы Эдэм самастойна, ну, і калі наш новы знаёмы Берташ Яновіч (гэта значыць вы) дасць згоду, то дабірацца туды разам, а яго не чакаць...

Праз нейкі час яна даведалася з тэлехронікі пра замах і адразу пазнала ў нападаўцу Платона. Нагадвалі і яе прыкметы. Уцячы яму не ўдалося, і ён, ужо забіты, згарэў у машыне. Магчыма, ён зберог яе жыццё.

— Цяпер, — закончыла жанчына свой аповед, — я, вядома, не хачу падстаўляць цябе, — і праз гадзіну пайду...

— Дык і ты высланая? — спытаў я.

— Так. Амаль усе, хто працаваў з тваім бацькам, былі праз нейкі час пакараныя. Мяне саслалі ў Эдэм.

— Пабудзеш у мяне, пакуль усё супакоіцца, — сказаў я, — а потым мы, верагодна, рушым у паселішча. Я прымаю вашу прапанову.

— Дзякуй. Я не памылілася ў табе. Думаю вось, чым бы табе аддзячыць...

— Не клапаціся.

— Ты натурал? — нечакана пацікавілася яна, па-ранейшаму седзячы на канапе і не падымаючы галавы.

— Хіба гэтага не бачна?

— Тады транквілізатараў не трэба, — на яе вуснах з'явілася ўсмешка, у якой было, на мой погляд, нешта змушанае, але затым яна раптам скінула з сябе кашулю і рашуча абняла мяне. Мы леглі на канапу. Я не адразу авалодаў ёй, а нейкі час моўчкі лашчыў, пэўна, ужо тады ў мяне да яе ўзнікла тое самае пачуццё, якое, яшчэ да гэтай нечаканай фізічнай блізкасці, злучыла нас разам і якое з даўніх часоў называлі каханнем...

МІНІПАЭМА

# НЕ ДАЙ ЗГАСІЦЬ НАДЗЕЮ

Марыя НОВІКАВА



***Калі ты ступіш у абшары ночы,***
***О, колькі болю на тваім шляху!***
*Ірына Дарафейчук*

***Ёсць талент — жыць…***
*Марыя Баравік*

*Голас Бога:*
*— Мой чалавек, Мой скарб і боль*
*Мой вечны,*
*Табе Я даў у спадчыну Зямлю.*
*Але, каб свет не страціў чалавечнасць,*
*Яшчэ й агеньчык Веры запалю.*

*Калі ты ступіш у абшары ночы,*
*Ён будзе грэць цябе сваім цяплом,*
*Каб ты з дарогі ісціны не збочыў,*
*Асветліць шлях даверлівым святлом.*

*Маё непаслухмянае стварэнне,*
*Каб сапраўды Маім адбіткам быў,*
*Я даў табе стваральнае імкненне*
*І Таленту агеньчык запаліў.*

*Каб на шляху сваім бяды не зведаў,*
*Адрозніць мог, што — добрае, што — зло,*
*Я дам душы тваёй і прагу ведаў.*
*Так, дам табе Я Мудрасці святло.*

*Пытаешся, дзе шчасце і багацце?*
*Як жыць табе ў нядолі і журбе?*
*Вазьмі Надзею, каб сябе не страціць.*
*І прыкладзецца іншае табе…*

*Адказ Чалавека:*
*— І я пайшоў няпростаю дарогай,*
*Пайшоў, не наракаючы на лёс.*
*І палымнелі ўсе дарункі Бога,*
*Я іх святло ў жыццёвы свет панёс.*

*І найярчэй мая гарэла Вера.*
*Дзіцячы позірк мой шукаў нябёс.*
*І ў храм былі адчыненыя дзверы,*
*І быў на алтары жывы Хрыстос.*

*Ды час мяне прыспешваў у дарослась.*
*Агеньчык Веры мне нязручным стаў.*
*Забыўся я пра шчырасць і пра ўзнёсласць*
*І ў спакушэннях веру занядбаў.*

*Згасіў агонь, каб воск дарма не траціць:*
*Зацеплю зноў, калі надыдзе час —*
*Бліжэй да Пасхі, ці пры іншым свяце…*
*І свечкін труп заторкнуў за абраз.*

*Згасіў агонь, што цепліўся так квола.*
*І больш не браў таго я ў галаву:*
*Жывуць жа людзі без яе наўкола.*
*І я без Веры неяк пражыву…*

*Без Веры…*
*І на трон узняў я Розум.*
*— Усё змагу, адолею, — рашыў.*
*Не ўбачыў я галоўную пагрозу:*
*Быў розум мой пазбаўлены душы.*

*І не было ў мяне абмежавання,*
*Маральнай меркі ў сэрцы не было.*
*І стаўся Розум свету пакараннем,*
*Бо затаптаў я Мудрасці святло.*

*Дзе ж выйсце?*
*Творчасць! Талент — мой ратунак!*
*Я ў гэты вір нырнуў, бы ў акіян.*
*Я выпесціў Твой, Госпадзе, дарунак,*
*Ды сам сябе ізноў завёў у зман.*

*Не шкадаваў ні высілкаў, ні часу.*
*Я адчуваў, як з кожным днём мацней*
*Так надзвычайна, зырка, зорна, ясна*
*Гарэла свечка Таленту ўва мне.*

*Казалі: «Шапкі прэч, прад намі — геній!»*
*Лагодзіў вушы гэты хваласпеў.*
*І я не слухаў голасу сумлення,*
*Бо славы і вядомасці хацеў.*

*Я даслужыўся да вянкоў лаўровых…*
*Ды толькі ў той пагоні за хвалой*
*Свядома заглушыў я шчырасць слова*
*І ў пустаслоўі страціў Талент свой.*

*Тры свечкі. Тры забітыя ахвяры*
*Майго бяздум'я і жыццёвых драм…*
*Даруйце мне, загубленыя мары,*
*Агонь душы, што задушыў я сам.*

*Стаю над цемрай, над бяздонным вірам.*
*Застаўся крок…*
*І тут успомніў я,*
*Што свечак усяго было чатыры…*
*І гэтая — апошняя мая.*

*Крычала ўсё: «Згасі яе! Спазніўся*
*Ты пачынаць з бялюткага ліста!»*
*У цемры сэрца ціхі блік свяціўся.*
*Я ўпершыню агонь гасіць не стаў.*

*У ночы сэрца блік святла ніцее…*
*І голас з той далёкае пары*
*Мне падказаў імя яго: «Надзея…»*
*І ўсклікнуў я:*
*— Не памірай! Гары!!*
*Гары! Свяці!!! Адпрэчу ўсе сумневы!*
*Я болей не магу ХАЛОДНА ЖЫЦЬ!*

*І, як з нябёс магутная залева,*
*Слоў шчырых мора хлынула з душы.*

*І я адчуў забытае трымценне*
*Пякучых думак і шчымлівых нот.*
*І зноў жывое полымя натхнення*
*Маю душу прабіла навылёт.*

*Сказаў тады:*
*— Мінае прага славы,*
*Сцірае час абрысы гарадоў.*
*Руйнуюцца палацы і дзяржавы,*
*Ды вечныя Надзея і Любоў.*

*Мінае ўсё: багацце, шанаванне.*
*І я міну. І цэлы свет міне…*
*І гэта адкрыццё было світаннем*
*І адраджэннем Мудрасці ўва мне.*

*І я сказаў:*
*— Адкіну ўсе ваганні,*
*Адкрыю сэрца словам я Тваім,*
*Твая Любоў ратуе ад змяркання.*
*Мой Божа, назаві мяне «сваім».*

*Пакліч мяне з глыбінь маёй цямнечы,*
*З маёй тугі, бязвер'я і трывог.*
*Твая Любоў мае акрыліць плечы…*
*Пакліч мяне, пакліч мяне, мой Бог!*

*… І раптам думка зыркаю маланкай*
*Працяла адкрыццём мой думны дым:*
*Калі «Цябе шукаю я ад ранку…»,*
*Якім жа, Госпадзе, я быў сляпым!!!*

*Ты быў са мной ад першага імгнення,*
*Ад нараджэння неба і зямлі,*
*Ад першай думкі, ад майго ўтварэння*
*Любоў і голас Твой ўва мне жылі!*

*Мне больш не страшна. Бо калі настане*
*Мой крок апошні ў хвалю небыцця,*
*Заззяе Бог над безданню — світаннем*
*І зноў пакліча з цемры да жыцця!*

*Голас Бога:*
*— Дзіця Маё, Мой клопат і натхненне,*
*Адкрый ты найважнейшае ў жыцці:*
*Праз страты, горыч, праз усе цярпенні*
*З Надзеяй непагаснаю ісці.*

*Насі Яе ў душы, дзяліся Ёю,*
*Не дай Яе нікому задушыць.*
*І памятай, што Я заўжды з табою,*
*Як і Надзея — лепшы ТАЛЕНТ ЖЫЦЬ!*

ПЕРАКЛАД

# Філіп Ларкін



**ФІЛІП ЛАРКІН (PHILIP LARKIN) — англійскі пісьменнік (1922–1985), нарадзіўся ў Ковентры, закончыў Оксфардскі ўніверсітэт. Лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій і ўзнагарод, сярод якіх — Каралеўскі залаты медаль за паэтычныя дасягненні.**

## Вада

*Калі б мне сказалі*
*Прыдумаць рэлігію,*
*Я б скарыстаў ваду.*

*Хадзіць у царкву —*
*Трэба ісці ўброд, каб*
*Захаваць сухім адзенне;*

*Літургія мая мела б*
*Вобразы акунання ў ваду*
*І шчырае хрышчэнне,*
*На ўсходзе я мушу*
*Падняць шклянку вады,*
*Дзе будзе збірацца*
*Анёльскае святло.*

## Я пачаў гаварыць

*Я пачаў гаварыць:*
*«Чвэрць стагоддзя», або*
*«Трыццаць гадоў таму» —*
*Пра сваё жыццё,*

*Затаіўшы дыханне,*
*Быццам падаю і ўздымаюся*
*У вялікай мёртвай пятлі*
*У пустэльным небе.*

*Усё, што здарыцца —*
*Смерць (і мая таксама),*
*Як і калі. Хто за кім —*
*Трэба яшчэ даведацца.*

## Скошаная трава

*Трава слабая ў пакосе.*
*У скошаных сцяблін*
*Кароткае дыханне,*
*Смерць забірае шмат гадзін.*

*Трава ўмірае белым днём*
*Ліпеня зялёна-лістовага.*
*Свечкі каштанаў гараць агнём,*
*Чакаюць хіба дня новага.*

*І пахне ўсюды белым бэзам,*
*Сцежкі ўсе ў карунках,*
*Воблак паўзе над лесам*
*Ціха — поўны задумкаў.*

## Калі б рукі маглі вызваліць сэрца

*Калі б рукі маглі вызваліць цябе, сэрца,*
*Куды ты паляцела б?*
*Далёка па ўсёй зямлі,*
*Якую поўнае неба захацела*
*Зрабіць пустой. У горад,*
*Да мора, да гары над долам,*
*Калі б рукі маглі зрабіць цябе волным?*

*Я б не замкнулася на замок,*
*Я б пабегла праз даліны,*
*Лясы і палі, колькі змагло б,*
*Лавіла б шчаслівыя хвіліны*
*Пад сонцам. А калі знемагло б,*
*Не знайшло б нат і пляча,*
*Каб галаву сваю прытуліць.*

**Пераклад Алены ТАБОЛІЧ**

АПАВЯДАННЕ

# ФОТАМАЙСТАР



Уладзімір ДАМАШЭВІЧ

Лета выдалася гарачае, спякотнае, без дажджоў. Збажына на полі даспявала без пары, з малым, засушаным зернем. А ў верасні, калі поле паступова гусцела, пачаліся дажджы. Толькі першага верасня, як памятае майстар Карнілка, пагода стаяла адмысловая, як па заказу, і ён заўсёды прыносіў дадому, у сваю фоталабараторыю, некалькі стужак і касетаў добрых вясёлых школьных здымкаў, якія рабіў па запрашэнні ў некалькіх школах, толькі паспявай.

Гэта быў сякі-такі заробак да яго працы ў газеце, якую ён не любіў і ўжо падумваў пра тое, каб пайсці ў якое іншае месца, каб не здымаць надзьмутых старшыняў калгасаў, заношаных трактарыстаў і нявыспаных худых даярак.

Цяпер апошнім часам нахапілася новая — ці то хвароба, ці то ўлюбёнасць — хадзіць на мітынгі, якія сяды-тады арганізоўвалі апазіцыйныя партыі, выводзячы на вуліцы і на плошчы не адну тысячу людзей, пераважна моладзі. Яму асабліва імпанаваў яшчэ даволі малады важак самай баявітай і шматлікай партыі, якая мела ў сваёй праграме бачыць Беларусь незалежнай дэмакратычнай краінаю — без камуністаў, з'арыентаваных на Усход. Гэта быў Лявон Войніч, высокі, стройны, хударлявы мужчына з галавою мудраца: высокі лоб, які ўжо пераходзіў у лысіну, цёмныя смелыя вочы, востры правільны нос, добра акрэслены жарсткаваты рот, прыемнага тэмбру барытоністы голас, якім ён умеў артыстычна мадуляваць. Яшчэ ў ім здзіўляла тое, як ён умеў гаварыць: цвёрда і пераканаўча, ніколі не заікаючыся і не спатыкаючыся, нібы перад ім ляжаў тэкст, набраны вялікімі літарамі…

Хоць майстар Карнілка па пашпарце лічыўся рускім, бо нарадзіўся на Смаленшчыне, ён цалкам трапляў у палон яго жалезнай логікі і згаджаўся з прамоўцам на ўсе сто, як і ўсе тыя, хто яго чуў вось на гэтай плошчы ці вуліцы. Таму, ходзячы на мітынгі, ён вяртаўся не з пустымі рукамі, а меў некалькі плёнак і касетаў, запоўненых здымкамі гэтага незвычайнага чалавека, прытым у самых розных ракурсах, у самых нечаканых паваротах, выразах твару: у часе прамовы, у паўзах, часам з усмешкай, калі відаць былі яго белыя роўныя зубы, калі правая рука яго падкрэслівала нейкую новую думку. Але жэсты і ўсмешкі ў яго былі рэдкія.

Майстар Карнілка лічыў, што гэты чалавек даб'ецца пастаўленай мэты, хоць яму будзе вунь як цяжка, і ўсёй душою хацеў яму спрыяць — хоць бы вось такім спосабам, — праз аб'ектыў, каб захаваць яго воблік надоўга.

А зусім нядаўна фотамайстар надумаў сабе цікавую работку: змайстраваць фотаальбом, у якім паказаць свайго героя Лявона Войніча ад пачатку іх знаёмства да сённяшніх дзён, калі той выступае з высокай трыбуны ва ўладзе, на сесіях, на сустрэчах з выбаршчыкамі, на плошчах перад тысячнымі натоўпамі, дзе ён рэзка крытыкае рэжым за тое, што ён прадае нацыянальныя інтарэсы: закрываюцца беларускія школы ў гарадах, а ў сталіцы рэспублікі ўжо няма ніводнай школы на роднай мове. Гэта не зафіксуеш на стужцы, але зрабіць подпіс пад здымкам можна — і нават трэба: даваць вытрымкі з яго выступленняў — самыя вострыя і трапныя мясціны.

Альбом будзе трохі палітызаваны, але што ў гэтым дрэннага? Цяпер такі час: палітыка сядзіць у кожнага ў пячонцы, без яе проста немагчыма жыць. Добра было б потым растыражыраваць альбом, каб яго пусціць у людзі, у народ, але гэта паспеецца. Галоўнае — зрабіць арыгінал-макет, а тады будзе ведаць, што і як, у які бок вярнуць і куды кіраваць…

Аказалася, што не так усё проста, як яму спачатку здавалася. Трэба было перакапаць свой архіў стужак — плёнак і касетаў, старых здымкаў, якія ляжалі ў яго, складзеныя без усякай сістэмы, лепш сказаць, зваленыя ў кучу, у якой цяжка было знайсці пачатак і канцы. Да таго ж у яго ўсё неяк няўзнак памянялася-паламалася: ён развёўся з жонкаю. І адна з прычын, калі не галоўная, была тая, што фотамайстар перастаў як след займацца сваімі справамі, каб пракарміць і дагледзець сям'ю, а звязаўся з апазіцыяй, прападаў на розных мітынгах і дэманстрацыях, здымаў нейкіх там крыкуноў, што выступалі супраць рэжыму. За што не раз фотамайстар меў непрыемнасці — не толькі ад роднае жонкі, але і ад уласнага начальства на рабоце, а таксама ад міліцыі, якая часцяком затрымлівала яго, забірала і засвечвала стужкі, спасылаючыся на нейкія ім вядомыя, а яму невядомыя, пастановы і ўказы, пагражала ўжыць да яго больш строгія меры. Яны з жонкаю размянялі кватэру, ёй дасталося два пакоі і двое дзяцей, а яму — аднапакаёўка на першым паверсе ў старым доме, пабудаваным яшчэ пасля вайны, — казалі нават, што яго збіраюцца зносіць, а тут пачнецца новая вялікая будоўля. Але калі тое будзе… Пры размене, пярэбарах у яго шмат чаго згубілася, шмат чаго завалілася і пераблыталася, таму ён да ўсяго стаў адносіцца яшчэ больш няўважна, нібы стаў жыць сённяшнім днём — і толькі.

Ва ўсякім разе, цяпер яму рупіў толькі альбом, астатняе стала дробным і нецікавым. І якраз тут у яго з'явіўся новы клопат: неяк на мітынгу недзе ў кастрычніку да яго прыклеіўся адзін хлопец вясковага тыпу, проста апрануты, і сам просты, з лапаць, сярэдняга росту, русавалосы, у шэрым падношаным плашчы, са спартыўнаю сумкаю чорнага колеру, даўно не новаю. Ён стаў угаворваць майстра ўзяць яго на кватэру. «На якую кватэру? — здзівіўся майстар. — Я маю аднапакаёўку, у якой мне і аднаму цесна, а ты хочаш, каб я цябе ўзяў. Хто ты такі?»

Хлопец расказаў, што ён студэнт трэцяга курса, што яму цяпер не далі інтэрната за яго паходы на мітынгі і дэманстрацыі, сказалі шукаць кватэру. Ён хацеў бы пабыць у яго хоць пару месяцаў, а там яго сябра абяцаў яму знайсці добрае месца з ім разам, там у яго цяпер нейкія непаладкі ў сям'і… Хлопец так прасіўся, так умольваў майстра, што ён згадзіўся ўзяць яго на якіх пару месяцаў. Раз хлопец паплаціўся за сваю цікавасць да апазіцыйнага віхру, то яму трэба дапамагчы, — рашыў майстар. Выходзіць, што яны абодва паплаціліся за адно і тое ж, звязаны адной вяровачкаю.

Вечарам хлопец прынёс свае небагатыя пажыткі: раскладушку, чорную суконную коўдру, пару прасцінаў, невялікі ясікпадушачку, яшчэ ўсякай там драбязы: ручнік, шыла-мыла, зубную шчотку.

Яны павячэралі разам, пілі малдаўскае віно, якое прынёс новы кватарант — звалі яго Ігнасем, рэдкае цяпер імя. Ён быў негаваркі, толькі трохі расказаў пра сябе — адкуль, хто бацькі, колькі братоў-сёстраў, але ўсё ў яго было звычайна, без ніякіх адхіленняў ад нормы.

Гаспадар таксама сёе-тое распавёў яму пра сябе, паказаў некалькі здымкаў, зробленых на мітынгах, хлопец зацікавіўся імі, пытаўся, хто гэта, а хто гэта, а галоўную фігуру звычайна ў цэнтры здымка, высокую, з адкрытым тварам і голаю галавой ён добра ведаў. Майстар расказаў пра тое, як прыйшоў да думкі, што вось гэты, на здымках, Лявон Войніч, гаворыць правільна: трэба нешта рабіць, а не мірыцца з тым шэрым жыццём, якім жывём мы сёння.

Малады хлопец уважліва слухаў, часам што-небудзь перапытваў, як бы хочучы заглыбіцца ў тэму. Яго, як ні дзіўна, цікавілі асобныя прозвішчы, якія сталіся вядомымі ў апошні час сярод апазіцыйнай моладзі; яго зацікавіла, чаму іх афіцыйная прапаганда называе нацыяналістамі, хоць яны, па сутнасці, ніякія не нацыяналісты, а толькі патрыёты свайго краю. Дык хіба гэта грэх?

Фотамайстар згаджаўся з яго словамі і прыводзіў думку, што менавіта кожнага беларуса-патрыёта ў 37-м годзе расстрэльвалі як ворага народа, нацдэма, заклятага праціўніка савецкай улады, а гэта былі ніякія не ворагі, а лепшыя людзі нацыі, якімі можна і трэба было б ганарыцца, а не абзываць іх страшным кляймом «вораг народа» — і знішчаць, як «шалёных сабак».

І сёння, калі іх дзеці і ўнукі выходзяць на плошчы і вуліцы з бел-чырвона-белымі сцягамі і пратэстуюць супраць скасавання беларускіх школаў, дык іх ужо таксама называюць самымі горшымі словамі: адмарозкамі, недабітымі нацдэмамі і нават фашыстамі…

Яны доўга яшчэ потым гаварылі, ужо выключыўшы святло, студэнт Ігнась парыпваў сваёю раскладушкаю, варочаўся, не знаходзіў зручнае позы. І калі заснуў сам майстар Карнілка, нават не заўважыў — плаўна і непрыкметна. Спаў моцна, без усякіх сноў, і прачнуўся ўжо завідна, было восем пятнаццаць. Глянуў на раскладушку — пуста, яна акуратна засланая чорнаю суконнаю коўдраю, на падушцы-ясіку ляжыць згорнутая ў дзве столкі невялікая паперка, як з блакнота. Майстар разгарнуў яе і прачытаў: «Выбачайце, спяшаюся на заняткі. Буду вечарам. Ігнась». Почырк роўны, правільны, спакойны — ні ўлева, ні ўправа.

«Ну й ладна, мне што? Зараз паснедаю — і за работу».

Снедаў, думаў, успамінаў учарашні вечар, гутарку з хлопцам. Ці не зрабіў ён глупоты, што адразу паказаў сябе, распрануўся дагала? Мо не варта было б так адразу?.. Але што, хіба ён не ведае, хто ён, Карнілка, якому Богу моліцца? Хіба не быў ён на мітынгах, не бачыў, на чыім баку яго сімпатыі?

А вось хто гэты Ігнась, ты, братка, ведаеш толькі павярхоўна. Мо гэта зусім не той хлопец, за каго ён сябе выдае? Варта было б праверыць, што гэта за студэнт, ці за сімпатыі да апазіцыі яго выставілі з інтэрната? Мо гэта звычайная падсадная вутка? А ты, стары, адразу пайшоў на яе голас? Можа такое быць? Можа, яшчэ і як…

Але, з другога боку… Здаецца, нічога падазронага за ім няма. Звычайны праставаты, вахлакаваты, не надта развіты як на сённяшнюю студэнцкую моладзь. «Штабс-капітана Рыбнікава» не чытаў, Купрына нават не чуў. З беларускага чуў пра Максіма Гарэцкага, кажа, што чытаў яго «Запіскі на імперыялістычнай вайне». Можа, й праўда… Але што Гарэцкі быў рэпрэсаваны і расстраляны — не ведае. Звычайны студыёзус, чаго ад яго хацець? Па гадах, здаецца, яму ўжо недзе дваццаць пяць, што ж ён так спазніўся? Ці служыў у войску — не сказаў… І яшчэ — зачуханасць яго здаецца штучнаю, тут ён як іграе ролю такога вясковага лапця, а сам, відаць, не такі — мо нават гарадскі і сэрцаед жаночы…

Але такія думкі-сумненні як узнікалі, так і знікалі, не пакідаючы глыбокага следу ў свядомасці, ён лічыў, што гэта дробязі, якія ён сам сабе прыдумляе. Яго цяпер цікавіла, як добра скласці альбом, каб ён зацікавіў гледача: мо варта даць некалькі каляровых здымкаў для ажыўляжу?..

Сёння дзень у яго прайшоў неяк хутка, выйшаў толькі ў краму, купіў пельменяў, яек, кефіру, кавалак таннае кілбасы — на дарагую выбачай! Галоўнае, каб было што закінуць у топку, казаў адзін чыгуначнік. Свой жывот ён прывучыў не быць пераборлівым, за што не раз і сварыўся з жонкаю, бо ёй, як жанчыне, хацелася часам нечага смачнейшага, чым яго шырпатрэб.

Новы кватарант прыйшоў у дзесяць вечара, казаў, што затрымаўся ў чыталцы. Дзіўна, што пра ключ ён не загаварваў, а гаспадар сам не напрошваўся. Але, нібы адгадваючы яго думкі, хлопец сказаў, што ён увесь час будзе прыходзіць недзе так — пасля дзесяці вечара, астатні час ён або на занятках, або ў чыталцы, шмат семінарскіх заняткаў, увесь час трэба рыхтавацца, каб не страціць стыпендыі. Сёння ён быў у трохі лепшым касцюме, паголены, прычасаны — меў прыстойны выгляд, і майстар падумаў, што проста ён прывыкае да чужога чалавека. А галоўнае, каб ён яму не надакучаў.

Вячэралі разам, зноў кватарант дастаў са свае спартыўнае сумкі пляшку малдаўскага партвейна, запытальна паглядзеў на гаспадара: што ён скажа? А гаспадар сказаў, што яму гэта не зашкодзіць, а вось студэнту дык можа адбіцца на паспяховасці, на што той з усмешкаю адказаў, што можа піць доўга, а яшчэ даўжэй — не піць, тым больш партвейн, які ён уважае лепш за сухача. Потым ён нечакана пахваліўся, што прачытаў Купрына — «Штабс-капітан Рыбнікаў», што яму вельмі спадабалася апавяданне і гэты японскі штабс-капітан, вельмі разумны і асцярожны чалавек, а

вось жа прамахнуўся — і пагарэў з-за нейкай там прасціёткі. А каб не яна, дык ён яшчэ вунь колькі нашкодзіў бы. А каму трэба было яго вылавіць, тыя спалі… Нешта падобнае было і ў гэтую вайну…

Але развіваць тэму студэнт не стаў, а гаспадар ахвотна падключыўся. Менавіта, каму трэба, той заняты абы чым, а не галоўным. Вось чаму нас і правучылі тыя ж немцы, як японцы ў тую вайну. Мараль «сей басни такова»: «Дзякуй Богу, што твой праціўнік паўдурак. Інакш табе было б не знасіць галавы».

На што студэнт нечакана сказаў, што яму падабаюцца амерыканцы: за сваю паразу ў Пірл-Харбары яны скінулі на японцаў усяго дзве атамныя штучкі, пасля чаго японцы адразу ўзнялі ручкі. Яны абодва трохі пасмяяліся з удалай рыфмы, якую знайшоў студэнт, а потым схамянуліся: з чаго смяюцца!

— Табе проста трэба ісці ў паэты, — зазначыў гаспадар.

— Не, паэта з мяне не будзе, — адказаў студэнт, — пайду ў юрысты.

— Судзіць ці абараняць? — спытаўся гаспадар.

Студэнт падумаў, а потым адказаў:

— Абараняць…

— Вельмі слушна. Віншую, — зазначыў гаспадар. — Аднак: як жа тыя дзве штучкі?

— Я сказаў бы, што японцы іх заслужылі, — адказаў студэнт.

Гаспадар пакруціў галавою, як бы згаджаючыся са сказаным, і дадаў у заключэнне:

— Каб кожны атрымаў тое, што заслужыў, было б няблага. Аднак…

Майстар заўважыў, што яму прыемна пагаварыць з чалавекам, відаць, жыццё адзінокага мужчыны яму прыелася, а гаварыць сам з сабою ён яшчэ не навучыўся — стаж адзіноты быў не такі яшчэ вялікі…

Дні непрыкметна каціліся, ён прывыкаў да новага чалавека, які не здаваўся яму чужым, а выклікаў да сябе сімпатыю. Мо нават таму, што не лез у душу з роспытамі, не надакучаў нейкімі там аповедамі пра сябе, не хваліўся поспехамі ў дзяўчат, як гэта любяць рабіць студэнты. Адзінае, што яго цікавіла і пра каго яны гаварылі і нават спрачаліся, была апазіцыя, пераважна яе лідэр Лявон Войніч. Ігнась не зусім быў згодзен з тэзісамі Лявона наконт далейшай дзейнасці: апора на ўласныя сілы, сяброўства з суседзямі толькі на ўзаемна выгадных умовах, развіццё нацыянальнай культуры, беларускай школы і мовы перш за ўсё, якая з кожным годам ідзе к заняпаду — і з гэтым ўсе як змірыліся і робяць выгляд, што так і трэба, і што працэс гэты спыніць нельга, а тым больш — спыніць і нават павярнуць назад. А Лявон даказвае, што яго трэба спыніць — і любымі сродкамі, інакш праз год-два-тры будзе ўжо позна.

— Што значыць «любымі сродкамі»? — пытаўся студэнт у майстра.

— Любымі, я так думаю, — гаварыў майстар, — гэта значыць нават самым радыкальнымі.

— Што гэта за радыкальныя? Узброеныя? — зацікавіўся студэнт.

— Не трэба ўзброеных. Не трэба ліць родную кроў, як гэта бывае ў грамадзянскіх войнах, у войнах дамовых, як кажуць палякі. Трэба змагацца мірнымі сродкамі: масавымі мітынгамі, дэманстрацыямі, акцыямі непадпарадкавання, як гэта рабіў вялікі індус Гандзі, галадоўкамі, забастоўкамі… А не так, як мы робім: выйшлі, пашумелі, пагаварылі, потым разышліся — і на гэтым усё кропка. Не, так мы не зрушым з месца гэты цяжкі воз. Акцыі трэба праводзіць бясконца, пакуль рэжым не стоміцца і не прызнае, што патрабаванні апазіцыі, народа правільныя, законныя, і іх трэба выконваць, бо голас народа — гэта голас Божы, і калі яны яго адрынуць — значыць, яны не слугі народа, а ворагі народа і павінны пайсці ў адстаўку, даць месца тым людзям, якія здольны вывесці краіну з заняпаду — менавіта культурнага заняпаду, нацыянальнага памірання. Гэтая зямля, па якой мы ходзім, на якой жывём, якая нас поіць і корміць — беларуская, дык чаму мы мову сваю беларускую занядбалі, выкінулі на звалку гісторыі?

Майстар памаўчаў, перадыхнуў і працягваў:

— Што выкідаюць на звалку? Тое, што аджыло сваё, што знасілася дашчэнту і не мае больш ніякай патрэбы. А мова наша? Чаму наш рэжым кідае яе на звалку, як непатрэбшчыну? Якое права ён мае гэта рабіць? Хіба можна выкідаць на звалку самае святое, самае дарагое — мову, — што вякамі належала нашаму народу? Няўжо нашы вярхі зусім аслеплі і аглухлі, няўжо зусім атупелі і апупелі, што не бачаць відавочнага? Чаму яны не глянуць на сваіх суседзяў і не вучацца ў іх? Хто з нашых суседзяў — злева, справа — адрокся ад свае мовы, роднае, на якой гаварылі іх дзяды-прадзяды, хто гаворыць на чужой, на пазычанай, на суседавай? Дзе, хто? Нідзе, ніхто! — аж задыхнуўся майстар і секануў рукою паветра.

— А гэта вы добра сказалі! Проста, як у сук уляпілі! — гарачыўся і аж падскокваў на табурэце студэнт.

Фотамайстар між тым гаварыў далей: на яго як накаціла нейкая магутная хваля, якая ўзняла яго высока-высока, што яму рабілася ажно страшна, бо ўнізе была чорная прорва.

— Дык чаму ж нашы вярхі такія разумныя наадварот? Дзе іх вочы? Дзе іх вушы? Дзе іх розум урэшце? Калі яны лічаць, што родная мова — гэта нішто, то трэба прызнаць, што яны падпісваюць сабе страшны прысуд: яны прызнаюцца, што яны самі нішто! Але, каб не лічыцца такімі, яны пазычылі мову ва ўсходніх суседзяў і карыстаюцца ёю як сваёю. І не думаюць, што за гэта трэба будзе плаціць дарагую плату. І чым жа яны будуць плаціць? Ды сваім знікненнем! Яны міжволі, самі таго не адчуваючы, растворацца, як тая соль, у рускім моўным акіяне і перастануць існаваць як беларускі народ, як нацыя беларусаў, а стануць рускімі, расійцамі. І гэты час не за гарамі. За год, за дзесяць, за сто — нас не будзе як нацыі, бо не будзе нашае роднае мовы! Вось мы з табою — на якой мове гаворым? На трасянцы з беларускіх і рускіх слоўцаў! А на добры лад мы павінны гаварыць на чыстай літаратурнай беларускай мове, якую выкладаюць у школах, у вышэйшых вучэльнях… Я кажу «выкладаюць»… Каб жа выкладалі! Каб выкладалі, мы не гаварылі б на трасянцы… Мы заплацім сабою, сваім народам! Рускіх стане на дзесяць мільёнаў больш, а нас — нуль без палачкі, вось колькі нас будзе! Мы ператворымся ў нуль, мы знікнем! Дык няўжо наш урад гэтага не бачыць? Калі не бачыць — дык трэба яму паказаць — і даказаць. І першы факт гэтага доказу — гэта тое, што яны, нашы вярхі, ужо не беларусы, а расейцы, і хочуць, каб мы ўсе бралі з іх прыклад — пайшлі за імі ў абдымкі да рускага мядзведзя. Нават трохі сімвалічна — абняцца з мядзведзем…

— Мядзведзем па прозвішчу Мядзведзеў! Сапраўды сімвалічна! — перабіў яго студэнт і зарагатаў, але нечакана абарваў рогат і стаў сур'ёзны — зноў не зводзіў вачэй з майстра.

Майстар, як падхоплены ўсё той жа хваляй, гаварыў далей:

— Паказальнікі на праспекце Незалежнасці па-беларуску — гэта добра, аб'явы прыпынкаў у транспарце, у метро — па-беларуску — гэта выдатна. Але… ці не ёсць гэта звычайная паказуха: для гасцей з-за мяжы? Самая звычайная, можна сказаць, савецкая. Бо пахадзіўшы па вуліцах беларускай сталіцы, прыслухаўшыся да галасоў людзей на вуліцы, у метро, у аўтобусе і тралейбусе, госць адразу пачуе і зразумее, што ніякіх беларусаў тут ужо няма, што тут толькі рускія. А дзе ж падзеліся беларусы? — спытае ён у сябе, а можа і ў тых, што гавораць па-руску. І яму на чыстай рускай мове, праўда, з акцэнтам беларускага паходжання, скажуць: «Да белорусы вокруг вас, все мы белорусы». — «А где же ваш родной язык?» — спытае дасведчаны паляк, ці літовец, ці ўкраінец, а мо нават швед. І што ж пачуе ў адказ? Пачуе шмат чаго, толькі не пачуе праўды: што беларускую мову ў нас забралі за нішто, праўдзівей, мы яе аддалі за нішто нашаму «вялікаму суседу».

— Няўжо такое можа быць? — ускліікнуў студэнт. Па шчоках у яго цяклі слёзы.

— На вялікі жаль, усё ідзе да такога ганебнага канца, — адказаў майстар.

— Не, нешта трэба рабіць, каб мы не прапалі. — Студэнт выцер вочы тыльным бокам далоні, крутнуў галавою, нібы адганяючы ад сябе назойлівых нябачных камароў, і працягваў: — Сёння я не засну, вы так развярэдзілі маю душу, што там бушуе пажар ці нешта такое. Мне, скажу вам шчыра, і балюча ўсё гэта пачуць, і радасна, што ёсць людзі, якія не жывуць толькі сённяшнім днём, не дбаюць толькі пра свой утульны катух, пра свой брух, а думаюць пра нацыю, пра яе заўтрашні дзень. Значыць, мы не павінны прапасці, калі ў нас ёсць такія людзі, як вы? Ці праўду я кажу?

— Наконт мяне ты перабольшваеш, але я табе скажу ўпэўнена, што ў нас ёсць шмат моцных людзей, якія мысляць шырока, бачаць далёка і робяць шмат, але яны неяк самі па сабе, неяк раз'яднаныя, а часам нават варожа ці з недаверам ставяцца да людзей, якія робяць тую самую справу — абараняюць інтарэсы нацыі. Мы забываем элементарную рэч: што мы ідзём рознымі — мо часам і не такімі ўжо рознымі — дарогамі да адной мэты — незалежнай вольнай Беларусі, беларускай Беларусі, а не нейкай там Белай Русі, якая будзе гаварыць па-расейску. Памятаеце словы Мураўёва-вешальніка? Ён сказаў так: «Что не доделал русский штык, доделает русская школа». Гэты яго акупанцкі голас нутром чуюць нашы вярхі і робяць усё, каб школа наша як мага хутчэй стала менавіта рускай на ўсе сто працэнтаў і каб яна завяршыла асіміляцыю, адвучыла нас ад роднай мовы і прывучыла да расейскай.

— Няўжо нашы вярхі такія цёмныя, што не бачаць гэтай смяротнай пагрозы? — здзівіўся студэнт.

— У тым ўся і трагедыя, што яны не лічаць гэта пагрозай, а «благодатью», якая сыходзіць на іх з неба. Мы проста глядзім на свет рознымі вачыма і думаем рознымі галовамі. Вось у чым уся наша бяда. Чаму Усявышні зацьміў розум нашым кіраўнікам, ніхто не ведае, аднак нас чакае не найлепшы час. Нам не хапае не аргументаў, а сілы, каб пераканаць нашы вярхі, што яны ідуць прамою дарогай у нікуды — у бяспамяцтва.

— Не, далей я так не магу! Вы мне так раскрылі вочы, што я цяпер стану самым заядлым абаронцам роднае мовы і незалежнае Беларусі на роднай мове! Дагэтуль я ведаў усё гэта павярхоўна, нам ніхто не гаварыў так проста і ясна, як вы.

— Чаму толькі я? А на мітынгах наш Лявон не тое гаворыць?

— Вось неяк так выходзіць, што там чуеш адно, а тут, у вас — зусім іншае ўражанне. Вы проста нібы заганяеце цвік у мазгі, і яны пачынаюць думаць па-іншаму, не так, як думалі дагэтуль… А чаму вы самі ні разу не выступілі перад публікай? У вас добра атрымалася б, я ўпэўнены! — ажывіўся студэнт.

— Я не аратар, я — араты, — сказаў адзін паэт. Вось і я — фатограф, а гаварыць трэба ўмець, і наш Лявон гэта ўмее мо нават лепш за нас усіх, ён гаворыць менавіта пра тое, што мы думаем, але маўчым. Ён агучвае нашы думкі, таму яго любяць слухаць.

— Але ж гэтага мала — слухаць. Ну слухаюць — а што далей? Нешта трэба рабіць, — гарачыўся студэнт.

— Ён гаворыць перад тысячай-другой-дзесяццю, а ці чуе яго народ? Чаму не даюць яму выступіць па тэле, па радыё, у афіцыйным друку? Дзе не чуеш роднага слова, дзе гучыць толькі «великий и могучий»? А ўсё таму, каб народ адвыкаў ад свайго слова, каб думаў, што ўсе яго ўжо забыліся, што яно больш непатрэбнае нікому. А тут раптам Лявон скажа да свайго народа на роднай мове! Для іх пачуць такое — проста жах. Ды яны баяцца яго праўды, баяцца, груба кажучы, застацца без электарату, без тых, хто за іх галасуе, баяцца, каб не застацца голымі. Вось чаго яны баяцца, — тлумачыў майстар.

— А ён умее іх распранаць, гэта так! — ускліікнуў студэнт.

— Умее паказаць іх балячкі, якія яны так спраўна хаваюць пад шыкоўнымі касцюмамі і белымі кашулямі з чырвонымі гальштукамі. Ад іх так і нясе прадажным духам, як бы яны яго ні залівалі-забівалі «Краснаю Масквою»!

— Малайчына, Ігнась, ты моцна сказануў! Каб яны пачулі, дык, скрыгічучы, зубы паламалі б ад злосці. Яны даўно запісалі яго ў ворагі — менавіта за яго праўду, якая ім вочы коле. А «Красная Масква» ім так пахне, нібы таму кату валяр'янка. Яны баяцца, што як скончыцца «Красная Масква», дык і скончыцца іх панаванне. Груба кажучы, застанецца толькі смурод…

— А вось мне незразумела, чаму яны так баяцца роднай мовы? Перайшлі б на родную — і кіравалі б далей, — паспрабаваў не згадзіцца студэнт.

— Дзівак! Няўжо ты не разумееш, што іх пасады — гэта якраз плата за родную мову, якую яны прадаюць? Усяго толькі! Як прададуць усю без астатку, вось тады яны могуць застацца без пасадаў. На іх месца прышлюць з «Краснай Масквы», а іх «за ненадобностью» могуць перакінуць за Урал. Каб схаваць ад гневу народнага і як узнагароду за службу, за дружбу, — адказаў фотамайстар спакойна.

— Ну, вы таксама сказанулі! Такога я не чакаў пачуць! І як ні дзіўна, гэта вельмі падобна да праўды! Гэта жах! А я думаў, што яны не хочуць перавучвацца на родную мову з-за свае ляноты. Ажно яно вунь што! Гэта плата за страх! Яны дрыжаць ад страху пры думцы, што Лявон адбярэ ў іх пасады і пасадзіць на іх месца шчырых беларусаў, якія яшчэ не паспелі забыць свае роднае мовы! Вось чаго яны баяцца!

…Гутарка-спрэчка доўжылася яшчэ мо з гадзіну, абодва дыскутанты стаміліся, доўга не маглі заснуць і яшчэ дагаварвалі ўсякія свае аргументы ўжо поначы, без святла. Прачнуліся позна, была якраз нядзеля, можна і расслабіцца, хоць фотамайстра чакала адна невялікая работка: яго запрасілі на юбілей, каб ён зняў шаноўнага юбіляра і яго сям'ю.

Студэнт Ігнась быў нейкі сумны: ці таму, што не выспаўся, ці яшчэ што яму не давала спакою. Ён зноў дастаў са свае чорнае сумкі пляшку малдаўскага партвейна, яны паснедалі, трохі захмялелі, і студэнт агаломшыў гаспадара навіною: ён дзякуе яму за прыемны прытулак і пераходзіць жыць да свайго прыяцеля, у якога ёсць дадатковая плошча.

Але гэта было яшчэ не ўсё. Ужо адыходзячы, сабраўшы свой небагаты скарб, студэнт сказаў майстру жахлівую рэч: каб ён асцерагаўся, бо яго могуць забіць. Хто і што — ён не патлумачыў, ды майстар і не дамагаўся ніякіх тлумачэнняў. Падумаўшы, ён зразумеў, хто і за што мае на яго зуб.

…Недзе праз тыдзень фотамайстра сапраўды знайшлі нежывога ў сваім пад'ездзе. Потым пайшла пагалоска, што яго абрабаваў і забіў той самы малады кватарант, які пражыў у яго два тыдні. Але следаў яго ніякіх не знайшлі, ды іх, відаць, ніхто і не шукаў.

**Мы заплацім сабою, сваім народам! Рускіх стане на дзесяць мільёнаў больш, а нас — нуль без палачкі, вось колькі нас будзе! Мы ператворымся ў нуль, мы знікнем!**

▸ З ПОШТЫ

# НАЛЕПКА,
## альбо Знакі Вонкавай вайны




Прохар АЛЯКСЕЕЎ

**У мяне, як заўжды знянацку, скончыўся тэрмін тэхагляду. Вось ужо месяц, як я раз'язджаў на «нелегальным» аўто, і тое мяне страшэнна напружвала. І, хаця мой добры сябра працуе ў ДАІ і заўсёды пры сустрэчы запэўнівае ў магчымасці разрульвання дробных непаразуменняў з калегамі, сябравай дапамогай я ніколі не карыстаўся, з «даёвымі» размаўляць не ўмею і хабару ім ніколі не сплачваў — заўжды напоўніцу.**

Няёмка нават уявіць, каб хтосьці за мяне прасіў. Ці спярша самому — гулліва дастаць тэлефон і запытаць: «Таварышч інспектар, а ці можна званок другу?..» Не-э-э-э.

Карацей, ездзіў як на голках. А тут яшчэ правае бліжняе святло «паляцела». Плюс клавіша адпацеву задняга шкла. Ды яшчэ пара дробязяў накшталт падсвечвання нумару, што агулам мусіла «ўстаць» у нейкія 30 даляраў і вольны вечар, які яшчэ трэ было знайсці (я працую крэатыўшчыкам у піяр-аддзеле адной рэкламнай кампаніі, і перад Новым годам у нас найбольшая гарачка). Пакуль тое, дацягнуў да саменькай сярэдзіны снежня — часу пікавых стаўпатварэнняў на станцыях тэхагляду.

Машына мая ўжо даўно не дзевачка — 16 гадкоў неўзабаве, хоць ты замуж аддавай. Але рабіць тога не збіраюся: надзейны «немец» (то бок немка), уласнаруч (і ўласнанож) прыгнаная, рухавік і падвеска амаль цалкам перабраныя (запцацкі, праўда, не родныя). Баявая сяброўка — кожную радзімку-драпінку ведаю. Да ўсяго, яна для мяне ёсць індыкатарам жыццёвага тонусу: калі пачынаецца цяжкі перыяд, перадусім штo-небудзь ламаецца ў ёй. Словам, стаўлюся да сваёй ластаўкі, рыхтык да жывое істоты (прычым жаночага полу)…

Вось жа, дацягнуў я з тэхаглядам да саменькае сярэдзіны снежня. З першага прыступу ўзяць станцыю тэхагляду не выйшла: прыехаўшы дзесьці каля дзесятай, натыркнуўся на зачынены шлагбаўм і чаргу з абодвух яго бакоў, а чалавек у будцы патлумачыў, што да абеда патрапіць у двор не рэальна. У лепшым выпадку — пасля 15-й гадзіны. Перспектыва пяцігадзінавага чакання ў мінус дзесяць за бортам зусім не цешыла. І што мне рабіць — запытаўся я ў Адказнага за шлагбаўм? Той патлумачыў, што прыязджаць варта гадзіны за дзве да адкрыцця станцыі (то бок а шостай раніцы), але я не паслухаўся мудрага дарадцы. І назаўтра прыехаў а сёмай.

Шлагбаўм знаходзіўся ў ранейшым стане, а ўнутраны двор быў бітма застаўлены самаходамі. Некаторыя былі без гаспадароў, што ўказвала на існаванне і іншага спосабу заняць чаргу — з вечара, перад закрыццём станцыі — ды спакойненька прыехаць а восьмай. Колькі магла каштаваць тая паслуга ў Адказнага з будкі, Бог ведае. Мажліва, што тыя першыя аўто папросту не дачакаліся з учора. У кожным разе, пакідаць ластаўку на ноч у сумнеўнай кампаніі, каб потым дабірацца на ранішнім антычалавечым быдлі-ку (як мянуе грамадскі транспарт мой швагер), усё адно б ніколі не пагадзіўся.

На нейкі час я праваліўся ў павярхоўны сон, перыядычна адкрываючы вочы, каб спраўдзіць, што пярэдні мінівэн яшчэ не рушыў. Але не ўпільнаваў: чарга зварухнулася, і наступнае маё прачынанне засведчыла, што той, хто быў ззаду, цяпер знаходзіцца пападзе мяне. Выслоўе пра апошніх, што стануць першымі, у нашай-савецкай рэдакцыі. Вачэй я, зразумела, больш не заплюшчваў.

Яшчэ гадзіна — і вось мы за запаветным шлагбаўмам. Хвост за мной, наколькі бачна, цягнецца ўздоўж ходніка. Наперадзе чарга раздзяляецца на тры жылы, і рухацца робіцца куды весялей. Кіроўцы, якія патрапілі ў дворык, нервова паляць, перакідваючы показкамі ды мацюкамі, не забываючыся ўвесьчасна церці-дзерці свае й так ужо да бляску адпаліраваныя аўто. Упершыню выходжу за борт і, хаця па жыцці не палю, страляю цыгарэціну. Кожны метр прасоўвання дадае некантраляванага хвалявання, і я пачынаю разумець, чаму яны гэтак зацята драяць свае тачкі ды шкадую, што сам не парупіўся захапіць каністру вады ды анучкі.

Раптам чую: «С такой наклейкой не пройдёте». Абарочваюся — сівы ўжо дзядзька, уладальнік задняга аўто, указвае на маю налепку з літаркамі BY (кіроўцы перавважна чытаюць іх як бэ-у) і пунсовай хваляю на белым тле. І тут я ўрэшце канчаткова прызнаю: гэта яна, бел-чырвона-белая налепка, і ёсць прычынай майго ўнутранага неспакою, што перарастае ў тупы боль дзесьці ўнізе жывата.

Ну, вядома, я разумеў, што яна «не адпавядае». І нават меў здрадлівы роздум надоечы тэхагляду: а мо набыць правільную «бэушку» ды наляпіць паўзверх?.. Але тут жа адмахнуўся ад свайго маладушша, адсунуўшы яго на перыферыю свядомасці: тое ж драбязa, дурная фармальнасць. Як што, заўжды можна ўключыць дурня: пардонце, гражданін начальнік, не дагледзеў і абавязуюся выправіцца адразу, як пабачу шапік. Насампраўдзе ж, на той перыферыі яно пякло й свярбела, нібыта налепка месцілася не над заднім бамперам, а свежай татухай была выбітая на маім уласным азадку. Цяпер, пасля трохгадзінавай чаргі (і невядома яшчэ, колькігадзінавай наперадзе) тая мая прынцыповасць падалася недарэчнай. Але я ўжо не мог саступіць і цвёрда вырашыў: аддзіраць дакладна не буду. Тут, на людзях, тое б, па-сутнасці, засведчыла капітуляцыю, здраду светлым ідэалам.

І я падкрэслена абыякава адказаў сівому: «Ды хрэн з ёй. Можа, не заўважаць. Вунь — у большасці наогул налепак няма» (а пра сябе падумаў: ну, так, калі прычэпіцца, запытаю, хіба колеравая гама «закат над балотам» гостам зацверджана?). Дзядзька адышоў да сваёй машыны, пакорпаўся ў бардачку й вярнуўся да мяне, працягваючы правільную-гостаўскую налепку. «Наклеете аккуратно сверху. Потом можно будет легко снять: видите — я тут ободок продавил, чтобы не сильно прилипла»…

Тэхагляд з першага разу «ластаўка» не прайшла: узровень СО удвая перавышаў норму. На яго рэгуліроўку давалася 20 дзён, цягам якіх можна было ездзіць без сертыфіката (паўторнае праходжанне ўжо адбывалася па-за агульнай чаргою). «Правільную» налепку я вырашыў не здымаць да перамогі, каб не стварыць сабе нагоды для залішніх загонаў, але... тое была толькі іх пачатковая стадыя. Пошук спецыяліста й рэгуляванне СО занялі каля месяца. І цягам гэтага тэрміну я заўважыў, так бы мовіць, якасныя метамарфозы, што адбыліся ў маім стылі кіравання.

Найперш выявілася, што без ранейшай, бел-чырвона-белай, налепкі я не маю стымулу для дэманстравання дысцыплінаваных паводзінаў за стырном. Ну, не тое, што я адразу ж зрабіўся нейкім злосным парушальнікам. Папросту пачаў ездзіць, як усе — то бок без асаблівых праяваў гуманізму.

Свой мінулы стыль язды я б назваў спробай наблізіцца да еўрапейскага. З ранейшай «байкай» я не мог дазволіць сабе хамскія паводзіны на дарозе, тое быў б нонсэнсам, гэтым я як бы падстаўляў, падавалася мне, саму ідэю (ці штосьці ў такім духу). Напрыклад, да таго, як начапіць на заднюю частку аўто гэты фігавы-гостаўскі лісток, пры нагодзе я стараўся саступаць тым, хто «просіцца» з левага шэрагу ў агульную плынь альбо паварочвае там, дзе няма светлафору, у гадзіну-пік і г.д. (пра бабулек, што палахліва ступаюць на зебры, зусім не кажу). Ну, не тое, каб я быў ужо такім славалюбцам-альтруістам, але пэўную ўнутраную перавагу адчуваў.

Цяпер жа ў мяне з'явілася раптоўная магчымасць суцешыць свае мужчынскія амбіцыі! Я пачаў кіраваць з прыхаванай злосцю, чакаючы моманту, каб правучыць «рэзака», не пусціўшы яго ў патрэбны шэраг, ці высігналіць сваю злосць на якуюсь дзеўку-няўмеку. І, трэба сказаць, гэты new-style прыносіў сваю асалоду, што мела адваротны вектар параўнальна з ранейшым «еўрапейскім» стылем.

Я цудоўна разумеў, што налепка — усяго толькі знак. Не болей і не меней. То бок адначасна і пэўны сімвал, і інвентарны нумар, у залежнасці ад таго, як ты сам да гэтага паставішся. Скажам, яе можна ўспрымаць як сімвал — унутранай свабоды, прагі да самарэалізацыі, супрацьву агульнаму пафігізму і флікерызацыі й да т.п. Але гэтая зададзенасць можа й напружваць: наяўнасць б-ч-б налепкі a-priori вымагае менавіта-такіх-а-ня-іншых паводзінаў, абавязваючы да талерантнасці на дарозе. Гэтак жа як, скажам, цалкам натуральным успрымаецца ў нас, калі які-небудзь апошні танаваны «бумер» ці «лексус», з неабходным наборам «прыгожых» лічбаў на нумары (і на храна яны іх набываюць, калі й так відно, што ты круты бабёр з лавандосам?), з левага скрайняга разганяе дальнім святлом менш накручаныя машынкі, перавышаючы не менш як удвая хуткасны рэжым. І ўсе, як правіла, саступаюць. Мацюкаюць, але саступаюць...

Атрымлівалася, што нейкая фігулька-налепка — адзінае, што напраўду аддзяляе мяне ад маіх «ворагаў». Як манаская раса, зняўшы якую, я апынуўся не лепшым за іх. І, аказваецца, тая мая дысцыплінаванасць была патрэбная выключна дзеля задавальнення ўласных самалюбскіх амбіцыяў. Ды й ці суадносіў хтосьці наогул гэты мой «еўрапейскі стыль» і налепку? Як муж, стомлены шматгадовым шлюбам, не заўважае новае фрызуры сваёй жонкі, пакольк папросту не глядзіць ужо на яе як на сэксуальны аб'ект...

Вырашальным стаўся такі эпізод. Мая суседка (і далей па тэксце вядомай песні «Крэматорыю»), з якой я не вітаюся гадоў з пяць з прычыны пастаянных скокаў па сваёй галаве (спачатку ў выглядзе п'яных шабасаў, а пасля — яшчэ большага ляманту, калі яна па чарзе гучна мацюкае сваіх дзіцё ды сабаку), сустрэўшыся зранку ля аўто, выдала, нібыта й не да мяне звяртаючыся, наступную тыраду: «Наконец-то доблестное ГАИ заставило снять эту порнографию. А то обвешаются своими фашистскими флагами и гоняют по городу». Назаўтра ў мяне быў прызначаны тэхагляд, і тая тырада ўяўляла з сябе відавочны знак. Пасля месяца рэфлексіяў ды загонаў я нарэшце адчуў радасць жыцця. Баланс быў адноўлены.

Не, на тэхагляд я паехаў з гостаўскай налепкай, але адразу ж па атрыманні сертыфіката, у прысутнасці сябра-«даішніка», які пад'ехаў быў на падстрахоўку, урачыста аддзёр верхні слой свайго шматпакутнага палімпсэсту. На бруднаватым целе машыны закрасавала чысценькая бел-чырвона-белая налепка. Я распавёў сябру ў агульных рысах пра метамарфозы свайго стыля кіравання, не забыўшыся на дзядзьку, што выратаваў мяне падчас тэхагляду. Сябра моўчкі даслухаў і сказаў: «Дурні (тут было ўжыта іншае, больш стылёва афарбаванае слова) вы. І ты, і твой «свядомы». У цябе ж нумары новага ўзору. На іх ужо й без таго дзяржаўная ідэнтыфікацыя маецца. Вось бэ-у, вось закат над балотам, усё ў парадку. Так што ніхто тваю «фашыстоўскую сімволіку» і не заўважыў бы. Можаш і далей з ёй раз'язджаць. Мае калегі дакладна не прычэпяцца (тут таксама было ўжыта іншае слова)».

Што да апошняга, ён схлусіў. Чапляюцца штоpазу. І будуць чапляцца, чым больш — тым больш індыкуючы ступень закручанасці нашае славутае «лібералізацыі»…

**P.S.** З майго распаведу можа падацца, што я моцна заангажаваны ў палітыцы чэл. Але ж не. Мала чым маю пахваліцца што да свайго ўдзелу ў барацьбе са злачынным рэжымам. На мітынгі хаджу разы ў гады (на 25-е і на Дзяды), на плошчы не начаваў, адсідак не меў і сцягоў на елкі не чапляў... Адзіны мой антыдзяржаўны ўчынак звязаны з прафесійнай дзейнасцю. Пасля выбараў 2001-га, якія вуснамі іх галоўнага героя былі абвешчаны «элегантнай перамогай», мяне, як і многіх іншых нашых суайчыннікаў, апанаваў страшэнны сплiна-дэпрэсняк. А тут якраз на гвалт хутка трэба было прыдумаць слоган для адной замежнай кампаніі па вырабе панчохаў. У панядзелак, прышкандыбаўшы на працу ў блізкім да суіцыдальнага стане, даслаў ім па мэйле такі сумнеўна зарыфмаваны тэкст: «Толькі нашыя панчохі прывядуць да элегантнай перамогі!» Кіраўнік кампаніі падвоху не заўважыў, слоган прынялі на ўра і, здаецца, ён дасюль з'яўляецца іх візітоўкай...

У прафесійнай мове рэкламшчыкаў існуюць паняцці наружка («наружная» рэклама), буйныя рэкламныя тэксты на білбордах ці будынках, і сувеніркa — г. зн. выявы фірмовых лагатыпаў на каляндарыках, бралочках, асадках, сакалках, балоніках і г.д. Больш за дзесяць гадоў вялізныя сродкі — і дзяржаўныя-спецслужбоўскія (з білбордамі ды неонавымі экранамі), і заходнія-апазіцыйныя (з іх «сувеніркай») — выдаткоўваюцца на Вонкавую вайну. Барацьбу сувеніркі з наружкай, што параўнальна з гарматавым паленнем па вераб'ях...

Калі б тыя звышвысілкі, якія затрачваюцца абодвума бакамі на выраб-распаўсюд і, адпаведна, адсочванне-адлоў значкоў і налепак, былі скіраваныя не на наружку, а ўнутар, да паляпшэння дабрабыту краіны й сябе, краіна гэтая была б іншай. Але пакуль рэжым баіцца чалавека са значком, ставячы на пешаходаў сваё фірмовае-флікернае таўро, палюе на падлеткаў-графітчыкаў, праслухоўвае тэлефоны ды трымае легіён ціхароў, мабыць, не такая ўжо яна і фігулька — тая мая налепка...

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

ЦІКАВА

# ГОМАСЕКСУАЛІЗМ ЯК ЧЫННІК ЗМЕНАЎ

Іван БІЧ

**Чуткі наконт нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі лідэра партыі Свабодных дэмакратаў (FDP) хадзілі даўно. Аднак сам ён доўгі час не хацеў прызнавацца ў сімпатыях да прадстаўнікоў свайго полу. На публіцы ўвесь час ён з'яўляўся з бландзінкай Утай Шпангенберг. Аднак журналісты не паверылі, што паміж імі нешта было.**





Нарэшце Гіда Вестэрвеле надакучыла прадстаўляць сябе як гетэрасексуала. Ён адкрыта заявіў, што жанчыны яго не цікавяць. Аглядальнікі казалі, што на такі крок Гіда падштурхнула палітычная сітуацыя. На двары стаяў 2004 год. Урад сацыял-дэмакратаў і Зялёных з-за не папулярных ліберальных эканамічных рэформ вось-вось павінен быў ляснуць. Аднак ісці на выбары лідэрам ліberalaў, маючы за спінай падвойнае інтымнае жыццё, было вельмі небяспечна. У любы момант скандал мог выйсці вонкі, і Вестэрвеле як нячэсны палітык мусіў бы пайсці са сцэны.

Гіда Вестэрвеле адважыўся на мужны крок. У ліпні 2004 года публічна прызнаўся, што з'яўляецца геем. І адразу стаў цягаць на рознага кшталту фуршэты і прыёмы свайго партнёра. Ім аказаўся малодшы за яго на 6 гадоў Міхаэль Мронц — прадпрымальнік, як займаецца арганізацыяй конных спаборніцтваў і турніраў.

Такі крок аказаўся цалкам апраўданым. Наконт сапраўднай сексуальнай арыентацыі Вестэрвеле больш не спекулявалі. У 2009 годзе партыя Гіда здолела сабраць рэкордную колькасць галасоў за ўсю гісторыю FDP і сфармаваць кабінет з хрысціянскімі дэмакратамі Ангелы Меркель. У кабінеце Вестэрвеле атрымаў пасаду віцэ-канцлера і міністра замежных спраў.

Зараз кабінет перажывае нялёгкія часы. Партыі, якія ўваходзяць у кааліцыю, не могуць дамовіцца па шэрагу пытанняў, асабліва ў галіне сацыяльнай палітыкі. Бясконцыя скандалы паміж міністрамі надакучылі звычайнаму бюргеру. Рэйтынг даверу да ўраду падае штодня. Аднак нават калі заўтра чорна-жоўты (партыйныя колеры ліберлаў і кансерватараў адпаведна) блок ляснецца, Вестэрвеле гарантавана месца ў гісторыі. Ён — першы міністр замежных спраў у гісторыі, які заклаў практыку браць у афіцыйныя замежныя дыпламатычныя ваяжы свайго партнёра.

Праўда, не адразу. Падчас першых візітаў у Польшчу, на Блізкі Усход і ў Турцыю ён не адважыўся прыхапіць з сабою «нявесту» (так празвалі Мронца ў прэсе). Гэта быў бы сімвалічны выпад супраць тамашніх рэжымаў, якія ставяцца да гомасексуалістаў вельмі не лаяльна. У арабскіх краінах гомасексуалістаў увогуле часам чакае смяротнае пакаранне.

Мронц упершыню з'явіўся ў атачэнні Вестэрвеле падчас ягоных візітаў у Швецыю і Італію. Пры гэтым Мронц быў унесены ў афіцыйны пратакол візіту. Так упершыню дыпламаты сутыкнуліся з праблемай — як называць «нявесту» ў пратаколе. Звычайна частка, прысвечаная праграме для жонкі палітыка, называецца «Праграма для дамы». Назваць партнёра Вестэрвеле «дамай», натуральна, не маглі. Пакуль што ў пратаколах ён фігуруе проста як спадар Мронц.

Абкатаўшы Еўропу, Вестэрвеле павёз Мронца ў Японію. Прэм'ер Японіі, пачуўшы пра таго, з кім прыедзе немец, выступіў супраць. Аднак шэф FDP яго не паслухаўся. Мронц таксама быў унесены ў пратакол. Для яго прыдумалі асобную праграму. Адзінае, што быў вымушаны зрабіць Мронц, — заявіць на публіцы, што ляціць на Далёкі Усход за свой кошт. Аднак гэта, думаецца, было зроблена перш за ўсё для нямецкага падаткаплацельшчыка.

Наступным у праграме візіту Вестэрвеле быў Кітай. Гомасексуалізм перастаў быць крымінальным злачынствам у гэтай краіне толькі пару гадоў таму. Пры гэтым Пекіну яўна не хацелася, каб у дадатак да тыбецкага пытання Вестэрвеле надакучваў яму праблемамі правоў «блакітных».

У выніку кітайцы зрабілі ўсё філігранна. У пекінскім аэрапорце «салодкую парачку» сустрэў асабіста прэзідэнт КНР. Ён паціскаў у тым ліку руку Мронцу і нават усміхнуўся яму. Пасля ўсе накіраваліся на прыём у элітны рэстаран China Club. У той жа самы час у іншай частцы Пекіна паліцыя разагнала маніфестацыю мясцовых геяў, якія вырашылі, што прыезд Мронца і Вестэрвеле дае ім на гэта права.

Трэба прызнаць, што прысутнасць Міхаэля ў кампаніі Вестэрвеле падчас афіцыйных візітаў пастпова перастае шакаваць замежнікаў.

У самой Германіі няма адзінага стаўлення да паводзінаў новага міністра замежных спраў. Некаторыя кажуць, што гэта цалкам нармальна, дадатковае сведчанне нямецкай талерантнасці. Іншыя, наадварот, бачаць у настойлівым жаданні Гіда цягаць па ўсяму свету свайго бой-фрэнда нейкі капрыз. «Вестэрвеле павінен вырашыць, кім ён збіраецца стаць — Геншэрам (вядомы нямецкі дыпламат 1970–1980-х гадоў) або Хайдэрам (аўстрыйскі правы папуліст)», — раіць федэральнаму міністру ўплывовая «Sueddeutche Zeitung».

Сам Вестэрвеле кажа, што нямецкая замежная палітыка не павінна ігнараваць правы чалавека, частка якіх — правы сексуальных меншасцяў.

Ва ўсёй гэтай гісторыі ёсць цікавы аспект. Кім бы ні быў Вестэрвеле, ён яўна парушае ўсе старадаўнія догмы нямецкай дыпламатыі. Міністр адкрытым тэкстам патрабуе ад Хілары Клінтан прыбраць з ФРГ атамныя ракеты В–61. У яго няма ніякага такту адносна афіцыйнага Крамлю. Вестэрвеле так дастаў Шродэра, які лабіруе ў Германіі інтарэсы «Газпраму», што Герхард зараз нават судзіцца з ім.

Як тут не задацца пытаннем: магчыма, смеласці Вестэрвеле надаюць асаблівасці ягонага лібіда. Калі ўжо чалавек публічна асмеліўся прызнацца, што ён гей, што яму нічога не варта сказаць усё, што ён думае пра таго ж Пуціна.

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. МАЛАДЫЯ ПАЛЯКІ НЕ ВЕДАЮЦЬ ПРА КАТЫНЬ




Як інфармуе сацыялагічная кампанія Marco Polo, 20 працэнтаў палякаў не ведаюць, хто забіў польскіх афіцэраў у Катыні ў 1940 годзе. А 8 працэнтаў лічаць, што палякаў забілі немцы. Вынікі апытання можна лічыць сенсацыйнымі з погляду на тое, што ў гэтым годзе споўнілася 70-я гадавіна падзей пад Смаленскам, а сама Катынская трагедыя — адна з любімых тэмаў прэзідэнта Леха Качыньскага. Найбольш слаба ведаюць гісторыю тыя, хто маладзей за 21 год. У галовах прадстаўнікоў гэтай катэгорыі ўвогуле поўная салянка. Некаторыя, напрыклад, абсалютна сур'ёзна запісваюць Чэ Гевару ў шэраг лідэраў паўстання ў Познані ў 1956 годзе. Так ці інакш, эксперты гадаюць, чаму маладыя палякі так кепска ведаюць гісторыю. Адны кажуць, што ўсяму віной слабая сістэма адукацыі. Іншыя ўсю віну ўскладваюць на СМІ, якія раздуваюць асабліва сенсацыйныя тэмы гісторыі, ігнаруючы самыя важныя падзеі.

**Па матэрыялах «Wprost» (Польшча)**

### КІТАЙ. З ПЕКІНУ Ў ЛОНДАН НА ЦЯГНІКУ ЗА ДВА ДНІ

Кітайцы задумалі стварыць свой варыянт славутага цягніка «Усходні экспрэс», які звязвае Лондан і Стамбул. Кітайскі «Усходні экспрэс» павінен спалучыць Пекін з Лонданам і пройдзе па тэрыторыі 17 краін. Усяго цягнік праедзе 8 тысяч кіламетраў, прычым на хуткасці 300 кіламетраў на гадзіну. Такім чынам, дабрацца з Пекіну да Лондана можна будзе за двое сутак, што выглядае цалкам фантастычна. Ужо названыя некалькі гарадоў і сталіц, праз якія пройдзе маршрут экспрэса. Гэта Санкт-Пецярбург, Варшава, Берлін і Парыж. Мінск пакуль не згадваецца ў гэтым спісе, аднак цалкам рэальна, што ён туды трапіць. Застаецца сказаць, што рэалізаваць праект кітайцы збіраюцца на працягу дзесяці гадоў. Кітайскі дзяржаўны банк ужо пагадзіўся фінансаваць будаўніцтва.

**Па матэрыялах «Daily Telegraph» (Вялікабрытанія)**

### КАЛУМБІЯ. ГАЛОЎНЫМ ВОРАГАМ ЧАВЕСА БУДЗЕ ЖАНЧЫНА



Наэмі Санін Пасада можа стаць галоўным палітычным праціўнікам Уга Чавеса. Менавіта яна стала бясспрэчным лідэрам калумбійскіх правых пасля таго, як Партыя кансерватараў, якую яна ўзначаліла, перамагла на парламенцкіх выбарах. Цяпер усе палітолагі краіны думаюць, ці не стане Наэмі пераемнікам Альвара Урыбе, цяперашняга прэзідэнта краіны, якому канстытуцыйны суд забараніў зноў балатавацца. Урыбе зараз думае, каго зрабіць сваім пераемнікам, і цалкам магчыма, што гэта будзе Наэмі. У выпадку, калі яна стане галоўным кандыдатам ад кансерватараў і пераможа на майскіх выбарах прэзідэнта, яна аўтаматычна становіцца галоўным праціўнікам Уга Чавеса. Калумбія, якую падтрымлівае ЗША, і Венесуэла, якая будуе сацыялізм, традыцыйныя рэгіянальныя праціўнікі. Чавес і Урыбе мелі складаныя адносіны, якія некалькі разоў ледзь не прывялі да вайны. Сеньёра Пасада ўжо заявіла, што збіраецца прытрымлівацца курса Урыбе.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІСПАНІЯ. REALPOLITIK: КУБІНСКІ ВАРЫЯНТ

Навіна пра смерць кубінскага дысідэнта, палітычнага вязня Арланда Сапата Тамаё, які памёр у выніку галадоўкі пратэсту супраць умоў утрымання ў турме, мела вялікі рэзананс у Еўропе. Амаль усе дэмакратычныя партыі прынялі рэзалюцыі супраць рэжыму Кастра. Або амаль усе. Дасюль не ведае, што рабіць, Рабочая сацыялістычная партыя Іспаніі (PSOE), якая фармуе іспанскі ўрад. Група сацыялістаў з Іспаніі ў Еўрапарламенце падтрымала крытычную рэзалюцыю на адрас Кубы з нагоды смерці дысідэнта. У той жа час МЗС Іспаніі заявіў, што хацеў бы працягнуць курс так званай «рэальнай палітыкі», якая павінна падштурхнуць Гавану да паступовых рэформаў. Прадстаўнік ураду лічыць, што Мадрыду не трэба спрачацца з Гаванай як мінімум пакуль Іспанія выконвае ролю старшыні ў Еўрапейскім саюзе. Гэтыя заявы іспанскіх дыпламатаў выклікалі сапраўдны шок як у Іспаніі, так і ў асяроддзі саміх сацыялістаў. У любым выпадку, калі Іспанія не дабʼецца прарыву ў адносінах з Кубай да канца свайго старшынства ў ЕС, канцэпцыя падлашчвання да дыктатуры можа быць цалкам пахаваная.

**Па матэрыялах «ABC» (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. ЕВА БРАЎН НЕ МЕЛА СЕКСУ З ГІТЛЕРАМ



На паліцах нямецкіх кнігарняў зʼявілася новая біяграфія Евы Браўн. Кніга называецца «Ева Браўн. Жыццё з Гітлерам». Яе аўтар Хайке Гёртэмакер прапанавала новы адказ на пытанне, як Ева Браўн магла зацікавіцца такім монстрам, як Адольф Гітлер, і нават заставацца яму вернай да самай смерці. На думку аўтаркі, Ева разглядала Адольфа не як правадыра і палітыка, а як адзінокую асобу з псіхічнымі праблемамі, якой патрэбны штодзённы клопат. Яна нават, як сцвярджае Хайке, не мела інтымных кантактаў з кіраўніком нацыстаў. Такая трактоўка біяграфіі Евы выклікала шмат крытычных заўваг з боку гісторыкаў. Справа не ў тым, ці былі Ева і Адольф каханкамі. Гісторыкам не падабаецца тое, што аўтарка робіць свае высновы кіруючыся выключна жаночай інтуіцыяй. Некаторыя нават абвінавацілі Гёртэмакер у жаданні настрыгчы грошай на тэме Гітлера. Цяжка казаць, якія былі сапраўдныя матывы аўтаркі, аднак відавочна Германія сапраўды перажывае бум попыту на ўсё, што тычыцца розных аспектаў дыктатуры Гітлера (трэба адзначыць, што гэта цікавасць не азначае палітычных сімпатый да нацызму). Так, фільм «Untergang» — першую знятую ў ФРГ стужку пра апошнія дні Гітлера — паглядзелі прыкладна 5 мільёнаў чалавек, што для немцкага кіно сапраўдны поспех.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ЗІМБАБВЕ. ДЫКТАТАР СВЯТКУЕ



Роберт Мугабэ, прэзідэнт і дыктатар Зімбабве, адсвяткаваў дзень нараджэння. Яму стукнула 86 гадоў. Парадокс у тым, што дыктатар нарадзіўся 21 лютага, аднак адзначыць свята чамусьці вырашыў толькі зараз. З такой нагоды быў арганізаваны дарагі фуршэт. Адначасова ў сталіцы краіны адбыўся вялікі канцэрт, які выклікаў пратэсты апазіцыі. Па падліках апанентаў рэжыму, мерапрыемства каштавала прыкладна паўмільёна долараў, што не вельмі этычна ў краіне, дзе сярэдні заробак 50 долараў на месяц. Аднак пры гэтым апазіцыя ў асобе Моргана Тсвангіраі прыняла ўдзел амаль ва ўсіх урачыстасцях. Морган дабіўся не толькі прызнання вынікаў выбараў, на якіх перамагла яго партыя, аднак і права фармаваць урад. Рызыкаваць дэмакраты не маюць права. Зараз усе чакаюць, ці будзе Мугабэ балатавацца ў 2013 годзе на пасаду прэзідэнта. Ёсць шмат чутак, што на гэты раз ён адмовіцца. Хаця б таму, што на той час Мугабэ будзе ўжо 89 гадоў.

**Па матэрыялах «Mail and Guardian» (ПАР)**

МЕРКАВАННЕ

# МЕДАЛІ ДЛЯ «ПАЛІЦАЯЎ»

**Амаль паўгода ва ўладзе ў Кішынёве кааліцыя — Альянс за еўрапейскую інтэграцыю. Самым гучным дасягненнем ураду дэмакратаў на гэты час, калі меркаваць па маскоўскай прэсе, стала імклівая інтэграцыя дзяржавы ў склад Румыніі і намер узнагародзіць 9 мая малдаван — ветэранаў румынскай арміі, якая ў часы вайны змагалася на баку немцаў. Пра гэты і іншыя аспекты малдоўскага палітычнага жыцця журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Андрэем Думбравеану, дацэнтам кафедры журналістыкі Малдоўскага дзяржаўнага універсітэта, лідэрам малдоўскай партыі «Зялёны альянс».**

***— У Беларусі шмат каго шакавала ідэя малдоўскіх уладаў адмяніць святкаванне Дня Перамогі і раздаць удзельнікам арміі Антанеску медалі. Адкуль такое рашэнне?***

— Трэба згадаць, што да 1940 года Малдова была часткай Румыніі. Нічога дзіўнага не было ў тым, што пасля таго, як румыны (на той час саюзнікі Гітлера) вярнуліся, яны правялі масавую мабілізацыю. У нас, у адрозненні ад вас, лясоў няма, і, адпаведна, партызанскі рух быў вельмі слабы. Альтэрнатывы таму, каб не ісці ў войска, амаль не было. З іншага боку, калі фронт увесну 1944 года наблізіўся да Малдовы, пачалося масавае дэзерцірства малдаван з румынскай арміі. Яны вярталіся дахаты, каб праз некалькі дзён атрымаць павесткі ў Чырвоную Армію. Самі румыны ў тым жа 1944 годзе выйшлі з гітлераўскай кааліцыі і перайшлі на бок саюзнікаў. Сёння ўрад вырашыў даць медалі ўсім старым. Не іх віна ў тым, што яны трапілі да румынаў. Камуністы, у сваю чаргу, сёння скарысталі ініцыятыву ўраду як нагоду, каб узняць супраць дэмакратаў савецкіх ветэранаў.

У Малдове ветэранаў арміі Антанеску вы можаце сустрэць на кожным кроку. Каля паўмільёна малдаван у час вайны так ці інакш працавала на румын. Гэта частка малдоўскай гісторыі, пра якую ў савецкія часы было проста забаронена казаць. Увесь час тыя былыя румынскія ваякі нармальна жылі побач з ветэранамі савецкай арміі. Цяпер іх намагаюцца пасварыць у палітычных мэтах. У гэтым і ёсць сутнасць нашай кампартыі, якая гуляе выключна на тэмах гісторыі і настальгіі па СССР. Сацыяльная палітыка камуністаў у часы іх праўлення ўяўляла тыповы алігархічны капіталізм. Групоўка бізнесменаў пры кампартыі мела манапалістычны кантроль у шматлікіх сферах. Каб захаваць імідж левай партыі, утрымаць электарат, застаецца рабіць стаўку на тэмы гісторыі і культуры. Хацеў бы таксама згадаць праблему мовы. Вельмі часта кажуць, што Альянс за еўрапейскую інтэграцыю навязвае ў Малдове румынскую мову. Аднак хочам мы ці не, малдоўскай мовы няма. Мы размаўляем па-румынску. І ў гэтым няма нічога страшнага. Хіба ў законах Аўстраліі прапісана, што дзяржаўная мова аўстралійская? Там запісана, што афіцыйная мова — англійская. Аднак гэта не значыць, што Аўстралія ўшчэмленая ў плане суверэнітэту. Яшчэ раз падкрэсліваю, што дзякуючы камуністам тэмы мовы, культуры, гісторыі вельмі палітызаваныя.

***— Ці не кампенсуе ўсе эканамічныя злачынствы камуністаў той факт, што партыя Вароніна — галоўны абаронца незалежнасці Малдовы? Камуністы супраць уваходжання Малдовы ў склад Румыніі.***

— Тэма далучэння Малдовы да Румыніі — яшчэ адзін вялікі міф маскоўскай прэсы. Нават калі б Бухарэст вельмі хацеў нас далучыць, яго магчымасці абмежаваныя правіламі ЕС, у склад якога Румынія ўваходзіць. Як прыклад — выдача румынскіх пашпартоў малдаванам затармазілася. Гэта прамы загад Брусэля. Зараз атрымаць румынскі пашпарт амаль немагчыма. Дарэчы, зарабіць палітычныя пункты на тэме румынскіх пашпартоў — яшчэ адна любімая тэма камуністаў. Пры гэтым, аднак, усе забываюць, што ў іх лідэра Уладзіміра Вароніна таксама падвоенае грамадзянства. Ён яшчэ і грамадзянін Расіі. Акрамя таго, сама малдоўская эліта не хацела б інкарпарацыі ў склад Румыніі. За партыямі Альянсу за еўрапейскую інтэграцыю стаяць таксама алігархі. У элементарных інтарэсах мясцовага бізнесу не пускаць сюды іншаземных канкурэнтаў, у тым ліку румын. Калі мы кажам пра Еўропу, дзе не працуюць ніякія законы. Ніхто не кантралюе эканамічныя схемы, за кошт якіх існуе смірноўскі клан. Некалькі разоў праходзіла інфармацыя пра тое, што Прыднястроўе пастаўляла зброю чэчэнцам, ісламскім тэрарыстам у Іраку. Як прыклад цынізму — кааперацыя з Алегам Вароніным. Пакуль прэзідэнты Смірноў і Варонін сварыліся, іх дзеці Алег Смірноў і Алег Варонін разам наладзілі нелегальны бізнес па продажу ў Злучаныя Штаты металалому. Пазіцыя Тыраспаля абсалютна не канструктыўная, хаця Малдова неаднаразова прапаноўвала яму аўтаномію, кшталту Гагаузіі. Дарэчы, сітуацыя з Гагаузіяй вельмі цікавая. Там цяпер ва ўладзе сілы, якія можна аднесці да лагеру прарасійскіх партый. Аднак яны зараз падтрымліваюць Альянс за еўрапейскую інтэграцыю. Кажуць, што адсутнасць ціску з боку клану Вароніна, што было ў часы кіравання камуністаў, дазваляе іх краю лепш развівацца.

***— Як, на ваш погляд, будуць разгортвацца падзеі?***

— Вы ведаеце, напэўна, што ў краіне палітычны крызіс — следства канстытуцыйнага. Малдова — парламенцкая рэспубліка. Для абрання прэзідэнта трэба, каб яго кандыдатуру падтрымала дзве трэці парламенту. Дэмакратам не хапае васьмі галасоў. У сваю чаргу, камуністы адмаўляюцца весці хоць нейкія перамовы на гэты конт у надзеі, што адсутнасць прэзідэнта прывядзе да датэрміновых выбараў. Быццам, па іх выніках камуністы змогуць вярнуць сабе статус урадавай партыі. Не скажу, што шанцаў у варонінцаў няма. Ва ўмовах сённяшняга крызісу Альянс за еўрапейскую інтэграцыю вымушаны праводзіць надзвычай непапулярны эканамічны курс. Па патрабаванню МВФ уведзеная вельмі строгая бюджэтная дысцыпліна, ідуць масавыя звальненні. Народ, натуральна, не задаволены.

**Хочам мы ці не, малдоўскай мовы няма. Мы размаўляем па-румынску. І ў гэтым няма нічога страшнага. Хіба ў законах Аўстраліі прапісана, што дзяржаўная мова аўстралійская?**

Камуністы збіраюцца стрыгчы купоны менавіта на падобных настроях. Амаль кожны дзень на свет выплываюць розныя факты іх эканамічных злачынстваў у часы Вароніна. Выкід кампрамату ўжо мае негатыўныя для камуністаў вынікі — не так даўно з фракцыі Кампартыі выйшла невялікая групоўка дэпутатаў. У такой сітуацыі я маю сумнеў у тым, што ў выніку новых выбараў камуністы змогуць атрымаць большасць, прычым большасць у дзве трэці галасоў, каб не толькі сфармаваць урад, аднак займець і свайго прэзідэнта. Так ці інакш, ім давядзецца пагадзіцца з прапанавай дэмакратаў прыняць новую канстытуцыю. Да гэтага часу сітуацыя будзе вельмі не стабільная.

месца Румыніі ў палітыцы цяперашняга ўраду, то яе можна сфармуляваць наступным чынам: Малдова павінна інтэгравацца ў Еўропу, выкарыстоўваючы патэнцыял Румыніі, якая блізкая малдаванам гістарычна і культурна. Быць малодшымі братамі ніхто не жадае.

***— Як рэагуюць на курс новага малдоўскага ўраду ў Прыднястроўі?***

— Хто б ні прыйшоў да ўлады ў Кішынёве — камуністы, нацыяналісты, нават расійскія манархісты, — Тыраспаль заўжды будзе намагацца шукаць падставы, каб не весці дыялог наконт абʼяднання краіны. Матыў вельмі просты: Прыднястроўе — самая вялікая шэрая зона ў цэнтры

СКАНДАЛ

# ЗАБАРАНІЦЬ ЦЭЛІБАТ

Алег ПЯТРОЎ

**Хваля педафільскіх скандалаў у лоне каталіцкай царквы выклікала буйныя дэбаты ў Рыме. Каб пакончыць з вычварэнцамі, некаторыя тэолагі і царкоўнікі прапануюць адмяніць цэлібат. Аднак Папа Бенедыкт XVI рашуча супраць.**





Здаецца, інстытут Касцёлу не быў так атакаваны грамадствам з часоў рэфармацыі. Штодня былыя вучні каталіцкіх навучальных установ у розных краінах Еўропы і ЗША прызнаюцца, што падчас навучання былі ахвярамі сексуальнага гвалту з боку настаўнікаў. Апошняе гучнае прызнанне зрабілі вучні каталіцкай гімназіі ў Швейцарыі. Па іх словах, у 1980-я гады некалькі аднагодкаў пакончылі з сабой, не вытрымаўшы псіхалагічнай траўмы — следства сексуальнага гвалту з боку настаўнікаў. Пракуратура Швейцарыі ўжо завяла крымінальную справу. Па словах следчых, гаворка ідзе як мінімум пра 200 выпадкаў сексуальнага гвалту з дзяцей. Як правіла, гэта быў аральны секс.

Скандал падбіраецца да самога Папы. Аказваецца, у часы, калі Бенедыкт быў біскупам Мюнхена, ён прыняў у сваю парафіі нейкага брата X. Таго перавялі ў Баварыю з прыходу ў Эсэне. Адтуль брата X. «папрасілі» пасля таго, як засталі падчас сексу з 11-гадовым хлопчыкам. Добра яшчэ, што ў Мюнхене той служка больш не дазваляў сабе нічога падобнага.

Брат цяперашняга Папы Георг Ратцынгер кіраваў царкоўным хорам хлопчыкаў. Яго ўдзельнікаў, як цяпер высвятляецца, таксама гвалтавалі і збівалі.

Падобныя скандалы ў Касцёле былі і раней. Аднак цяпер яны набылі сістэматычны і масавы характар. Так, у Ірландыі ў суды звярнуліся 15 тысяч чалавек, якія патрабавалі кампенсацыю за тое, што іх гвалцілі ў дзяцінстве. Ім ужо выплацілі паўтара мільярда долараў ЗША.

Аўтарытэт каталіцкай царквы пад пагрозай. Прычым патрэбна не толькі вызначыць віну за мінулае, аднак і перастрахавацца на будучыню. Калі гармоны святароў нельга стрымаць, трэба нейтралізаваць іх за кошт звычайнага шлюбу, — кажа фракцыя каталікоў, якая выступае за адмену цэлібату. Цэлібат — не догма, кажуць яны, шматлікія вядомыя царкоўныя аўтарытэты мелі жонак — напрыклад, Святы Пётр.

У 306 годзе Сінод біскупаў у Таледа (Іспанія) забараніў святарам уступаць у шлюб. Аднак гэта рашэнне мела рэгіянальны характар. У 385 годзе Папа Сірыус распаўсюдзіў гэта правіла на ўсю царкву. Яго ідэю падтрымалі наступныя Папы. Аднак на месцах часта тую інструкцыю не выконвалі. Толькі ў VIII стагоддзі цэлібат стаў абавязковым для ўсіх каталіцкіх святароў. Нарэшце, толькі ў 1139 годзе гэта правіла стала жорсткім. Сабор прыняў фармулёўку пра тое, што капеланы не могуць мець жонак, таму што звязаныя з Богам і Святым Духам.

Пытанне адмены цэлібату пасля неаднаразова ўздымалася. Асабліва ў наш час. Напрыклад, на Другім ватыканскім саборы 1962–1965 гадоў. У тыя часы ў Францыі існаваў нават рух супраць цэлібату. Прыкладна сто тысяч маладых святароў дэманстратыўна ажаніліся і пакінулі Касцёл.

Цяпер ідэя адмены цэлібату перажывае рэнесанс. Толькі ў Бразіліі ў мінулым годзе петыцыю да Рыму за адмену цэлібату падпісала 18 тысяч каталіцкіх святароў. У Германіі дасюль не заціх скандал, выкліканы рашэннем Рыму звольніць аднаго з царкоўнікаў у Баварыі, які прызнаўся, што мае дзіця.

Цытадэль праціўнікаў цэлібату знаходзіцца ў Аўстрыі і Германіі. Тут за скасаванне гэтага пункта ў Кодэксе выступаюць арцыбіскуп Вены, галоўны біскуп Гамбургу. Знаўцы царкоўнай гісторыі звяртаюць увагу на тое, што кіраўніцтва царквы часам вельмі апартуністычна ставілася да цэлібату. Напрыклад, дазваляліся шлюбы для біскупаў у Чэхаславакіі, дзе ў часы камунізму існавала падпольная царква. Каб не выклікаць падазрэнняў спецслужбаў, святары былі вымушаны заключаць шлюбы.

Пракалоўся тут і Папа Бенедыкт XVI. Пасля таго, як англіканская царква прызнала шлюбы геяў, яе шэрагі пакінула шмат святароў, для якіх гомасексуалізм застаецца грэхам. Святары перабеглі ў каталіцкі сабор. Святы Рым пагадзіўся іх прыняць. На той факт, што ў шматлікіх былых пратэстантаў ёсць жонкі, вырашылі заплюшчыць вочы.

А што ж артадоксы?

Яны лічаць, што цэлібат — гэта важны чыннік этыкі служэння Богу, элемент сакральнасці. На іх думку, наяўнасць жонкі ў святара цалкам не вырашае праблемы. Вядома, што выпадкі педафіліі маюць месца ў іншых царкоўных канфесіях, па правілах якіх святары могуць мець сям'ю і весці палавое жыццё.

Спасылаючыся на статыстыку, яны кажуць, што праблема педафілаў у касцёле ўзнікла на фоне сексуальнай рэвалюцыі 1960–1970-х гадоў. Цэлібат тут не пры чым.

Супраць рэформы выступае і Папа Рымскі. 11 сакавіка падчас канферэнцыі ў Ватыкане ён яшчэ раз падкрэсліў, што цэлібат — адзін з фундаментальных прынцыпаў каталіцызму.

Між тым, як сцвярджае італьянская прэса, унутры апарату ўжо створаная камісія пад кіраўніцтвам бразільскага кардынала Клаўдзіу Хумэса, якая ціха працуе над праблемай магчымай адмены цэлібату. Праўда, тая ж прэса піша, што, звычайна, падобным камісіям у Ватыкане патрэбна прыкладна 50 гадоў працы, каб нешта зрушылася ў той ці іншай галіне.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЭВА МАРАЛЕС



Прэзідэнт Балівіі працягвае будаваць сацыялізм у сваёй краіне. Апошнім прарывам у гэтым накірунку стала ідэя змясціць «wiphala» (так называецца новы сцяг краіны, які ўяўляе сабою палітру розных фарбаў) на мундзіры вайскоўцаў. Маралес патрабаваў, каб «wiphala» стала сімвалам Міністэрства абароны і была нашытая на кожным мундзіры. Аднак на гэтым Маралес не супакоіўся. Ён жадае, каб выраз «Patria o muerte, venceremos» («Радзіма або смерць, мы пераможам») быў уключаны ў тэкст балівійскага гімну. Дэвіз «Patria o muerte, venceremos» гістарычна звязаны з падзеямі 1950-х гадоў на Кубе. Яго выкарыстоўвалі паўстанцы Кастра падчас барацьбы супраць дыктатуры Батысты, і таму ён лічыцца лозунгам сацыялістаў. Сам прэзідэнт Балівіі кажа, што калі ўнесці гэты лозунг у тэкст гімну, кожны патэнцыйны агрэсар будзе ведаць, што балівійцы могуць змагацца не на жарт. Ахвярай рэформы стане страфа гімну «Лепш памерці, чым жыць рабамі». Менавіта замест яе з'явіцца: «Радзіма або смерць, мы пераможам». Між тым, як паведамляюць брытанскія СМІ, у аэрапорце «Хітроў» на днях затрымалі турыста, якога западозрылі ў тэрарызме. Падставай для падазрэнняў стала майка з надпісам «Patria o muerte».

### ДАЛЯ ГРЫБАЎСКАЙТЭ



Прэзідэнт Літвы адзначыла 20-ю гадавіну аднаўлення незалежнасці краіны. Нягледзячы на добрую арганізацыю свята, літоўская прэса незадаволеная. На думку шмат каго, Літву публічна прынізілі. Часткова гэта зрабіў Лукашэнка, які адмовіўся ехаць на святкаванне ў Вільнюс. Аднак значна большае зневажанне зрабіў расійскі прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў. Яго таксама запрашалі на юбілей. Гаспадар Крамлю, аднак, не прыехаў, а даслаў старшыню ўрадавай камісіі, што, на думку літоўскіх журналістаў, не што іншая, як аплявуха афіцыйнаму Вільнюсу. Нават на некаторыя сходы мясцовых партый наведваюць больш статусныя расійскія чыноўнікі. Такі падыход да Літвы, на думку прэсы, — адлюстраванне ўсходняй палітыкі Грыбаўскайтэ. Яна заігрывае з Мінскам і Масквой, а тыя ў сваю чаргу трымаюць яе за нешта слабае і малаважнае. Сама спадарыня Грыбаўскайтэ вымушана апраўдвацца. Яна кажа, што Лукашэнка асабіста тэлефанаваў і віншаваў яе. Аднак што тычыцца Мядзведзева, то тут прыдумаць нешта цяжка. У любым выпадку Грыбаўскайтэ трапіла ў цікавую сітуацыю. Яе запрасілі на 9 мая ў Маскву на святкаванне 65-годдзя Перамогі. Паехаць — значыць выставіць сябе як палітыка другога гатунку, аб якога можна выціраць ногі. Не паехаць і адправіць якога-небудзь міністра або старшыню ўрадавага камітэту — значыць нарвацца на скандал з Масквой.

### НІКАЛЯ САРКАЗІ



Вынікі выбараў у рэгіянальныя органы ўлады Францыі ўсе дружна называюць пачаткам палітычнага пахавання прэзідэнта краіны. Прэзідэнцкая партыя «Саюз за народны рух» (UMP) умудрылася прайграць ва ўсіх рэгіёнах Францыі, акрамя Эльзасу, дзе ўзяла верх выключна дзякуючы саюзу з правымі радыкаламі з Нацыянальнага фронту. Да гэтага яшчэ можна дадаць перамогі ў заморскіх дэпартаментах. Тут галіслы абышлі галоўных канкурэнтаў сацыялістаў з-за таго, што камуністы адмовіліся падтрымліваць ружовых, як гэта зрабілі ў метраполіі. Аднак самая цікавая сітуацыя з міністрамі ўраду, які фармуе UMP. Усе 19 міністраў падчас выбараў адправіліся ў рэгіёны, каб узначаліць выбарчыя спісы партыі. І ўсе 19 прайгралі. Па логіцы, пасля такога фіяска ўвесь урад трэба адправіць у адстаўку, аднак гэта выкліча яшчэ большы хаос сярод партыйцаў. Яшчэ адным цікавым наступствам такіх вынікаў рэгіянальных выбараў сталі дэбаты наконт таго, што Сарказі ўвогуле не трэба балатавацца на пасаду прэзідэнта ў 2012 годзе. Шмат хто лічыць, што лепшым кандыдатам ад правых быў бы цяперашні прэм'ер міністр Францыі Франсуа Фіён.

ПАМЯЦІ КАЛЕГІ

# НАЗАЎСЁДЫ З НАМІ

**22 сакавіка тэлефонны званок прынёс мне вестку, што агаломшыла і не дае апомніцца, — не стала Кастуся Тарасава.**



Фота Уладзіміра Шапалака

Так заўчасна і так несправядліва. Бо ён толькі ж, здаецца, вырваўся з кіпцюроў смерці, пераадолеў наступствы інсульту. І здолеў вярнуцца да паўнавартаснай творчасці.

У маі мінулага года Косця перадаў нам у рэдакцыю, з просьбай змясціць на сайце, сваю гістарычную аповесць «На вайне». (http://www.novychas.org/literature/prose).

А ў верасні я атрымаў ад яго электронны ліст: «Аляксей, вітаю! Зараз я вярнуўся з Таліна і меў бы намер, калі ты згодны, супрацоўнічаць з «Новым часам». Магу прапанаваць аўтарскія матэрыялы».

І пайшлі, адзін за адным, файлы з яго выбітнымі гістарычнымі нарысамі. Ранейшай моцы і таленту. Косця гарэў працай. І спяшаўся, спяшаўся, спяшаўся пісаць.

Мы паспелі надрукаваць дзевяць нарысаў. Апошні — у нумары ад 19 сакавіка. У рэдакцыйным партфелі засталіся яшчэ чатыры. Публікуем — наўздагон. Нарыс «Гісторыкі і палітыкі» — гэта роздум пісьменніка і грамадскага дзеяча Кастуся Тарасава аб праблемах асэнсавання нашага мінулага дзеля сучаснасці з праекцыяй на будучыню. А зараз, на трагічным абрыве яго жыцця, гэты роздум гучыць ужо як запавет.

Творы Кастуся Тарасава адкрылі нам гістарычную Атлантыду — нашу краіну Беларусь. І тым спрацавалі на яе адраджэнне ў якасці суверэннай, незалежнай дзяржавы. І працягваюць працаваць. Не кожнаму творцу дадзены такі лёс.

Боль і смутак ад незваротнай страты. Спачуванне родным і блізкім. Нам будзе вельмі не хапаць Кастуся Тарасава. Але нам застаюцца яго творы, што ўвайшлі ў агульную беларускую скарбніцу духоўнага багацця. І ў тым нам суцяшэнне і аптымізм на будучыню ад Кастуся Тарасава — выбітнага беларускага пісьменніка, гісторыка, дзеяча нацыянальнага адраджэнскага руху.

**Ад рэдакцыі «Новага часу»**
**Аляксей Кароль**

### Біяграфічная даведка

Кастусь Тарасаў нарадзіўся 10 кастрычніка 1940 года ў Мінску. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1957) на працягу трох гадоў працаваў слесарам-зборшчыкам на Мінскім механічным заводзе, калектарам у Паўночна-Заходняй геолага-разведачнай экспедыцыі, слесарам-мантажнікам у арганізацыі «Спецэлеватармельбуд». Вучыўся на хімічным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута (1960–1965). Па заканчэнні інстытута працаваў майстрам шкловарэння на шклозаводзе «Неман», тэхнолагам на віцебскім заводзе «Маналіт». Быў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі ў выдавецтве «Вышэйшая школа» (1967–1975), журналістам па дамове і загадчыкам аддзелу прапаганды і агітацыі газеты «Знамя юности» (1975–1977), рэдактарам аддзелу мастацтва і крытыкі часопісу «Неман» (1977–1983), спецыяльным карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва» (1986–1988). З 1990 года — адказны сакратар часопіса «Спадчына». Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», у газеце «Свабода». Друкаваўся з 1965 года. Адным з першых сярод беларускіх пісьменнікаў узняў тэму гісторыка-культурнай спадчыны. З мастацкім творам выступіў упершыню ў 1976 годзе (аповесць «Следственный эксперимент», часопіс «Неман»). Пісаў на рускай і беларускай мовах. Аўтар кніг аповесцяў «День рассеяния», «Странствие в тесном кругу», «Погоня на Грунвальд», «Апошняе каханне князя Міндоўга», «Адзіны сведка — бог», раман «Тры жыцці княгіні Рагнеды», літаратурна-гістарычнае эсэ «Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны», а таксама зборнікі гістарычных дэтэктываў «У час Стральца» і «Залатая Горка».

РОЗДУМ

# ГІСТОРЫКІ І ПАЛІТЫКІ

Кастусь ТАРАСАЎ

**У Беларусі існуе грамадская ініцыятыва «Асацыяцыя свабодных беларускіх гісторыкаў». У групе дваццаць чалавек, у тым ліку звольненыя з Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук і кафедраў ВНУ Ніна Стужынская, Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў, Сяргей Тарасаў, Яўген Анішчанка, Ірына Каштлян. «Асацыяцыя» імкнецца супрацьстаяць адлучэнню гісторыкаў ад прафесійнай дзейнасці па вывучэнні мінулага Беларусі.**



Мінск. Верхні горад. Мастак Уладзімір Шаркоў

## Палітыкі

Якімі ж грахамі абцяжараны гэтыя людзі перад плеядай чыноўнікаў? Ідэалагічнымі, вядома. «Нам неабходна правесці канферэнцыю «Гісторыя ў ланцугах палітыкі», — вобразна выказаўся Генадзь Сагановіч на паседжанні аргкамітэта.

Каб палітычныя патрабаванні былі ланцугамі гісторыі — гэта ў XXI стагоддзі штосьці недарэчнае. Палітыкі не разбіраюцца дасканала ў гістарычных пытаннях, у іх іншая прафесія, і яны не трацяць гады жыцця на пошук архіўных матэрыялаў аб злачынствах манаршага двара або рэпрэсіях сталінізму над сотнямі тысяч беларусаў, кінутых за лагерны дрот ці сасланых у Сібір. У развітых краінах палітыкі ідуць услед за гісторыкамі, грунтуючы свае ўяўленні на іх працах. Калі яны гэтага не робяць, то ім насуперак ствараюцца апазіцыйныя плыні, якія раней або пазней усё роўна дамагаюцца гістарычнай праўды.

У нас жа ідэалагічныя чыноўнікі, як заваражаныя, знізу ўверх глядзяць на галоўнага палітыка, у страху зляцець з пасады за незвальненне з навуковай установы аб'ектыўнага даследчыка. Лепш звольніць, нават з апераджэннем вышэйшай волі. У нас дзейнічаюць тыя ж гістарычныя схемы, што і за савецкім часам.

Да 1917 года генерал-губернатар Мураўёў у расійскай гістарыяграфіі ўслаўляўся як пераможца польскага паўстання на беларускіх землях. У 1923 годзе ў Беларусі быў выдадзены першы падручнік па гісторыі, у якім Мураўёў характарызаваўся як душыцель беларускай культуры, заўзяты ахоўнік расійскай імперскай ідэалогіі. Аднак неўзабаве савецкая гістарыяграфія адкацілася да вялікаімперскай традыцыі. І ўжо ў новых падручніках па гісторыі, напісаных з «палітычных» пазіцый, Мураўёў зляплены па манархічных мерках — умелы арганізатар, цвярозы розум, пераможца паўстання.

## Гісторыкі

Як не пісаць гісторыку пра разгромную рэвізію Віленскага музея старажытнасцяў, заснаванага ў 1855 годзе гісторыкам Я. Тышкевічам? Тады на загад Мураўёва вывезлі ў Маскву 3 818 археалагічных помнікаў, 3 948 партрэтаў, гравюр, бюстаў, 487 пячатак, 2 097 прывілеяў і аўтографаў, 541 экземпляр рукапісаў, 8 110 нумізматычных помнікаў. Вывезлі ўсё, што паказвала на былую самастойнасць Беларусі і Літвы. У 1885 годзе пачалося перасяленне беларускіх сялян за Урал. 100 тысяч за 15 гадоў. Якая драма і якая тэма для гісторыкаў! І толькі адно даследаванне — Ігара Кузняцова.

У 1937 годзе наркамам унутраных спраў у Беларусі Масква прызначыла Бермана. За год ягонага камісарства ў БССР было знішчана больш за 100 тысяч чалавек. Толькі гісторык, якому баліць душа за лёс беларусаў, дасць сабе працу аднаўляць бясконцы спіс прозвішчаў.

Ну а нашы ўладныя палітыкі пра гэта і думаць не жадаюць. У іх савецкая лінія памяці пра мінулае — Сталін пакараў Бермана і Яжова, усё зрабіў для разгрому гітлераўскіх захопнікаў, дзеля перамогі ў вайне. На мільён жа беларускага насельніцтва, загінулага ў лагерах і ў высылцы, трэба забыцца, каб мінулае не перашкаджала думаць пра будучыню.

У сваёй кнізе аб германскіх стратах у Беларусі ў 1941–1944 гадах незалежны гісторык Кузьма Казак высветліў, што агульныя страты акупантаў склалі 510 тысяч чалавек, але з іх салдат вермахта — каля 100 тысяч. Астатнія 310 тысяч прыходзіліся на італьянцаў, французаў, венграў, харватаў. 90 тысяч страцілі паліцаі. Страты ад дзейнасці партызан — каля 40 тысяч акупантаў. Прызнацца, я не ведаў пра французаў, венграў, харватаў і не здагадваўся пра 100-тысячныя паліцэйскія фармаванні. Безумоўна, такія даследаванні важныя.

Поруч з мостам праз Свіслач узнік немалы раён, заняты ствараемай праваслаўнай акадэміяй. Вуліцу Нямігу перасякае насыпаны мост, па якім і днём, і ўначы імчацца машыны. Побач, у нізіне, — станцыя метро і спартовы комплекс.

Усе гэтыя забудовы знаходзяцца на тэрыторыі былога мінскага замка. У 1950-я гады ўсемагутная ўлада з дапамогай экскаватараў зраўняла тысячагадовыя валы з зямлёй. Добра, што гісторык Эдуард Загарульскі напісаў манаграфію пра мінскія раскопкі, таму што нічога не засталося, акрамя макета ў музеі гісторыі. Зараз дазволена яшчэ раз раскапаць падмурак царквы і рэшткі хат, але шкада студэнтаў, якія працуюць сярод іржавых труб і клеймаваных бэлек метро «Няміга». І вельмі мала шанцаў на знаходкі.

На пляцы Волі пабудавана новая Ратуша. Цалкам новая, на пустым месцы, дзе адно раслі ліпы і не было ніякіх пабудоў і ніякіх слядоў ад падмурка старой Ратушы ніколі не прысутнічала. Навошта гэты новатвор, з падземным паверхам, пакрытым у цэнтры сквера празрыстым купалам, тут? Можа, кагосьці гэта захапляе, але нічога не гаворыць пра гістарычную каштоўнасць кампазіцыі.

Верхні горад падпаў пад такую «поўную рэстаўрацыю», што за фасадамі вулічных дамоў ад яго амаль нічога не засталося.

## Для «думання пра будучыню»

Усе нашы перабудовы і «рэстаўрацыі» вядуць да таго, што архітэктура мінулых эпох знікае навечна. Гэта — дэкаратыўныя лапікі, так бы мовіць, у «старым стылі», пасаджаныя пасярод новага Мінска, Віцебска, Магілёва, Брэста, Пінска і дзесяткаў малых гарадоў. Выць хочацца гісторыку на такія змены.

Даследнікаў, якія асвятляюць згаданыя факты ў беларускай гісторыі, палітыкі не любяць, іх пазбаўляюць працы, не зацвярджаюць іх дысертацыі. Яны па сутнасці падвяргаюцца забароне на прафесію.

Свет ідзе наперад, зберагаючы гістарычныя помнікі і гістарычную памяць, а афіцыйная палітыка Беларусі ў дачыненні да гісторыі знаходзіцца на «лініі Сталіна».

СПАДЧЫНА

# ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА І ЮЗЭФ ПІЛСУДСКІ

Кастусь ТАРАСАЎ

**Жыцці гэтых двух гістарычных асоб аддзяляе 121 год. «Начальнік паўстання» і «начальнік дзяржавы» — ці ёсць паміж імі нешта агульнае, найперш скрозь прызму беларускага пытання?**


Юзэф Пілсудскі


Тадэвуш Касцюшка

## Падлеткі

У 1746 годзе ў маёнтку Мерачоўшчына нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка. Прапрадзед яго Канстанцін быў натарыем вялікага князя. Праз шлюб з дачкой князя Гальшанскага ён парадніўся з дынастыяй Ягелончыкаў. Але вышэй павятовых пасад ніхто з Касцюшкаў да Тадэвуша не падніімаўся.

Пілсудскі нарадзіўся ў 1867 годзе ў маёнтку Зулаў Свянцянскага павета. (Пасля верасня 1939 года гэты павет увайшоў у Вілейскую вобласць БССР). Яго бацька, Юзэф Пілсудскі, паходзіў з беларускага роду Гінетавічаў, вядомага па Грунвальдскай бітве.

Да сямі гадоў іх дзяцінства было падобным — абодва выраслі ў сядзібах, побач знаходзіліся вёскі, у якіх гаварылі па-беларуску, а калі хлопцы прыходзілі дамоў, слухалі старэйшых па-польску. Але былі і адрозненні. Маці Пілсудскага, Марыя Білевіч, у шуфлядзе, зачыненай на замок, захоўвала партрэты польскіх і літоўскіх герояў, якія па важных днях паказвала сынам. Яшчэ яна чытала ўслых паэму «Пан Тадэвуш», якую не мог чытаць Касцюшка. Піярская калегія, дзе вучыўся Тадэвуш, была польскай, Віленская гімназія, дзе вучыўся Пілсудскі, была рускай. З-за гэтага ў Пілсудскага ўтваралася непрыязнасць да русіфікацыі, якая ў Касцюшкі ўзнікла толькі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай.

## Маладыя гады

У дзевятнаццаць гадоў Касцюшка паступіў у Варшаўскі кадэцкі корпус і разам з капітанскімі пагонамі атрымаў стыпендыю для навучання ў ваеннай школе пры Луўры. Вярнуўшыся на радзіму, Тадэвуш закахаўся ў Людвіку Сасноўскую, дачку польнага гетмана. Маладыя людзі пазнаёміліся ў маі, а ў верасні Касцюшка папрасіў у гетмана руку яго дачкі. Узвар'яваны «дзёрзкасцю», Сасноўскі загадаў Тадэвушу пакінуць сядзібу. Касцюшка прапанаваў Людвіцы пайсці з ім пад вянец супраць бацькоўскай волі. Тады Сасноўскі абвясціў, што прыцягне Касцюшку да суду, які прадугледжваў за такое злачынства смяротную кару.

Выйсце для яго адкрылася з вайной, якую ў 1775 годзе пачалі амерыканскія штаты. Францыя дасылала туды афіцэраў-валанцёраў, у якія запісаўся і Касцюшка. Так ён патрапіў у Амерыку, дзе атрымаў патэнт палкоўніка-інжынера амерыканскай арміі. Ён забяспечыў фартыфікацыямі Саратогу на рацэ Гудзон. Галоўнакамандуючы войскамі Джордж Вашынгтон даручыў Касцюшку будаўніцтва крэпасці Вест-Пойнт. Англічане не рашыліся штурмаваць яе і наогул уздымацца ўверх па Гудзону — рака на ўсю шырыню (450 метраў) была перакрытая жалезным ланцугом, сканструяваным Касцюшкам. Ён стаў генералам амерыканскай арміі, шаноўным грамадзянінам ЗША. Але пасля 8-гадовай вайны вярнуўся на радзіму.

Юнак Юзэф Пілсудскі пасля гімназіі паступіў у Харкаўскі універсітэт. Але студэнцкае жыццё выдалася нядоўгім. Яго брат Браніслаў быў удзельнікам змовы, арганізаванай «Народнай воляй» для забойства расійскага імператара Аляксандра III. Юзэф, які прывёз змоўшчыкам чамадан з дынамітам, быў як непаўнагадовы высланы ў Сібір. Менавіта ў гэтыя гады Пілсудскі называў сябе беларусам.

Пасля высылкі ён стаў адным з заснавальнікаў Польскай сацыялістычнай партыі, рэдактарам газеты «Robotnik». Раскрыццё друкарні прывяло ды арышту Пілсудскага. Ён пяць месяцаў адбыў у Пецярбургскім вар'яцкім доме, пакуль не ўцёк. Пілсудскі становіцца арганізатарам грабяжоў для партыйнай касы. Асабліва вядомая яго «экспрапрыяцыя» ў Безданах недалёка ад Вільні. Група напала на паштовы вагон і атрымала вялізныя грошы — 200 тысяч рублёў (прыкладна 2 000 000 долараў па сучасным курсе).

## Годнасць

3 мая 1791 года сойм прыняў Канстытуцыю Рэчы Паспалітай. Галоўнымі пунктамі Канстытуцыі былі адмена «ліберум вета» і федэратыўнага ладу дзяржавы, увядзенне адзінай польскай мовы і спадчыннай манархіі, захаванне прывілеяў шляхты і ўсталяванне апекі дзяржавы над сялянамі. Гэта сталася прычынай другога падзелу Рэчы Паспалітай.

Еўрапейская слава знайшла Касцюшку пасля бітвы з рускімі пад Дубенкай 18 ліпеня 1792 года. Адразу пасля Дубенкі Касцюшка атрымаў чын генерал-лейтэнанта. У сакавіку 1794 года на Рынкавай плошчы Кракава яго абвясцілі галоўным начальнікам паўстання. 10 кастрычніка 1794 года адбылася бітва палякаў з рускімі пад Мацеявіцамі — пераломная і няўдалая для Касцюшкі. Ён быў паранены казакамі, трапіў у палон, і яго адвезлі ў Пецярбург.

У 1914 годзе аўстрыйскі ўрад дазволіў Пілсудскаму мець у арміі польскія легіёны. Пілсудскі камандаваў толькі Першай брыгадай, але паралельна ён ствараў Польскую ваенную арганізацыю, што дазволіла сфармаваць Польскае войска. Брэсцкі мір і рэвалюцыя ў Германіі паспрыялі Польшчы адрадзіцца як дзяржаве.

Улетку 1919 года Пілсудскі выратаваў Савецкую ўладу ў Расіі. Над Масквой навісла пагроза — наступ Добраахвотніцкага войска Дзянікіна. Польскія ж войскі, якія знаходзіліся на той час у Беларусі і Вальні, і якія ўжо паўгода самастойна змагаліся з Чырвонай Арміяй, спакойна назіралі за сутыкненнем чырвоных і белых. Пазней Пілсудскі тлумачыў, што ў выпадку рэстаўрацыі імперы не магло быць і размовы аб вольных Украіне і краінах Балтыі. Польшча ў лепшым выпадку магла б разлічваць на «этнічную» мяжу, якая неўзабаве атрымала назву «лініі Керзона» і стала рэальнай пасля другой сусветнай вайны.

У сакавіку 1919 года палякі занялі Пінск, авалодалі Навагрудкам, Баранавічамі, Лідай і Вільняй, Мінскам і Бабруйскам. У 1920 годзе Чырвоная Армія пачала наступ у Беларусі. У жніўні часткі Тухачэўскага падышлі да Варшавы. Пілсудскі, генерал Развадоўскі і французскі генерал Вейган падрыхтавалі контрудар. Толькі за ліпень 1920 года ў Войска Польскае ўступілі 150 тысяч добраахвотнікаў. У жнівеньскай бітве Чырвоная армія пацярпела паразу, у палон трапілі каля 100 тысяч салдат.

Без Пілсудскага гэтай перамогі над Віслай не было б ужо хаця б толькі таму, што не было б самой Варшаўскай бітвы. Калі войскі Тухачэўскага стаялі пад Варшавай, многія ў польскім кіраўніцтве лічылі адзіным выратаваннем без бою Варшаву здаць і адыходзіць у былую прускую Польшчу, межы якой бальшавікі быццам бы не адважацца перайсці. Толькі жалезная воля Пілсудскага зберагла ўсё ад развалу.

## «Не» Касцюшкі

Сярод першых учынкаў Паўла I быў візіт да вязня Мармуровага палаца. Павел прапанаваў Касцюшку свабоду ў абмен на прысягу на вернасць імператару. Яго прысяга прыносіла свабоду яшчэ 12 тысячам паўстанцаў. Касцюшка пагадзіўся і з'ехаў у Амерыку.

Першапачаткова ён планаваў застацца ў Новым Свеце назаўжды. Аднак у маі наступнага года пераехаў у Еўропу. Прычынай вяртання стала запрашэнне ўзначаліць марш легіёнаў з Італіі ў Малапольшчу з мэтай падняць там паўстанне. У Парыжы высветлілася, што Напалеону гэты план быў патрэбны дзеля запалохвання паўстаннем Прусіі, каб выбіць яе з антыфранцузскай кааліцыі. «Не!» — сказаў Касцюшка і служыць Напалеону адмовіўся.

У 1800 годзе паўстанец і генерал пераехаў у мястэчка Бярвіль поруч з Фантэнебло, у маёнтак братоў Цельтнераў, старэйшы з якіх прадстаўляў Швейцарыю ў Францыі, а малодшы на радзіме быў бургамістрам мястэчка Салюрн. У гэтым мястэчку і правёў свае апошнія два гады Тадэвуш Касцюшка. Тут ён навучаў хросніцу гісторыі, малюнку і мовам, а калі дазваляла здароўе, здзяйсняў конныя прагулкі. Стары генерал кожнаму сустрэчнаму ўсміхаўся і кожнаму жабраку падаваў міласціну.

## «Санацыя» Пілсудскага

Марай Пілсудскага было адрадзіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 года. І ён патрабаваў, каб польская дэлегацыя настойвала на такой умове міру. Але Польшча была змучаная шасцігадовай вайной, польская дэлегацыя, якая складалася з яго палітычных супернікаў, прыклала ўсе высілкі, каб новая лінія мяжы была праведзеная бліжэй, чым яна была ў 1772 годзе.

Тры гады Пілсудскі ўгаворваў летувісаў вярнуцца ў «абдымкі польскага брата» і атрымаць назад Вільню ў абмен на «унію». Але летувісы не пагадзіліся на страту незалежнасці. Тады Віленшчына была далучана да Польшчы праз «рэферэндум». Гэта стала адным з чыннікаў таго, што ў 1923 годзе Пілсудскі вымушаны быў адрачыся ад усіх дзяржаўных пасад. Але праз тры гады ён вырашыў вярнуцца ў сувязі з «анархіяй».

Вайсковы міністр Жэліхоўскі сабраў пад Варшавай адборныя часткі і перадаў камандаванне над імі Пілсудскаму. 12 мая 1926 года палкі рушылі на сталіцу. Увечар пачаўся бой у Варшаве. Падчас баёў загінула 379 чалавек, было паранена 1000. У краіне быў усталяваны рэжым аўтакратыі Пілсудскага, так званы рэжым «санацыі».

Нацыянальны беларускі адраджэнскі рух апынуўся пад пагрозай знішчэння. На ўсю Заходнюю Беларусь засталася толькі адна беларуская школа ў Вільні. Беларускіх інстытутаў, каледжаў, тэатраў, друкаваных выданняў не існавала. Суд у Брэсце ў 1927 годзе асудзіў да 10 гадоў турмы 30 сябраў КПЗБ. Была забаронена дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай Грамады (120 тысяч чалавек), а яе 400 кіраўнікоў рэпрэсаваны. У 1932 годзе Асташынскае і Кобрынскае сялянскія паўстанні былі задушаны войскамі — 7 чалавек павешаны, 79 асуджаны. 17 чэрвеня 1934 прыняў вязняў канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай.

## Адрозненні

Касцюшка стаў начальнікам паўстання тады, калі яшчэ не было ніякіх партый Літвы і Беларусі, якія б ставілі пытанне хоць бы наконт сваёй аўтаноміі, не было ні адной асобы, якая ўяўляла б, як гэта можна зрабіць. Патрыятычна настроены, ён не хацеў, каб рускія захапілі яго краіну. І пацярпеў паразу.

Касцюшка быў вольналюбівым чалавекам, але ў межах непадзельнай Польшчы, у якую б уваходзілі Беларусь і Літва як простыя ваяводствы. Незадоўга да сваёй смерці ён вырашыў вызваліць сялян ад прыгнёту. Сястра Касцюшкі напісала Аляксандру I ліст, дзе прасіла яго парушыць завяшчанне брата. Імператар пагадзіўся з яе патрабаваннем.

Пілсудскі вельмі любіў легенду пра сабе як пра «бацьку польскай незалежнасці». Магчыма, што іншы чалавек не выканаў бы такой задачы. У Пілсудскага была любоў да Рэчы Паспалітай. Ён жадаў, каб беларусы таксама сталі «добрымі палякамі». Але Пілсудскі далучыў да Польшчы Беларусь, калі была беларуская дзяржава, і свядома ўвёў апалячванне.

Касцюшку, «начальніка паўстання», беларусы лічаць сваім героем, «начальніка дзяржавы» Пілсудскага — не.


www.polskifilm.ru
Пахаванне сэрца Юзэфа Пілсудскага ў Вільні

## НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

### ЭКСПЕРТЫЗА КНІГІ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

**На экспертызу ў Нацыянальны інстытут адукацыі накіравана кніга для школьных настаўнікаў гісторыі «Выратаванае жыццё: жыццё і выжыванне ў Мінскім гета».**

Сярод аўтараў гэтага нямецка-беларускага выдання кіраўнік Гістарычнай майстэрні ў Мінску кандыдат гістарычных навук Кузьма Казак, кіраўнік гістарычных праграм Дортмундскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра Фрэда Дорна, прафесар Манфрэд Цабель і кіраўнік справамі Дортмундскага МАЦ Пецэр Юнге-Вентруп, дырэктар Мінскага МАЦ Віктар Балакіраў, асістэнт праекта «Забяспечым годную старасць» Алеся Беланові ч і старшыня Саюза беларускіх габрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Леанід Левін.

У кнігу ўвайшлі ўспаміны былых вязняў Мінскага гета Міхаіла Трэйстэра і Іосіфа Грайфера, а таксама Праведнікаў народаў свету Ганны Салаўёвай і Раісы Сямашкі. Выданне мае дадатак з фрагментамі дакументаў з нямецкіх архіваў, перакладзеных на рускую мову, якія дазваляюць уявіць нацысцкую сістэму генацыду яўрэйскага насельніцтва Беларусі. А таксама копіі арыгінальных дакументаў аўтараў успамінаў.

Пакуль выданне надрукавана пробным накладам 100 асобнікаў для ўдзельнікаў прэзентацыі (настаўнікаў, навучэнцаў, прадстаўнікоў органаў адукацыі, сведак ваенных падзей і прадстаўнікоў Германіі), што адбылася 19 сакавіка ў Мінскім МАЦ.

Пасля ўхвалення кнігі экспертамі яе папраўленае і дапоўненае выданне будзе надрукавана накладам не менш як 1 тысяча асобнікаў і паступіць у школы.

### ВЕЧАРЫНА ФРАНЦІШКА БАГУШЭВІЧА

**Вечарына, прысвечаная 170-годдзю з дня нараджэння нацыянальнага паэта Беларусі Францішка Багушэвіча, адбылася 21 сакавіка ў Мінску.**




Уладзімір Содаль

Даследчык жыцця і творчасці Багушэвіча, літаратуразнаўца Уладзімір Содаль назваў Багушэвіча «найсумленнейшым чалавекам сваёй эпохі, хто ўпершыню сказаў такія словы пра нашу мову, якія пра яе да яго ніхто не казаў», і адзначыў, што разам з іншымі беларускімі прарокамі Багушэвіч прывёў Беларусь да незалежнасці.

Паводле яго слоў, у 1888 годзе Багушэвіч наведаў Мінск па сваіх адвакацкіх справах і жыў на кватэры свайго калегі Вяржбіцкага ў доме, які знаходзіўся каля сённяшняга знака «Пачатак усіх дарог» на Кастрычніцкай плошчы. «І хоць імем паэта названа плошча на перакрыжаванні вуліц Няміга і Клары Цэткін, мінчукі і госці сталіцы не ведаюць пра гэта, бо ў маршрутах грамадскага транспарту няма прыпынку «Плошча Багушэвіча», а на ёй адсутнічае мемарыяльная шыльда ў гонар гэтага тапоніму», — адзначыў Содаль.

У рамках кампаніі «Гавары праўду!» ён накіраваў у Адміністрацыю прэзідэнта вершы Багушэвіча «Праўда» і «Як праўды шукаюць», якія, на думку даследчыка, не страцілі сваёй актуальнасці.

Удзельнікам вечарыны быў паказаны відэафільм пра Багушэвіча «Роднае слова» (аўтар сцэнарыя Уладзімір Содаль). Затым прысутныя напісалі III Агульнанацыянальную дыктоўку паводле прадмовы да зборніка Багушэвіча «Дудка беларуская».

Па прапанове ініцыятара акцыі, кандыдата філасофскіх навук Уладзіміра Падгола, кожны ўдзельнік дыктоўкі пісаў адзін сказ на агульны ліст і ставіў сваё імя і прозвішча. Гэты ліст Содаль возьме з сабой і прапануе завяршыць дыктоўку ўдзельнікам літаратурных сустрэч, якія пройдуць у шэрагу населеных пунктаў краіны і будуць прымеркаваныя да 170-годдзя Багушэвіча.

**Паводле БелаПАН**

АНОНС

# ЧАЛАВЕК СУСВЕТУ

**Генадзь КЕСНЕР**

**6 красавіка споўніцца 100 год славутаму беларусу, якога называюць Чалавекам Сусвету, — вядомаму навукоўцу, слыннаму дзеячу на ніве беларушчыны Барысу Кіту. Зараз Барыс Уладзіміравіч жыве ў нямецкім Франкфурце-на-Майне, побач з Паўднёвым вакзалам.**



Генадзь Кеснер і Барыс Кіт

З калегам з TUT.BY Кастусём Лашкевічам мы прыехалі да Барыса Кіта апоўдні 22 сакавіка. Гэтымі днямі, яшчэ да каляндарнага юбілею, Барыс Уладзіміравіч прымае шматлікіх гасцей з розных краін свету, у тым ліку і з Беларусі. Так, акурат за дзень да нас яго наведалі каля дзесятка нашых суайчыннікаў, у тым ліку і галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч.

На ўваходзе нас сустрэў чалавек са шчырай усмешкай і абсалютна дзіцячымі, светлымі вачамі. Некалькі хвілін моцна ціснуў нам рукі — было відавочна, што наш візіт быў для яго сапраўды ў радасць.

Барыс Уладзіміравіч запрасіў нас у свой невялічкі пакойчык, дзе жыве ўжо шмат гадоў (увогуле, у Германію Барыс Кіт з Амерыкі пераехаў 35 гадоў таму, калі выйшаў на пенсію і атрымаў запрашэнне працягнуць прафесарскую працу). Першапачаткова мы меркавалі пагутарыць з ім нядоўга, улічваючы паважаны ўзрост юбіляра, але калі ўключылі дыктафон, гутарка сама сабой зацягнулася на дзве гадзіны. «Я шчаслівы чалавек з чыстым сумленнем, бо ніколі не браў у рукі зброю і ўсё жыццё дапамагаў іншым, таму, відаць, Бог і даў мне пражыць такое доўгае і цікавае, хоць часам і вельмі цяжкое жыццё», — прызнаўся спадар Кіт.

На развітанне Барыс Уладзіміравіч зняў кепку, у якой быў увесь час нашай размовы, і схіліўся перад намі ў знак павагі. Мы абсалютна шчыра і нават неяк трапяткі зрабілі тое ж. «Будучыня Беларусі за вамі — маладымі і разумнымі, адукаванымі і моцнымі», — сказаў пры канцы наш славуты суайчыннік.

Пра тое, як Барыс Уладзіміравіч трыццаць дзён чакаў расстрэлу ў гестапаўскай турме і хто дапамог яму выжыць, з якімі славутымі людзьмі ён сябраваў, якую трагедыю перажыў зусім нядаўна і каго з асаблівай радасцю чакае на юбілей, што Барыс Кіт лічыць сваімі галоўнымі дасягненнямі і які лад жыцця вядзе сёння, чытайце ў наступных нумарах «Новага часу».

ЭСЭ

# МІНСКАЯ ШЛЯХТА

**Раман АБРАМЧУК**

**Ці называлі вас калі-небудзь «мінскай шляхтай»? Мяне, прызнаюся, не раз. Відаць, тут сваю ролю адыгрывае мая беларуская мова, відавочна кніжнага паходжання.**

«Мінская шляхта» — усё часцей прыходзіцца чуць гэту назву ў дачыненні да беларускамоўных інтэлігенцкіх колаў сталіцы. За сябе магу сказаць: адразу ўзвышае самаацэнку, уяўляеш сябе правадыром, як мінімум, паўстанцкага атраду, кіраўніком мужыкоў-бедалагаў, іх дабрадзеем і айцом. Аднойчы нават паспрабаваў паразмаўляць з вышыні свайго шляхецкага самаўяўлення на «ты» з адным дзядзькам-рабацягам. Выйшла сабе даражэй.

Да таго ж нядаўна пачуў інтэрв'ю Антонія Радзівіла, варшаўскага студэнта, калі ён прыязджаў разам са сваёй знакамітай «фаміліяй» у Мінск у рамках сямейнага візіту Радзівілаў на Беларусь. Ён сказаў, што на вакацыях падпрацоўвае прыбіральшчыкам у рэстаранах, каб потым на зробленыя грошы адпачыць; і гэта паважаецца ў яго сям'і, бо навучае з павагай ставіцца да працоўных людзей незалежна ад статусу іх працы.

Так я лішні раз упэўніўся, што шляхецкая годнасць дасягаецца не манерамі і выкшталцонай мовай. Не адукацыяй і эрудыцыяй. І не сцвярджэннем сваёй перавагі над тым, хто не мае гэтага. Адно толькі павагай да іншага чалавека незалежна ад яго сацыяльнага статусу. Уменнем быць простым з простымі і разумным з разумнымі, уменнем саступаць слабымі і не схіляцца перад моцнымі. «Хто са сваімі блізкімі паводзіць сябе як леў, — той будзе паводзіць сябе як авечка на полі бітвы», — гаворыць старадаўні выраз, верагодна, з рыцарскіх кодэксаў.

А яшчэ шляхце было ўласціва ўменне рызыкаваць дзеля высокай мэты. Менавіта ў гэтым адрозненне шляхты і сялян. Прыгадваецца руская казка пра мужыка, які ганіў цара на рынку, і тады сам цар, пачуўшы яго выбрыкі, запрасіў яго пажыць у палацы, але з умовай, што над яго ложкам заўжды будзе вісець меч. Мужык збаяўся і быў пасаромлены ў сваім нахабстве. Калі ўжо хтосьці і жадае нацягнуць на сябе гэтае прывабнае «шляхціц», то няхай навучыцца жыць пад гэтай навісаючай сякерай. Іначай — пра што размаўляць? І нашто крычаць пра «дурнога цара» ў сваім сяброўскім асяроддзі, дзе з гэтым ніхто не будзе спрачацца і ніколі не запатрабуе адказу?

Яшчэ адзін сур'ёзны недахоп нашай інтэлігенцыі па шляху да шляхецтва — адсутнасць грошай і ўлады. Таму не сустракаў я пакуль мінскай шляхты. У тых, да каго б можна было прымяніць гэта званне, заўжды не хапае якогасьці аднаго складніку: напрыклад, моцны, ідэйны, але без «беларушчыны» альбо бізнесовец, ды не змагар.

Хаця нядаўна сустрэў дырэктарку адной фірмы. Здаецца, па ўсіх параметрах падыходзіць. А рыцары ж дзе? Зноў, недарэчнасць нейкая.

Так хочацца адрадзіцца і вырастацца. Давайце шукаць разам, найперш, у саміх сабе. Мо' і знойдзем, ажывім і вырасцім у сабе таго, хто не забыўся на сваіх сялянскіх продкаў і іх мову з традыцыямі, і разам з тым прыдбаў высокую культуру і адукацыю, магчымасці для шырокай грамадскай дзейнасці. І не баіцца гэта ўсё страціць, бо гонар, свой і краіны сваёй — даражэй.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 268
Падпісана да друку 26.03.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.